Леанід Лыч

# Праблема захавання беларускай этнакультурнай прысутнасці ў славянскім свеце

Леанід Лыч

# ПРАБЛЕМА ЗАХАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ ПРЫСУТНАСЦІ Ў СЛАВЯНСКІМ СВЕЦЕ

Мінск
2006

УДК 882.6.09
ББК 83.3 (4 Беи)
Л 88

**Лыч Л.**

Л 88 Праблема захавання беларускай этнакультурнай прысутнасці ў славянскім свеце / Леанід Лыч. — Мн., 2006. — 72 с.

У кнізе асвятляюцца нялёгкія шляхі змагання за сцвярджэнне беларускай прысутнасці ў славянскім свеце. На канкрэтных прыкладах паказана, што дасягненне гэтай жыццёва неабходнай мэты працяглы час абцяжарвалася адсутнасцю ў беларускага народа ўласнай дзяржавы, неабходнасцю шмат энергіі аддаваць супрацьстаянню паланізацыі і русіфікацыі. Прыведзена дастаткова фактычнага матэрыялу, з якога вынікае, што і сёння існуюць сур'ёзныя праблемы з захаваннем беларускай прысутнасці ў славянскім свеце.

Адрасавана шырокаму колу чытачоў, якіх цікавіць месца беларусаў у сям'і народаў славянскай этнічнай супольнасці.

© Лыч Л., 2006

**ЗМЕСТ**

1. З гаспадароў у нявольнікі ........ 4

2. Цяжкія шляхі славян да ўласнай дзяржаўнасці ........ 5

3. Пад прыгнётам славянскіх дзяржаў ........ 12

4. Да нацыянальна-адраджэнскага руху далучаюцца беларусы ........ 20

5. Аднаўленне беларускай дзяржаўнасці:
Беларуская Народная Рэспубліка,
Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка ........ 25

6. У ролі асімілятара выступае ўласны чыноўніцкі апарат ........ 31

7. Ісці на вывучку да чэхаў ........ 38

8. Беларусам не быць адзінокімі ........ 42

9. Шукалі апору ва ўсеславянскіх з'ездах і кангрэсах ........ 53

10. Захаванне беларускай этнакультурнай прысутнасці
ў славянскім свеце — прамы абавязак дзяржавы ........ 62

## 1. З ГАСПАДАРОЎ У НЯВОЛЬНІКІ

У гісторыі кожнага славянскага народа былі перыяды, калі даводзілася ўшчыльную займацца захаваннем сваёй палітычнай незалежнасці ці этнакультурнай самабытнасці. Такія выпрабаванні не абмінулі і нават самы шматлікі на сёння славянскі народ — рускі, на плечы якога ў XIII—XIV стагоддзях легла асноўная нагрузка ў барацьбе з татара-мангольскім нашэсцем. У значнай жа ступені яго справакавала адсутнасць міру і згоды паміж асноўнымі складальнікамі ўсходнеславянскай супольнасці народаў, што аслабляла іх магчымасць супрацьстаяць чужынцам. Такую сітуацыю яны ўмела выкарысталі ў сваіх інтарэсах, змаглі на працяглы час усталяваць панаванне на значнай тэрыторыі колішняй Старажытнарускай дзяржавы. І калі ў выніку такога панавання насельніцтва апошняй ўсё ж не падпала пад асіміляцыйныя працэсы, дык толькі дзякуючы таму, што знаходзілася на больш высокім узроўні культурнага развіцця, чым татара-мангольскія заваёўнікі.

Заходняму адгалінаванню славян, якое пазней легла ў аснову фармавання беларускага народа, палітычную незалежнасць і этнакультурную асобнасць доўгі час даводзілася адстойваць у барацьбе таксама з вельмі небяспечным і каварным ворагам — крыжакамі. Яны нямала народаў сцерлі з этнічнай карты Еўропы. Нашыя ж далёкія продкі — дзякуй ім! — не скарыліся і ў другой палове XIII ст. заснавалі магутную ўласную дзяржаву — Вялікае Княства Літоўскае. На базе яго асноўнага карэннага насельніцтва і сфармавалася пазней беларуская народнасць. Яе мова стала спачатку фактычна, а затым і юрыдычна адзінай дзяржаўнай у Княстве, што ўпершыню зафіксавана ў Літоўскім Статуце 1566 года. Геапалітычнае становішча ВКЛ у Еўропе спрыяла развіццю шматгранных культурных сувязей з яе краінамі, што вяло толькі да ўзбагачэння духоўнага жыцця гэтай дзяржавы, не падрываючы яго пераважна славянскіх асноў. Беларускасць культуры ВКЛ забяспечвалася галоўным чынам дзякуючы шырокаму выкарыстанню беларускай мовы ў гэтай прэстыжнай сферы дзейнасці чалавека.

Сур'ёзных праблем з развіццём беларускай культуры на яе ўласным прыродным грунце не назіралася і ў першыя дзесяцігоддзі існавання створанай паводле Люблінскай уніі 1569 г. Каронай Польскай і Вялікім Княствам Літоўскім сумеснай федэратыўнай дзяржавы — Рэчы Паспалітай, хаця, як сведчыць сусветная практыка, сумеснае пражыванне ў адной і той жа краіне блізкароднасных па культуры і мове народаў вельмі спрыяе асіміляцыі іх і перамозе таго, што карыстаецца большай падтрымкай з боку ўладных структураў. У Рэчы Паспалітай у такім прывілеяваным становішчы знаходзіліся палякі, і, калі беларусы даволі працяглы час не паддаваліся культурна-моўнай асіміляцыі, дык гэта

толькі дзякуючы вялікай адданасці сваім прыродным духоўным традыцыям. Масавае адступленне заможных і адукаваных пластоў насельніцтва ад іх пачалося пасля забароны ў 1696 г. польскімі ўладамі ўжываць беларускую мову ў службовым справаводстве, што немінуча павяло да зніжэння яе сацыяльнай ролі ва ўсіх астатніх сферах грамадскай дзейнасці чалавека і, як вынік, у абслугоўванні міжасобасных канктактаў людзей. Над адным з славянскіх народаў — беларускім — з яго багатай гісторыяй і самабытнай культурай навісла рэальная пагроза культурна-моўнай асіміляцыі ў форме паланізацыі. Яна не выключала асіміляваных беларусаў з славянскай этнічнай супольнасці, але рабіла яе на адзін народ менш з яго адметнымі культурай і мовай. Пройгрыш для славянскага свету зусім відавочны.

Абсалютна не жадалі бачыць беларускую прысутнасць сярод народаў славянскай супольнасці ўлады Расійскай імперыі. Гвалтам далучыўшы да сябе беларускія землі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795 гг.), гэтыя ўлады беспадстаўна называлі іх насельніцтва рускім, г. зн. забралі ў цэлага народа права на ўласнае імя. Не прызнаваць людзей за самабытны народ і ўключаць у якасці складовай часткі ў іншы этнас — гэта найвялікшае глумленне з іх. Трансфармацыя паланізацыі ў русіфікацыю ў дачыненні да беларусаў, за што ў адказе ўлады славянскага рускага народа — адна з самых змрочных старонак у летапісе славянскай супольнасці. На працягу доўгага часу беларуская прысутнасць тут мела не больш, як сімвалічны характар. Павярнуць справу ў лепшы бок, як ніштo іншае, перашкаджала беларусам адсутнасць самых элементарных правоў на тэрытарыяльную аўтаномію ў складзе Расійскай імперыі. Шмат праблем з такой аўтаноміяй зведвалі на розных гістарычных этапах і іншыя славянскія народы. І што самае важнае: яны не мірыліся з падобным становішчам і ўсяляк імкнуліся змяніць яго да лепшага, падаючы гэтым самым добры прыклад і беларусам.

## 2. ЦЯЖКІЯ ШЛЯХІ СЛАВЯН ДА ЎЛАСНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Любы народ, калі ён толькі жадае забяспечыць сабе прыстойнае жыццё, павінен быць палітычна самастойным, бо нават знаходжанне ў адной дзяржаве з блізкароднасным паводле самых розных параметраў этнасам рана ці позна прыводзіць да ўзнікнення часам даволі сур'ёзных канфліктных сітуацый. Асабліва востры характар яны набываюць тады, калі аднаму ці некальkім народам поліэтнічнай дзяржавы рэальна пагражае культурна-моўная асіміляцыя, а яны ніяк не жадаюць прымірыцца з гэтым злом.

Магчыма, ніводнай з этнічных супольнасцяў так цяжка не давалася набыццё дзяржаўнага суверэнітэту, як славянскай. Проста здзіўляе, адкуль толькі бралася ў яе моц, каб дасягнуць гэтай лёсавызначальнай

мэты. Дарэчы, такое нялёгка здабывалася і многімі неславянскімі народамі старога свету, бо моцныя этнасы ўсяляк імкнуліся панаваць над імі.

Як вядома, найбольшую актыўнасць у барацьбе за палітычную незалежнасць народы Еўропы праявілі ў 40-я гады XIX ст. У той перыяд ва ўсіх вядучых краінах гэтага кантынента адбываліся рэвалюцыі, у час якіх вельмі абвастрыўся нацыянальна-вызваленчы рух, узмацнілася барацьба народаў за стварэнне сваіх уласных суверэнных дзяржаў. Тыя падзеі асабліва закранулі славянскія народы, якія знаходзіліся пад уладай Прусіі і Аўстрыі і мэтанакіравана анямечваліся імі. У гэты няпросты час Расія не стала на бок славянскіх народаў. Наадварот, Аўстрыі яна дапамагала задушыць паўстанне ў Венгрыі, паслаўшы туды ў маі 1848 г. 100-тысячную армію на чале з фельдмаршалам Паскевічам і генералам Рэдыгерам. А інакш Расія і не магла рабіць, як падтрымаць Аўстрыю ў барацьбе з усімі падпарадкаванымі ёй народамі, у т. л. і славянскімі, якія надумаліся выкараскацца з-пад ненавіснай улады імперыі і стварыць свае нацыянальныя дзяржавы. Тут Расія паступала аналагічным чынам, як і ў сябе дома ў 1830—1831 гг., калі ў Польшчы, Літве і заходняй частцы Беларусі разгарнуўся нацыянальна-вызваленчы рух з мэтай аднавіць былую Рэч Паспалітую ў межах 1772 г., у якой, як вядома, беларусы разам з літоўцамі мелі сваю дзяржаву ў форме Вялікага Княства Літоўскага.

Найбольш плённымі ў змаганні славян за ўтварэнне ўласных дзяржаў былі гады пасля заканчэння Першай сусветнай вайны і распаду ў канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў XX ст. г. зв. сацыялістычнага лагера. На палітычнай карце Еўропы з'явіўся шэраг новых славянскіх дзяржаў, народы якіх стагоддзямі вялі ўпартую барацьбу за сваю нацыянальную незалежнасць, не жадаючы больш знаходзіцца пад чужым прыгнётам. У бязлітаснай барацьбе з ім славяне выявілі сапраўдны гераізм, паказалі, што і яны ўмеюць даражыць палітычнай самастойнасцю, без якой немагчыма дасягнуць эканамічнага росквіту, прыстойнага матэрыяльнага дабрабыту, нармальна развіваць нацыянальную культуру, надзейна адгарадзіць свой народ ад разбуральнага ўздзеяння розных формаў культурна-моўнай асіміляцыі.

Першаму з славянскіх этнасаў, якому ўдалося пераўвасобіць высакародную ідэю ўласнай дзяржаўнасці ў рэальнасць, быў параўнальна нешматлікі, затое незвычайна свабодалюбны народ — чарнагорцы. Нават будучы гвалтам уключанымі ў 1499 г. у склад Асманскай імперыі, яны ўсё ж змаглі захаваць сваю аўтаномію. У гэтым народзе ніколі не згасала думка аб дасягненні поўнай палітычнай незалежнасці. Крыві праліта дзеля гэтага нямала, але не марна. У XVIII ст. Чарнагорыя становіцца суверэннай дзяржавай. У час руска-турэцкіх войнаў яна заўжды была на баку Расіі, як толькі магла дапамагала паўднёваславянскім народам у іх барацьбе за дзяржаўную незалежнасць, бо для чарнагорскіх палітыкаў не з'яўлялася сакрэтам, што, толькі стаўшы нацыянальна су-

верэнным, можна разлічваць на паспяховае вырашэнне ўсіх астатніх праблем у сферы эканамічнага і духоўнага жыцця.

Самаахвярная і паспяховая барацьба чарнагорцаў за дзяржаўную незалежнасць з'явілася добрым прыкладам для другога славянскага народа — сербаў, якія таксама на працягу сотняў гадоў трывалі турэцкае панаванне. Дзякуючы ваенна-палітычнай, дыпламатычнай дапамозе, найперш за ўсё Расіі, ім удалося ў 30-я гады XIX ст. дамагчыся для часткі сваёй тэрыторыі статусу самакіравальнага княства пад вярхоўнаю ўладаю Турцыі. Гэтая перамога яшчэ больш была замацавана ў выніку руска-турэцкай вайны 1877—1878 гг. Застацца ж у поўным сэнсе слова незалежнай дзяржавай перашкодзіла Сербіі здрада ўласных пануючых колаў, якія дзеля таго, каб не страціць свайго прывілеяванага становішча ў грамадстве, пайшлі на збліжэнне з уладамі Аўстра-Венгрыі, што тыя вельмі ўмела выкарысталі і ўсталявалі над Сербіяй свой пратэктарат. І дадзены прыклад ёсць пераканаўчае пацвярджэнне таму, што пануючыя колы, заможныя асобы не заўсёды жывуць нацыянальнымі інтарэсамі і, каб не быць выбітымі з у чымсьці выгоднай для іх каляіны, гатовыя прадацца любой дзяржаве. Па віне такіх колаў і асобаў нацыянальна-дзяржаўнае развіццё сербаў істотна затармазілася і змагло выліцца ў пэўную палітычную форму толькі ў 1918 г., калі яны супольна з іншымі народамі аб'ядналіся ў Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў. З 1929 г. гэтае дзяржаўнае аб'яднанне стала называцца Югаславіяй.

Зайздросную ўпартасць, вялікую самаахвярнасць у змаганні за права быць вольным, дзяржаўна незалежным народам праяўлялі балгары. Пад магутным уражаннем іх гераізму знаходзіліся ўсе славянскія народы і як толькі маглі садзейнічалі вызваленню сваіх братоў з кайданоў турэцкай няволі. Руку братняй дапамогі працягнуў і беларускі народ, з памяці якога яшчэ не сцерліся шматлікія факты жорсткай расправы царскіх катаў  над удзельнікамі паўстання 1863—1864 гг., аддданымі паплечнікамі Кастуся Каліноўскага. У зусім небагатай Мінскай губерні насельніцтва сабрала і перадала ў фонд падтрымкі балгар 13 тыс. руб. Знайшлося нямала добраахвотнікаў-беларусаў для паездкі ў Балгарыю, каб са зброяй  у руках змагацца за вызваленне яе з-пад турэцкага ярма. У чыне старшага унтэр-афіцэра лейб-гвардыі Праабражэнскага палка ўдзельнічаў у вызваленні г. Варны, штурме крэпасці Плеўна, абароне перавалу на Шыпцы ўраджэнец в. Карочын Слонімскага павета Канстанцін Хруцкі (1855—1969). За праяўлены гераізм у баях ля Шыпкі яму асабіста сам рускі генерал Скобелеў уручыў Георгіеўскі крыж. Наўзабаве на грудзях воіна-беларуса з'явілася і другая такая ўзнагарода. У 1955 г. у сувязі са стагоддзем з дня нараджэння К. Хруцкага Прэзідыум Народнага схода Народнай Рэспублікі Балгарыі ўзнагародзіў яго ганаровым ордэнам Георгія Дзімітрова.

У выніку пераможнага завяршэння руска-турэцкай вайны 1877—1878 гг. удалося закласці трывалыя падваліны для стварэння балгарскай дзяржавы. У красавіку 1879 г. Устаноўчы сход краіны прыняў

Тырнаўскую канстытуцыю, якая юрыдычна замацавала дзяржаўную незалежнасць Балгарыі. Але ўмяшанне ў гэтую справу ўрадаў заходніх краін Еўропы не дазволіла да канца спраўдзіцца адвечнай мары балгар. І як велізарны гістарычны парадокс, скачучы пад дудку Германіі і Аўстра-Венгрыі, урад Балгарыі нават выступіў на іх баку ў барацьбе з Расіяй у час Першай сусветнай вайны.

Не з лёгкіх быў шлях да ўтварэння ўласнай дзяржавы ў чэхаў і славакаў, хаця яны знаходзіліся не пад уладай Турэцкай імперыі з яе азіяцкімі, мусульманскімі парадкамі, а трапілі ў залежнасць ад перадавых для свайго часу еўрапейскіх краін — Прусіі і Аўстрыі. Вырвацца з-пад іх прыгнёту ўсё ніяк не ўдавалася з-за здрады багатых і ўплывовых станаў чэшскага і славацкага грамадства. Не раз, здавалася, рукой падаць было да перамогі, а тут, глядзіш, ізноў удар нажом у спіну з боку людзей свайго ж роду і племені. Чэхі і славакі дамогуцца палітычнай незалежнасці толькі пасля распаду ў 1918 г. Аўстра-Венгерскай імперыі.

Вельмі цяжка складваўся лёс палякаў, што ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай апынуліся пад уладай Прусіі і Аўстрыі. Як жылося пад уладай рускага цара, гаворка пойдзе ніжэй. Перадавыя колы гэтага народа ніколі не пакідала думка аб адраджэнні былой дзяржавы. Іншым разам змагаліся нават за тое, каб аднавіць яе хаця б на самым невялічкім кавалачку польскай тэрыторыі. І пры спрыяльным збегу вонкавых і ўнутраных абставін такое і сапраўды здарылася. Гэта — стварэнне французскім імператарам Напалеонам пасля разгрому ў 1807 г. войск саюзнікаў васальнага ад Францыі Варшаўскага княства. Тэрытарыяльную аснову яго склалі польскія этнічныя землі, адабраныя ў Прусіі. Паражэнне напалеонаўскай Францыі ў вайне з еўрапейскімі краінамі паклала канец існаванню гэтага княства.

Заслугоўвае быць адзначаным і такі факт, што паводле рашэнняў Венскага кангрэса 1814—1815 гг. польскі горад Кракаў разам з наваколлем, які пасля падзелаў Рэчы Паспалітай прыдбала сабе Аўстрыя, атрымаў статус «вольнай рэспублікі» і часам даволі рашуча адстойваў нацыянальныя правы сваіх жыхароў. Бачачы, што ў 1846 г. аўстрыйскія ўлады былі вельмі занятыя задушэннем паўстання ў Заходняй Галіцыі, насельніцтва Кракава актыўна выступіла на барацьбу за сваё нацыянальнае вызваленне і змагло вытурыць аўстрыйскія войскі з горада. Неадкладна абвяшчаецца дзяржаўная незалежнасць Польшчы, ствараюцца органы ўлады і кіравання. Як след разгарнуць сваю дзейнасць не паспелі, бо аўстрыйцам неўзабаве ўдалося захапіць Кракаў. Усе палітычныя заваёвы палякаў скасоўваюцца, а Кракава пазбаўляюць статусу «вольнага горада», пасля чаго ён становіцца звычайным горадам Аўстрыйскай імперыі.

За пэўную форму польскай дзяржаўнасці можа прызнаць і існаванне ў складзе Прусіі Пазнанскага княства, якое было створана пасля разгрому напалеонаўскай арміі ў бітвах 1812—1814 гг. Пры належнай павазе прускіх уладаў да гэтага княства яно магло б стаць сапраўдным нацыянальна-дзяржаўным фармаваннем у межах Прусіі. Але апошняя

мела зусім іншы погляд на дадзенае пытанне. Перацягнуўшы на свой бок шляхам раздачы рознага роду сацыяльных падачак польскіх памешчыкаў, яна з іх дапамогай стала праводзіць умелую і тонкую палітыку германізацыі насельніцтва Пазнанскага княства. Адміністрацыйным шляхам польскую мову вывелі са школ, мясцовага кіравання і судоў, на ўсіх вышэйшых пасадах палякі былі заменены асобамі нямецкага паходжання. Германізацыя палякаў набыла асаблівую вастрыню пасля таго, як і яны па прыкладзе ўдзельнікаў паўстання 1830—1831 гг. у Расіі паспрабавалі выставіць свае законныя патрабаванні на нацыянальна-культурную аўтаномію. Палякам гэтых тэрыторый, пазбаўленым усіх магчымасцяў вучыць сваіх дзяцей у школах на роднай мове, было наканавана поўнае этнічнае выміранне. Аднак, такое трагічнае становішча хвалявала далёка не ўсіх палякаў, асабліва з заможных пластоў. Яны, дужа не задумваўшыся, пасылалі сваіх дзетак у нямецкія школы ў надзеі, што па заканчэнні вучобы ім лёгка будзе зрабіць кар'еру, бо ва ўсіх жа адміністрацыйных, судовых, культурна-асветных установах Пазнанскага краю ўжывалася толькі нямецкая мова. За польскаю моваю заставаліся толькі сямейна-бытавое жыццё, міжасобасныя зносіны. З практыкі германізацыі палякаў Пазнанскага княства вынікае, у якое балота асіміляцыі трапляе народ, калі ён пазбаўлены магчымасці навучаць свае маладыя пакаленні на роднай мове.

На розных этапах змагання славян за палітычную незалежнасць яны звязвалі дасягенне гэтай высакароднай мэты з атрыманнем практычнай дапамогі з боку Рэчы Паспалітай ці Рускай дзяржавы. І іншым разам такая дапамога мела месца, што ўзвышала аўтарытэт названых дзяржаў у вачах славянскіх народаў. Аднак даводзілася сустракацца тут і з фактамі адваротнага парадку, якія дазваляюць меркаваць, што не раз у самыя адказныя часы і Рэч Паспалітая, і Руская дзяржава ў аднолькавай ступені былі праціўнікамі суверэннага палітычнага развіцця славянскіх народаў, бо ўрады як першай, так і другой толькі імкнуліся пашырыць свае тэрыторыі за кошт гэтых народаў, стаць палітычным ядром славянства. Цяжкія наступствы такога саперніцтва для славянскай супольнасці ў цэлым так раскрыты Іосіфам Первольфам: «... барацьба Польшчы з Масквою з-за першынства на славянскім усходзе паглынала ўсю ўвагу і ўсе сілы Польшчы і адцягвала іх ад славянскага захада і поўдня, і дала падставу да паступовага распаўсюджвання немцаў па Лабе і Дунаі»[1]. Здзяйсненню працэсу аб'яднання ўсходняга славянства пад скіпетрам польскага караля ці рускага цара ў найбольшай ступені перашкаджала рознасць рэлігій у гэтых краінах: каталіцызму і праваслаўя.

Дзеля забеспячэння за Расійскай імперыяй галоўнай ролі ў славянскім свеце некаторыя яе дзяржаўныя і ваенныя дзеячы, прадстаўнікі інтэлігенцыі афіцыйнага накірунку ўсяляк імкнуліся выкарыстаць да-

[1] Первольф Иосиф. Славяне, их взаимные отношения и связи. Т. II. Варшава. 1888. С. 77.

волі шырока вядомую ў XIX — пачатку XX ст. ідэйна-палітычную плынь — панславізм. Пры гэтым асаблівы ўпор рабіўся на распрацаваныя ў ім праекты славянскай федэрацыі і канфедэрацыі з іх бясспрэчным палітычным асяродкам — Расіяй як самай магутнай у Еўропе дзяржавай. Адзін час сярод славян нават бытаваў тэрмін «Сусветная Расійская імперыя».

Неабходнасць адвядзення галоўнай ролі рускаму народу ў аб'яднанні славян многія тлумачылі тым, што і некаторыя яго плямёны не мелі сваёй дзяржаўнасці. Так, яшчэ і на пачатку XX ст. адно з самых значных славянскіх адгалінаванняў, што жыло ў Карпацкай Русі, уваходзіла ў склад Аўстра-Венгерскай імперыі. Ёй жа тады належалі чэхі, славакі, значная частка серба-харватаў (другая — Турцыі), палякаў, славінцаў. З самастойных славянскіх дзяржаў, акрамя Расіі, існавалі толькі Балгарскае і Чарнагорскае княствы, Сербскае каралеўства.

Самы шчаслівы этап у змаганні славян за нацыянальна-дзяржаўную незалежнасць прыпаў на завяршальны перыяд Першай сусветнай вайны і ў найбліжэйшыя за ёю гады. Славяне, стаўшы дзяржаўнымі народамі, выратавалі сябе ад усемагчымых формаў культурна-моўнай асіміляцыі, атрымалі рэальную магчымасць будаваць сваё духоўнае жыццё на ўласнай прыроднай аснове.

Сказанага больш чым дастаткова, каб гаварыць, што ў славян проста ў крыві імкненне да ўласнай дзяржаўнасці. У адваротным выпадку ім бы не ўдалося дасягнуць такой высакароднай мэты, улічваючы, што ў ролі самых сур'ёзных праціўнікаў яе часта выступалі ўрады многіх уплывовых краін Еўропы, якія адмаўлялі здольнасць славян на прыстойнае самастойнае дзяржаўнае развіццё. Нават у міжваенны перыяд, калі да незалежнага нацыянальна-дзяржаўнага жыцця прыйшла абсалютная большасць суб'ектаў славянскай супольнасці, правадыр нямецкага фашызму Адольф Гітлер дазволіў сабе выказаць такую хлусню: «Не дзяржаўныя здольнасці славянства далі моц і дужасць рускай дзяржаве. Расія абавязана была германскім элементам». Іх жа ролю ў дачыненнях да дзяржаўнага жыцця славян як ніжэйшай расы любілі падкрэсліваць і іншыя фальсіфікатары гісторыі.

Шкада, што да ўласнай дзяржаўнасці як гарантыі ўстойлівага развіцця кожнага этнасу ўдалося дайсці далёка не ўсім славянам. На шляху да гэтага найвялікшага значэння рубяжу згубілася нямала славянскіх плямёнаў (даволі часта і па віне шматлікіх, моцных народаў дадзенай супольнасці) з іх самабытнымі культурамі. Сёння толькі спецыялісты вузкай кваліфікацыі нам могуць сёе-тое сказаць пра племянную групу ўсходніх славян ціверцаў, што займалі тэрыторыю ў нізоўях Днястра, Прута і Дуная. У моц сваёй нешматлікасці і па іншых прычынах не сталі дзяржаўнымі шэраг славянскіх народнасцяў Польшчы, што з'яўляецца сур'ёзнай перашкодай для іх самабытнага этнакультурнага развіцця. У такіх варунках з'яўляецца вельмі праблематычным захаваць сваё нацыянальнае «Я». Існуе рэальная небяспека, што такі трагічны лёс можа напаткаць лужыцкіх сербаў, якія, жывучы ў асяроддзі высо-

каразвітай нямецкай нацыі, не маюць аніякіх правоў на самакіраванне, нацыянальна-культурную аўтаномію.

Практычна ва ўсе часы нялёгкага змагання славян за этнічнае выжыванне, стварэнне ўласнай дзяржаўнасці ім даводзілася многае вырашаць супольнымі намаганнямі. Адсюль зразумела, чаму такімі папулярнымі былі рознага роду славянскія аб'яднанні. Існавала нават ідэя аб утварэнні «Усеславянскай манархіі». З такімі ініцыятывамі часцей за ўсё выступалі рускія дзяржаўныя, грамадскія і культурныя дзеячы. Да іх належаў і вядомы гісторык, публіцыст і пісьменнік Міхаіл Пагодзін (1800—1875), які шмат працаваў над ідэяй аб утварэнні адзінай славянскай дзяржавы на чале з Расіяй. У ролі прыхільніка ўсеславянскай федэрацыі як пераходнай ступені да федэрацыі вольных народаў выступаў адзін з заснавальнікаў і тэарэтыкаў анархізму Міхаіл Бакунін (1814—1876). Шмат увагі аб'яднаўчым працэсам сярод славян надаваў рускі навуковец М. Я. Данілеўскі — аўтар вельмі папулярнай у свой час кнігі «Россия и Европа» (1871). «Яго праект усеславянскай федэрацыі на чале з Расіяй і сталіцай у Царградзе (Канстанцінопале) аб'ядноўваў 125 млн. чалавек, роднасных па духу і крыві». На яго думку, толькі так можна было дасягнуць сусветнай раўнавагі паміж трыма асноўнымі сіламі: Заходняй Еўропай, Славянствам і Амерыкай, а свет пазбегнуў бы самай вялікай небяспекі — усталявання гегемоніі заходняй культуры»[2].

Аднак трэба прызнаць, што рознага роду праекты палітычнага аб'яднання славян пад эгідай Расійскай імперыі не знаходзілі падтрымкі ва ўплывовых колах гэтай этнічнай супольнасці народаў. Існавала небяспека, што такое аб'яднанне можа прывесці да пэўнага абмежавання правоў славян на нацыянальную незалежнасць. Таму, акрамя аб'яднанняў палітычнага характару, прапаноўваліся і іншыя формы згуртавання славян. Тут можна назваць створанае ў Расіі неўзабаве пасля Пражскага славянскага з'езда (1908) Таварыства славянскай узаемнасці. У наступным годзе яго аддзяленні былі заснаваны ў Вільні, Мінску і іншых беларускіх гарадах. Чагосьці важнага для беларускага нацыянальнага інтарэсу ў іх дзейнасці не было, бо ў нашым краі яны адстойвалі рускія ідэалы.

Гісторыі стварэння ўсемагчымых славянскіх аб'яднанняў вядомы і такі факт. Увесну 1941 г. заўзяты змагар за вялікую Польшчу Баляслаў Пясэцкі заснаваў крайне нацыяналістычную арганізацыю пад назвай Канфедэрацыя народа, якая разам з іншымі перыядычнымі выданнямі выпускала і «Бюлетын Словяньскі». «Праяўляла яна антыкамунізм і тэндэнцыю экспансіі ў так званай ідэі Славянскай імперыі, дзе Польшча мела граць вядучую ролю. Мэтай Канфедэрацыі Народу было разьбіць Расею і на яе развалінах стварыць «вялікую славянскую імперыю». Дзеля гэтай мэты Баляслаў Пясэцкі стварыў тры баявыя групы з 1000

---

[2] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі (у далейшым — ЭГБ). Т. 5. Мн., 1999. С. 400.

маладых палякаў, якія ішлі з Польшчы на Беларусь у 1942—1943 гадах. Былі яны поўнасьцю разьбітыя немцамі і мала хто з іх уцалеў»[3]. На ўсім шляху да нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасці славяне імкнуліся не толькі словам, але і справай дапамагаць адзін аднаму. Гэтая праблема і шэраг іншых важных пытанняў асабліва грунтоўна абмяркоўваліся на славянскіх з'ездах, што заслугоўвае адмысловага разгляду.

## 3. ПАД ПРЫГНЁТАМ СЛАВЯНСКІХ ДЗЯРЖАЎ

Гісторыя славянскіх нацыянальна-дзяржаўных рухаў апошніх трохпяці стагоддзяў была б далёка не поўнай, калі б гэтая праблема раскрывалася толькі на прыкладах змагання свабодалюбных славян за выхад з-пад прыгнёту Турэцкай імперыі, Прусіі і Аўстрыі. На свеце, як вядома, няма нічога больш складанага, супярэчлівага, як узаемаадносіны паміж народамі. Датычыць гэта як далёкіх, так і блізкіх паміж сабою народаў паводле іх гістарычных традыцый, культуры, мовы і рэлігіі. Таму здаралася не раз і такое, што славяне падпадалі пад уладу не толькі зусім чужых, але і блізкароднасных народаў, з якімі належалі да адной і той жа этнічнай супольнасці.

Стагоддзямі даводзілася жыць пад уладай славянскіх народаў — спачатку польскага, затым рускага — беларусам. У першым выпадку так «прывольна» жылося, што нашыя продкі ледзь не цалкам апалячыліся. Беларусы належалі да тых славянскіх народаў, перад якімі на працягу ўсяго XVIII ст. досыць востра стаяла праблема этнічнага захавання. У многім іх лёс вельмі нагадваў тое, што ўжо адбылося і працягвала адбывацца з чэхамі, розніца толькі ў тым, што іх, у адрозненне ад беларусаў, да этнічнай смерці штурхаў не славянскі народ, а суседнія аўстрыйцы, немцы.

У не меншай ступені арыстакратычная польская шляхта прыгнятала і другі славянскі народ — маларосаў (украінцаў). Але, паўстаўшы ў палове XVII ст. супраць такога прыгнёту, заяўляў у 1868 г. рускі грамадска-палітычны дзеяч Міхаіл Бакунін на кангрэсе Лігі міру і свабоды, «частка Украіны з-за нянавісці да Польшчы здзейсніла вялікую памылку: яна прыняла заступніцтва рускага цара. Цары абяцалі ёй усё: і захаванне яе вольнасцяў, і нацыянальную аўтаномію». У сапраўднасці ўсё атрымалася наадварот. Зараз, працягваў М. Бакунін, «гэты панславісцкі (гэты тэрмін Бакунін ужываў замест «расійскі». — *Л. Л.*) нацыянальны ўрад сістэматычна і жорстка ўціскае маларасійскую мову ў Маларасіі, як польскую ў Польшчы. Няхай будзе гэта папярэджаннем аўстрыйскім і турэцкім славянам, якія шукаюць сваё выратаванне ў Маскве»[4].

---

[3] Вясялкоўскі Юры. Што прывяло Армію Краёву на Беларусь. Лондан. 1995. С. 130.

[4] Бакунин Михаил. Избр. соч. Т. III. П.—М. 1920. С. 109.

Праблема этнічнага выжывання беларусаў яшчэ больш абвастрылася пасля далучэння іх у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай да самай магутнай у Еўропе дзяржавы — Расійскай імперыі. Пазней яна прыдбала сабе яшчэ значную частку карэннай польскай тэрыторыі. Такім чынам, царская імперыя ператварылася ў краіну, дзе жылі чатыры славянскія народы. Аднак поўнапраўнай, дзяржаўнай нацыяй з'яўлялася толькі руская, а палякам, украінцам і беларусам, хаця яны жылі і на сваёй спрадвечнай, этнічнай тэрыторыі, у такім праве катэгарычна адмаўлялася, за пэўным выключэннем толькі для першых. Больш таго, з цягам часу ў афіцыйных урадавых колах украінцаў і беларусаў нават перасталі прызнаваць за самабытныя славянскія народы, на што, дарэчы, не адважваліся ўлады ні Прусіі, ні Аўстрыі, ні Турцыі да сваіх славянскіх народаў. Відаць, па гэтай прычыне славянам Прусіі ці Аўстрыі лягчэй было адкрыць нацыянальную школу для сваіх дзяцей, чым зрабіць такое ўкраінцам і беларусам Расіі. Бо навошта першым ці другім нацыянальная адукацыя, калі яны, лічылі высокія царскія чыноўнікі і афіцыйныя ідэолагі, не ёсць самабытныя народы, а з'яўляюцца такімі ж самымі рускімі, толькі маюць трохі адметныя ад іх мовы, што тлумачылі паланізацыяй. Гэта быў велізарны пралік шавіністычнай палітыкі Расійскай імперыі ў дачыненні да палякаў, украінцаў і беларусаў. Няцяжка ўявіць, якіх бы вышыняў яны дасягнулі ў сваім развіцці, каб Расія не перашкаджала, а, наадварот, пасадзейнічала ім у стварэнні сваіх уласных дзяржаў! Сёння і Польшча, і Украіна, і Беларусь стаялі б на ўзроўні перадавых дзяржаў Еўропы з аднолькавай тэрыторыяй і колькасцю насельніцтва. А як ад гэтага выйграла б славянская супольнасць народаў у цэлым! На вялікі жаль, гэтым славянскім народам гісторыя вызначыла зусім іншы жыццёвы шлях, прычым яшчэ на даволі працяглы перыяд.

Еўропу прыводзіла ў вялікі здзіў, што Расія, ведучы такую актыўную барацьбу за вызваленне славян з-пад іншаземнага прыгнёту аж да іх выхаду са складу поліэтнічных краін і стварэння ўласных суверэнных дзяржаў, нічога ў гэтым плане не рабіла для сваіх славян — палякаў, украінцаў і беларусаў. Усялякія іх (за пэўным выключэннем палякаў) спробы да ладавання жыцця паводле ўласцівых толькі адным ім нацыянальна-культурных традыцый, не кажучы ўжо пра атрыманне права на абласную, тэрытарыяльную аўтаномію, жорстка душыліся. Палякі, украінцы і беларусы толькі з зайздрасцю маглі сачыць за тым, якога поспеху ў барацьбе за права быць дзяржаўным народам дамагаліся іншыя славянскія народы. А пэўныя пазітыўныя зрухі ў такім справядлівым, абгрунтаваным усёй логікай цывілізаванага развіцця змаганні, несумненна, былі.

Увесь перыяд знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (1772 — люты 1917 г.) — гэта адна толькі страта ёю не па ўласнай віне сваіх нацыянальна-культурных, моўных асаблівасцяў, што немінуча вяло да канчатковай дэфармацыі беларусаў як самабытнага славянскага этнасу. А паміраць жа страх як не хацелася, хаця і ў асяроддзі блізкарод-

насных славян. Жаданне жыць, не стаць ахвярай русіфікатарскай палітыкі царскага самаўладдзя спачатку прывяло да нацыянальна-вызваленчага паўстання 1830—1831 гг., а затым 1863—1864 гг.

За час іх славянскай крыві было праліта нямала, але якіх-небудзь станоўчых зрухаў у паслабленні нацыянальнага прыгнёту беларусаў з боку Расійскай імперыі не назіралася. Хутчэй, наадварот. Пад ярмом расійскага царызму нясоладка жылося і другому славянскаму народу — палякам. І хоць яшчэ добра памяталася, як яны глуміліся з нацыянальных традыцый, культуры і мовы, звычаяў беларусаў, цяпер гэтым двум блізкароднасным народам даводзілася змагацца супроць іх агульнага ворага — Расійскай манархіі. Найбольшую актыўнасць праяўлялі палякі, у якіх намнога мацнейшым было жаданне вырвацца з расійскай няволі і стварыць уласную дзяржаву. Такога ж зусім не збіраўся зрабіць для іх царызм, што толькі сеяла варожасць на гэтай велізарнай частцы славянскага абшару. Тагачасная навуковая, навукова-папулярная і мастацкая літаратура перапоўнена старонкамі, якія ў непрыглядным святле паказваюць — часта з вялікім перабольшваннем — непрыязныя дачыненні паміж рускім і польскім народамі. Падобнага роду канфліктнасць набыла асаблівую вастрыню пасля жорсткай расправы Расійскай імперыі з паўстаннямі 1830—1831 і 1863—1864 гг. Рускі гісторык Васіль Ратч пакінуў такі цяжкі, бязрадасны ўспамін: «Пры з'яўленні рускага ў польскім грамадстве змаўкае шчырая размова; рускі паміж тубыльцамі Заходняй Расіі (сюды ён уключае Беларусь. — *Л. Л.*) — чалавек не толькі чужы, але чалавек небяспечны; якую можа ён сустрэць шчырасць сярод грамадства, якое ўсё настроена нянавісцю да рускіх?»[5]

Зусім не братэрская палітыка Расійскай імперыі ў дачыненні да сваіх славянскіх народаў — палякаў, украінцаў і беларусаў — рэзка крытыкавалася сапраўднымі рускімі вучонымі-патрыётамі. Асабліва непакоіла іх становішча польскага народа, і, відаць, не ў малой ступені таму, што на яго баку рашуча стаяла ўся прагрэсіўная Еўропа. Лёс украінцаў і беларусаў яе менш хваляваў, бо расійскі друк усяляк распаўсюджваў плёткі, што яны не ёсць самабытныя этнасы, а належаць да рускага народа. Пра палякаў жа не адважваліся гаварыць такую бязглуздзіцу. Яны проста здзіўлялі і сяброў, і ворагаў сваёй самаахвярнай барацьбой за нацыянальнае вызваленне, адраджэнне гвалтам забранай у іх дзяржаўнасці, з чым аніяк не маглі пагадзіцца палітыкі Расіі, працягваючы няўхільна праводзіць курс на русіфікацыю палякаў. Каб папярэдзіць з-за няспыннага ажыццяўлення такога курсу далейшае нарастанне канфліктаў паміж двума славянскімі народамі, рускі гісторык Міхаіл Пагодзін пісаў: «Самая дзейсная мера прымірыць палякаў з намі (бо яны ўсё яшчэ ненавідзяць нас) ёсць пратэжыраванне іх мове, літаратуры, гісторыі (я гавару пра Царства Польскае), і, наадварот, нішто гэтак не са-

[5] Ратч Василий. Сведения о польском мятеже 1863 года в Северо-Западной России. Т. I. Вильна. 1867. С. 46.

дзейнічае злосці, як меры процілеглыя. Мове польскай у навучальных установах Царства патрэбна вучыць нароўні з рускай»[6] .

Беларусы маглі толькі пазайздросціць польскаму народу, чытаючы такія радкі, бо ў абарону іх роднай мовы не выступаў ні адзін з буйных рускіх вучоных. Сказанае датычыць і саміх славянафілаў з ліку перадавой рускай інтэлігенцыі, хаця ўсе яны так палымяна зяўлялі пра сваё жаданне шчыра служыць інтарэсам славянскіх народаў. Беларусаў жа сярод іх яны не бачылі і бачыць не хацелі. Самы апантаны ў Расіі славянафіл, публіцыст, грамадскі дзеяч Іван Аксакаў даў такі наказ маладым людзям, якіх з цэнтральных губерняў пасылалі на Беларусь неўзабаве пасля задушэння паўстання 1863—1864 гг.: «Няхай жа сумленная адукаваная моладзь, скончыўшы навуку ва універсітэце, накіруецца ў Заходні край з сваімі свежымі, бадзёрымі сіламі і з'явіцца там місіянерамі рускай народнасці». І такіх прышлых місіянераў заўжды хапала ў нашым краі. Можна назваць толькі адзінкі з прысланых сюды з Расіі людзей, якія жадалі бачыць у беларусах самабытны народ і садзейнічалі ім у такім самасцвярджэнні. Затое якая процьма закінутых да нас расійскіх чыноўнікаў ганьбіла нашую культуру, асабліва мову, справядліва бачачы ў ёй галоўны чыннік адрознення беларускага народа ад рускага. Вось якую характарыстыку тагачаснай сітуацыі даў наш таленавіты вучоны-прыродазнавец Дыбоўскі (1833—1930): «Усе расійскія ўрадаўцы пагарджаюць беларускай мовай... Цяперашнія чыноўнікі і духавенства, прысланыя з-пад цёмнай зоркі, уважаюць за абразу ўласнай годнасці вучыцца размаўляць па-беларуску». Ім удалося перакачаць вельмі многіх беларусаў, з прычыны іх слабай дасведчанасці ў нацыянальнай гісторыі і культуры, што нібыта іх мова грубая, не можа быць сродкам дакладнага выкладання навуковых паняццяў, напісання мастацкіх твораў, навучання ў школах, вядзення набажэнства ў хрысціянскіх храмах, таму духоўны прагрэс беларускага народа, маўляў, цалкам залежыць ад яго пераходу на рускія культурна-моўныя стандарты. Многія збітыя з панталыку паверылі гэтым выдумкам і не дужа супрацiўляліся тонка прадуманай дзяржаўнай палітыцы русіфікацыі, таму вельмі цяжка было нацыянальна скіраванай інтэлігенцыі змагацца з ёю. Але яна ўсё ж не сядзела склаўшы рукі. Такую інтэлігенцыю моцна непакоіла безупынная дыскрымінацыя іх роднай культуры і мовы, што непазбежна вяло да разбурэння самога этнакультурнага арганізма карэннага насельніцтва гэтага нацыянальнага рэгіёна імперскай Расіі, якая, на добры лад, усяляк павінна была б шанаваць усе свае славянскія народы, не выключаючы і беларусаў. Такога тут ніколі не назіралася. Блізкародныя па культуры і мове да беларусаў рускі дзяржаўны народ не вызначаўся да іх сваёй пашанай, што толькі пагаршала ўзаемадачыненні паміж імі. Не дарэмна прынята лічыць: тое, што можна дараваць чужому, таго нельга выбачыць свайму. Не ўяўляецца, да прыкладу,

---

[6] Цытавана па кн.: Драгоманов М. П. Политические сочинения. Т. 1. М., 1908. С. 183.

складаным зразумець немцаў, калі яны ў свой час рабілі ўсё, каб пераўтварыць славянаў у гной для ўласнай нацыі. Але калі такое чынілі палітыкі ў аснове сваёй славянскай дзяржавы з блізкім ёй па культуры і мове народам — такое вельмі цяжка зразумець і зусім нельга апраўдаць. Працяглая па часе, жорсткая па метадах правядзення культурна-моўная асіміляцыя беларускага народа моцна затармазіла яго духоўнае развіццё. Не будзем забывацца, што быў час, калі і чэхі, якія, паводле праўдзівых сцвярджэнняў польскага паэта беларускага паходжання Адама Міцкевіча, «ішлі на чале славянскай культуры», дзесьці ўжо ў першай палове XIX ст. пад негатыўным уздзеяннем дзяржаўнай палітыкі анямечвання на цэлае стагоддзе адсталі ад славянскіх народаў і не ўдзельнічалі ў адраджэнні[7] . Гэтае ж самае можна сказаць пра ўсё XIX стагоддзе для беларусаў, толькі ў адрозненне ад чэхаў яны адсталі ў сваім культурным развіцці не з прычыны анямечвання, а русіфікацыі, якую праводзілі дзяржаўныя ўлады, інтэлігенцыя і праваслаўнае духавенства краіны з прэтэнзіяй на вядучую ролю ў славянскім свеце.

Іншым словам, як парадокс, нельга назваць такую з'яву ў палітыцы царскай Расіі да беларускага народа, якому тут куды горш жылося, чым, скажам, палякам і ўкраінцам пад уладай Аўстрыі, хаця яны нічога агульнага не мелі ў культуры з яе асноўным тытульным насельніцтвам. Аднак гэтыя два народы карысталіся даволі прыстойным статусам нацыянальна-культурнай аўтаноміі (мелі не толькі пачатковыя, але і сярэднія, вышэйшыя навучальныя ўстановы, шыроказгалінаваны друк на роднай мове). Беларусам жа пад крылом славянскай Расіі нават і ў сне не бачылася такога. Выходзіць, пад час трох падзелаў Рэчы Паспалітай Беларусь трапіла не да той імперыі.

Супярэчная карэнным інтарэсам беларускага народа нацыянальная палітыка славянскіх дзяржаў спачатку Рэчы Паспалітай, а затым Расійскай імперыі рана ці позна павінна была паставіць пад пытанне магчымасць яго далейшага існавання як самабытнага этнасу. Многія палітыкі і адданыя ім навукоўцы адмаўлялі за беларусамі пэўную славянскую адметнасць за часамі Рэчы Паспалітай. Калі такую адметнасць разглядаць у рамках заможных і інтэлектуальных пластоў беларускага народа, дык у іх і сапраўды было вельмі мала чаго самабытнага, нацыянальна-беларускага. Гэтыя пласты практычна цалкам адышлі ад прыродных культурна-моўных традыцый карэннага насельніцтва нашага краю, успрыняўшы ўсё польскае. Самабытна беларускім было жыццё толькі простага вясковага люду, што зусім не бралася пад увагу палітыкамі і адукаванымі коламі грамадства Рэчы Паспалітай. З такімі поглядамі салідарызаваліся вярхі Расійскай імперыі, якія адразу пасля захопу амаль усіх беларускіх земляў у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай паспяшаліся назваць іх насельніцтва спрадвечна рускім, толькі моцна спольшчаным з-за працяглага ўплыву на яго польскага ладу жыцця, каталіц-

[7] Мицкевич Адам. Собр. соч. в 5 томах. Т. 4. М., 1954. С. 521.

кага касцёлу польскага ўзору. Так неспадзявана адна форма асіміляцыі беларусаў змянілася другой, у ролі архітэктараў якой і на гэты раз выступіў урад славянскай дзяржавы.

У блізкім да апісанага вышэй становішчы знаходзілася ў складзе царскай імперыі паўднёва-усходняя славянская суседка Беларусі Украіна. Калі з ліпеня 1864 г. у Кіеве вырашылі выдаваць рускамоўную літаратурную і палітычную газету «Киевлянин», у спецыяльна прысвечаным гэтай падзеі артыкуле ад рэдакцыі не раз прыводзіліся словы І. Аксакава датычна Украіны: «Край гэты — рускі, рускі, рускі!» У артыкуле дадзенае палажэнне прызнавалася не інакш, як аксіёма. Называючы Украіну краем рускім, рэдакцыя абяцала чытачам, што будзе на старонках сваёй газеты «праводзіць думку пра неабходнасць паступовага ўводу ў краі адміністрацыі ў рускім духу і з рускіх людзей». Не ўтойвала рэдакцыя сваіх русіфікатарскіх поглядаў і на ролю народнай адукацыі на ўкраінскіх землях, пішучы, што яна павінна быць заснаванай «на пачатках праваслаўных і рускіх ... здзяйсняцца на рускай мове, людзьмі рускімі»[8]. Пра якую-небудзь украінскую этнакультурную адметнасць, адрозненне ўкраінцаў ад рускіх у гэтым зусім не малым паводле памеру артыкуле не згадвалася ні слова.

Дасягненню роўнасці славянскіх народаў ніяк не спрыяла нацыянальная палітыка буржуазнага Часовага ўрада, а пазней Савецкай улады, якіх, дарэчы, падтрымлівала абсалютная бальшыня вялікарускай інтэлігенцыі, асабліва ў пытаннях дзяржаўнага самавызначэння ўкраінскага і беларускага народаў. У выніку чаго некаторыя лідэры нацыянальных рухаў гэтых народаў сталі абвінавачваць у вялікадзяржаўным шавінізме рускі народ увогуле, што прычыняла вялікую шкоду агульнаславянскай справе. Сярод такіх лідэраў быў і беларускі грамадска-палітычны дзеяч Язэп Лёсік. Разглядаючы нацыянальнае пытанне ў паслярэвалюцыйнай Расіі, ён пісаў: «... пры сьвеці палітычнай волі, выявілася, што вялікарускі народ устаў перад намі, як новы валадар і гвалтоўнік. Зваліўшы самадзяржавіе, іон праз сваіх міністраў-соцыялістаў рашуча заявіў, што ні адкажацца ад свайго нацыянальнага панавання. Карыстаючы з народнае цемнаты, правадары маскоўскай дэмакратыі, згуртованыя ў рады работніцкіх, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, дзеля лягчэйшага ўтрымання свайго уладарства, абазвалі нацыянальны рух буржуазным і контррэвалюцыйным і сталі крывёю і залезам бараніць сваё панаванне. Тады была задушана Украіна, разагнаты першы Усебеларускі Зьезд і зьнішчаны ўсе цэнтральныя беларускія арганізацыі»[9].

Славянская дружба не вытрымала іспыту ў вельмі цяжкі час яе выпрабавання кайзераўскай акупацыяй у 1918 г. Паміж суседнімі Беларусі славянскімі народамі разгарнулася такая бойка за дзяльбу яе тэрыторыі, што Савет Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі вымуша-

---

[8] Журнал Министерства народного просвещения. Часть CXXII. Отд. VI. 1864. С. 94.

[9] Вольная Беларусь. 1918. 3 сакавіка.

ны быў у спецыяльнай ноце ад 8 студзеня 1919 г. звярнуцца па дапамогу да дыпламатычных прадстаўнікоў зусім не славянскіх краін — ЗША, Англіі, Францыі і Італіі. У гэтай ноце за подпісам старшыні Савета Міністраў БНР і міністра замежных спраў Антона Луцкевіча паведамлялася наступнае: «...абапіраючыся на Брэсцкую дамову з Германіяй, Украінская Дзяржава захапіла 10 беларускіх паветаў Гродзенскай, Мінскай і Чарнігаўскай губерняў; затым, з уходам немцаў, Расійская Савецкая Рэспубліка акупавала ўсю Усходнюю Беларусь, а зараз Польскі Урад робіць крокі да захопу Заходняй часткі Беларусі: Віленскай і Гродзенскай губерняў, з безумоўна пануючым беларускім насельніцтвам, што ўстаноўлена як афіцыйнай статыстыкай, так і навуковымі даследаваннямі даваеннага часу, вольнымі ад усялякай тэндэнцыйнасці». У канцы ноты ўтрымлівалася просьба да пералічаных вышэй вялікіх дзяржаў «прыняць пад сваю абарону ад разарвання суседзямі тэрыторыі Беларускай Народнай Рэспублікі»[10]. Але да гэтай просьбы яны не прыслухаліся, і тэрыторыя Беларусі працягвала заставацца разменнай манетай для яе славянскіх суседзяў. Як вынікае, уласныя інтарэсы для іх былі куды вышэй за агульнаславянскія, і праводзілі іх у жыццё праз грубае парушэнне гістарычных традыцый, без уліку этнакультурных асаблівасцяў насельніцтва кожнай канкрэтнай мясцовасці. І як нейкае наканаванне лёсу ў становішчы пакрыўджанага ва ўсіх выпадках знаходзілася Беларусь. Суседзі вымушалі яе выступаць у ролі донара для пашырэння тэрыторыі іх дзяржаў.

Пад вялікае сумненне ставіць славянскае братэрства і факт звароту міністра беларускіх спраў Літоўскага ўрада Язэпа Варонкі да германскага ўпаўнаважанага ў Літве Цымерле ад 11 красавіка 1919 г. з просьбой яшчэ пэўны час не выводзіць нямецкія войскі з Гародні з тым, каб не даць уварвацца сюды польскім легіёнам і знішчыць у горадзе «ўсю работу беларускіх арганізацый»[11].

Сур'ёзным злачынствам маладой польскай дзяржавы супроць беларускага народа, бясспрэчна, можна лічыць закрыццё перад пачаткам 1919/20 навучальнага года Будслаўскай беларускай гімназіі (Вілейскі павет, зараз — Мядзельскі раён). Адкрыта ж яна была ў студзені 1918 г., калі ў гэтым кутку беларускай зямлі гаспадарылі кайзераўскія войскі. Немцам такая беларускамоўная сярэдняя агульнаадукацыйная вучэльня не замінала, а вось для палякаў яна была бяльмом на воку. Пратэсты 500 сялян-беларусаў супроць такой цемрашальнай акцыі мясцовай польскай адміністрацыі не далі жаданага выніку. Не рэагавала яна і на асуджэнне такіх дзеянняў Цэнтральнай беларускай радай Віленшчыны і Гарадзеншчыны. І не рэагавала таму, што ў планы польскіх уладаў не ўваходзіла стварэнне беларусам на іх уласнай зямлі нармальных умоў для прыстойнага сацыяльна-палітычнага і духоўнага жыцця. Да гэтага славянскага народа такой лініі трымаліся і пасля таго, як з ласкі Маск-

[10] Езовитов К. Белорусы и поляки. Ковна. 1919. С. 28, 29.
[11] Езовитов К. Белорусы и поляки. С. 48.

вы ў 1921 г. значная частка яго апынулася ў складзе Польшчы. За ўвесь міжваенны перыяд яе ўлады не прынялі аніводнага нарматыўнага акта, накіраванага на гарантыю нацыянальных правоў беларускага народа. Іх адразу пачалі парушаць з такой рашучасцю і паслядоўнасцю, што нават узнікла рэальная пагроза для далейшага этнічнага існавання беларусаў. Паводле меркаванняў міністра-прэзідэнта Польскай Рэспублікі Скульскага для завяршэння гэтага працэсу спатрэбіцца не больш як пару дзесяткаў гадоў. Другая высокая дзяржаўная асоба Польшчы міністр замежных спраў Бэк у інтэрв'ю адной з французскіх газет меў нахабства заявіць: «Мы закрываем у Заходняй Беларусі школы і замяняем іх польскімі таму, што беларусы — народ адсталы... беларуская мова неразвітая, і мала карысці прыносіць яна тым, хто ёю валодае і хто на ёй вучыцца». Падобны пункт погляду выказаў і добра вядомы ў міжваеннай Польшчы шавініст Уладзіслаў Студніцкі: «Этнаграфічная беларуская маса павінна быць безумоўна асімілявана, і беларусы павінны пакінуць мары пра нацыянальнае існаванне. Ні аб якім беларускім народзе не можа быць і размовы, таму што беларусы не маюць уласных традыцый».

Наіўна было б думаць, што такая варожая ў дачыненні да беларусаў дзяржаўная нацыянальная палітыка негатыўна не адбілася на стаўленні да іх і саміх палякаў. Ад вялікадзяржаўнага да міжасобаснага шараговага шавінізму не бывае вялікай адлегласці. Гісторыі вядома вельмі мала фактаў падтрымкі палякамі законных патрабаванняў беларусаў на адкрыццё ўстаноў адукацыі і культуры на роднай мове, выдання на ёй кніг, газет і часопісаў. Затое хапае фактаў бязлітаснай расправы атрадаў польскай Арміі Краёвай з беларускім цывільным насельніцтвам у гады Другой сусветнай вайны. Не ўкладваюцца ў паняцце славянскага братэрства даволі масавыя прыклады, калі польскія лагерныя ўлады, што дзейнічалі ў пасляваеннай Еўропе на тэрыторыі Нямеччыны і Аўстрыі, каб ачысціць свае лагеры ад беларусаў і ўкраінцаў, здавалі іх савецкім рэпатрыяцыйным камісіям з мэтай вывазу ў СССР, дзе такіх людзей чакала суровая кара.

Савецкі Саюз ніколі не належаў да славянскіх краін, аднак роля славян у дзейнасці яго высокіх дзяржаўных і партыйных органаў была вялікай. Здавалася, што з гэтага фактару Беларусь як славянская саюзная рэспубліка павінна была б заўжды мець пэўную выгоду. На практыцы такога не назіралася. Асабліва груба былі парушаны Масквою нацыянальныя інтарэсы беларускага народа пры вырашэнні ў кастрычніку 1939 г. лёсу яго гістарычнай сталіцы Вільні і Віленскага краю: у пэўных ваенна-палітычных мэтах іх перадалі зусім не славянскай краіне — Літоўскай Рэспубліцы.

Сёння, калі адбываецца працэс інтэнсіўнага нацыянальна-дзяржаўнага развіцця славянскіх народаў, вядуцца пошукі іх эканамічнай, палітычнай, культурнай інтэграцыі, нельга забывацца на ўсё негатыўнае ва ўзаемадачыненнях у асяроддзі гэтай этнічнай супольнасці. Кожнага з нас сёння і заўтра павінна хваляваць і непакоіць, чаму нашыя стасункі з славянамі яшчэ ў сівой мінуўшчыне звязаны з такімі цяжкімі для

ўспаміну падзеямі, як вераломнае ўварванне ў межы Полацкага княства войскаў вялікага кіеўскага князя Уладзіміра Святаслававіча, забойства ім гаспадара гэтай дзяржавы Рагвалода, гвалтоўнае ўзяцце за жонку яго дачкі Рагнеды, крывавая бітва на рацэ Няміга... Процьма такіх варожых славянскіх сутычак мела месца ў больш позні час, не выключаючы і XX стагоддзе. Гісторыя працягваецца. Палітычным сілам і грамадскасці славянскіх краін неабходна імкнуцца да таго, каб усё негатыўнае ў іх узаемадачыненнях належала мінуламу і не паўтаралася ў нашыя дні. Нішто гэтаму так не будзе садзейнічаць, як поўны, неабмежаваны нацыянальна-дзяржаўны суверэнітэт славянскіх народаў, рэальная магчымасць іх культурна-моўнага развіцця на сваёй прыроднай аснове.

## 4. ДА НАЦЫЯНАЛЬНА-АДРАДЖЭНСКАГА РУХУ ДАЛУЧАЮЦЦА БЕЛАРУСЫ

Працяглы час з усіх славянскіх народаў самым нізкім узроўнем нацыянальна-дзяржаўнай свядомасці вызначаліся беларусы. Такое тлумачылася многімі прычынамі, але галоўная з іх — адарванасць адукаваных, самых заможных пластоў грамадства ад сваіх культурна-моўных каштоўнасцяў і пераход на чужыя ім адпаведнікі: спачатку польскія, затым — рускія. Спадзявацца, што ў такіх варунках сярод беларусаў маглі фармавацца людзі са здаровай нацыянальна-дзяржаўнай свядомасцю, ніяк не даводзіцца. Яна характэрная ў поўным аб'ёме толькі грамадству, якое развіваецца на сваіх прыродных, а не на чужых нацыянальна-культурных традыцыях. Вось чаму падчас нацыянальна-вызваленчых паўстанняў 1830—1831 і 1863—1864 гг. беларусы ў большай ступені выступалі пад лозунгамі польскай, чым уласнай нацыянальнай, ідэі, імкнуліся адрадзіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г., хаця ў ёй беларуская дзяржава — Вялікае Княства Літоўскае — больш мела сімвалічную, чым рэальную палітычную незалежнасць. Пад уплывам дзяржаўнай палітыкі русіфікацыі адукаваныя і заможныя колы пачалі паступова адыходзіць ад польскіх і станавіцца носьбітамі рускіх культурна-моўных традыцый. На гэты небяспечны працэс нават як след не паўплывалі даследаванні навукоўцаў, якія ў сваіх працах пераканаўча даказалі самабытнасць, адметнасць беларускай культуры і мовы ад польскай, рускай і ўкраінскай. Глухімі да такіх даследаванняў засталіся рускія вялікадзяржаўнікі з ліку палітыкаў, інтэлігенцыі і праваслаўнага духавенства. Нікольк не пахіснулі іх погляды першыя арыгінальныя літаратурныя творы на беларускай мове. Дзевятнаццатае стагоддзе не дае аніводнага прыкладу ўліку беларускага інтарэсу ў дзяржаўнай нацыянальнай палітыцы царскай імперыі, хоць у шэрагу выпадкаў яна была даволі паблажлівай у дачыненні да некаторых нярускіх народаў.

Адстойваць беларусам сваю этнакультурную адметнасць вельмі часта і досыць сур'ёзна перашкаджалі ўласнай гадоўлі герастраты. Многім

нагнаў аскому сваімі сцвярджэннямі, што Беларусь — гэта рускія вобласці, ураджэнец Гарадзеншчыны, прафесар Пецярбургскай духоўнай акадэміі Міхаіл Каяловіч (1828—1891). Ён звяртаўся да беларусаў з заклікам актыўна пераймаць расійскую асвету і мову, ад чаго яны не зробяцца ворагамі сваёго народа. Царскаму ўраду, які і без таго ўсяляк падрываў пазіцыі нацыянальнага фактару ў нашым краі, гэты вучоны прапаноўваў распрацаваць і тут такія карэнныя рускія пачаткі, якія на векі вечныя злучылі б заходнюю (г. зн. Беларусь. — *Л. Л.*) і ўсходнюю Русь. Яго зусім не хвалявала, што ад такога злучэння нічога не захаваецца ад самабытнай культуры і мовы беларускага народа, што яны, будучы занесенымі ў бязмежны рускі акіян, бясследна растворацца ў ім, паклаўшы гэтым самым канец існаванню аднаго з суб'ектаў славянскай супольнасці.

Нягледзячы на працяглыя і ўпартыя старанні ўладаў заходняга і ўсходняга славянскіх народаў пазбавіць беларусаў свайго этнічнага «Я», зрабіць падобнымі да палякаў ці рускіх, усё ж у многіх разумных людзей, сапраўдных патрыётаў Бацькаўшчыны ніколі не было жадання стаць цацкай у руках прарабаў дзяржаўнай палітыкі асіміляцыі. Яны і іншых заклікалі шанаваць сваю адметнасць, не паддавацца этнічнай метамарфозе нават пры любых абяцанках штосьці выгоднае зрабіць для сацыяльнага становішча карэннага насельніцтва краю. Рашуча выступіла на пачатку 80-х гадоў за захаванне этнічнай самабытнасці гэтага славянскага народа беларуская рэвалюцыйна-народніцкая група ў Пецярбургу «Гоман», асноўнае ядро якой складалі студэнты універсітэта. У першым нумары аднайменнага з яе назваю часопіса (1884 г.) яго рэдакцыя даводзіла сваім чытачам наступнае: «З усіх народнасцяў, якія ўваходзяць у склад сучаснай Расіі, лёс беларусаў адметны тым, што на іх ужо з даўняе пары прывыклі глядзець, як на некаторы матэрыял для ўсемагчымых эксперыментаў, а не як на жывую народнасць, здольную самастойна распараджацца сабою. Зыходзячы з гэтага пункту гледжання, бліжэйшыя суседзі беларусаў, карыстаючыся правам моцнага, здзяйснялі над імі свае доследы і бесцырымонна накладвалі рукі на жывы арганізм беларускай народнасці, наперад вырашыўшы, што яна павінна маўкліва падпарадкавацца дужэйшым і асіміляваіда з імі, раствараючыся ў вялікарускім ці польскім моры. Палітыка гвалту тут працягвалася цэлыя стагоддзі, пачынаючы з уладарання Польшчы і канчаючы панаваннем маскоўскага абсалютызму, які не спыняецца ні перад якімі сродкамі, каб толькі прывесці ўсё да сістэмы «аднастайнасці»[12]. Усе надзеі, што беларусы некалі ўсё ж дадуць рашучы адпор любым спробам пераўтварыць іх у безаблічную этнічную масу, прыдатную толькі для колькаснага павелічэння рускага народа, рэдакцыя справядліва ўскладала на інтэлектуальныя сілы. Яна радавалася, што «Беларусь у асобе сваёй інтэлігенцыі пачынае патроху ўсведамляць свае адметныя рысы як вобласці, далёка не падобнай да іншых абласцей Расіі.

[12] Публицистика белорусских народников. Мн. 1983. С. 60, 61.

Будучы прасякнутай сучаснымі дэмакратычнымі ідэямі, інтэлігенцыя Беларусі пачынае ўсведамляць, што іх Радзіма толькі тады перастане быць яблыкам разладу і прынадным кавалкам для суседзяў, калі яна сама сваімі ўласнымі сіламі даб'ецца волі, сама ўладкуецца»[13].

Такое ўладкаванне стала задачай нумар адзін для ўтворанай у 1903 г. Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ). У прынятай у студзені 1906 г. у Мінску на другім з'ездзе БСГ праграме ўпершыню было сфармулявана патрабванне аб наданні Беларусі правоў аўтаноміі ў будучай Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспубліцы. На старонках перыядычнага выдання БСГ «Наша ніва» (першы нумар выйшаў 23 лістапада 1906 г.) не раз пісалася пра неабходнасць скасавання абмежавальных законаў датычна беларускага народа, гарантавання яму права навучаць сваіх дзяцей на іх роднай мове. Газета «Наша ніва» «стала галоўнай трыбунай, ідэолагам і арганізатарам беларускага нацыянальна-культурнага руху, усімі сваімі праявамі накіраванага супраць вялікадзяржаўнай палітыкі царызму, рэакцыйнай дзейнасці рускіх чарнасоценна-акцябрысцкіх і польскіх памешчыцка-клерыкальных партый і арганізацый, а таксама царквы і касцёла, якія імкнуліся асіміляваць беларускі народ, далучыўшы праваслаўную частку беларусаў да рускіх, а каталіцкую — да палякаў»[14]. Актыўных змагароў супроць гэтых адмоўных з'яў з кожным годам станавілася ўсё больш і больш. Ужо ніякія палітычныя сілы не маглі спыніць рух беларусаў за нацыянальнае адраджэнне, у якім адно з цэнтральных месцаў займалі пытанні мясцовай аўтаноміі. У асяроддзі ж найбольш прагрэсіўных удзельнікаў яго ўсё больш папулярнай станавілася ідэя поўнай дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. На сфармаванне такой ідэі станоўча паўплываў магутны рух народаў славянскай супольнасці за дасягненне ўласнай дзяржаўнасці. Але іншым разам у гэтым прагрэсіўным змаганні адсутнічала надзвычай патрэбнае ў такой няпростай сітуацыі разуменне славянамі адзін аднаго.

Шмат самых вострых супярэчнасцяў паміж славянскімі народамі Расіі выявіла Першая сусветная вайна. Адыход рускіх войскаў з этнічнай тэрыторыі Польшчы, многіх раёнаў Беларусі і Украіны спрыяў абуджэнню іх карэннага насельніцтва, і асабліва палякаў, да актыўнага нацыянальна-дзяржаўнага жыцця. Праўда, у некаторых выпадках у палякаў яно з актыўнага перарастала ў агрэсіўнае і ўяўляла сур'ёзную пагрозу для тэрытарыяльнай цэласнасці беларусаў. Усё гэта трэба было ўлічваць ім, будуючы свае ўзаемадачыненні з заходнім суседам.

Паступова пад уплывам нацыянальна-вызваленчых рухаў у Еўропе ідэя нацыянальнай дзяржаўнасці ў яе самых разнастайных формах пачала станавіцца ўсё больш папулярнай нават і сярод шараговых беларусаў.

Па-ранейшаму ўвага актывістаў і ідэолагаў адраджэнскага руху сканцэнтроўвалася пераважна на пытаннях культурна-моўнага развіцця.

---

[13] Там жа. С. 62.

[14] ЭГБ. Т. 1. Мн., 1993. С. 411.

Пэўныя пазітыўныя зрухі тут ужо выявіліся напярэдадні вайны з кайзераўскай Германіяй. Існавала пільная патрэба далей рухацца ў развязванні надзённых пытанняў нацыянальнага жыцця, у чым беларусы не мелі аніякай падтрымкі ні ад царскага рэжыму, ні ад Часовага ўраду Расіі. Прапаноўвалі не спяшацца, чакаць прыходу больш спрыяльных часоў для вырашэння палітычнай будучыні беларускага народа, пра што неўзабаве давялося загаварыць нават за этнічнымі межамі нашага краю, па-за самой Расіяй.

Не будзе перабольшаннем назваць вялікай славянскай трагедыяй, што з-за шавіністычнай нацыянальнай палітыкі дзяржаўных дзеячоў Расіі беларусы ў самыя адказныя моманты сваёй гісторыі вымушаны былі звяртацца па дапамогу не да яе тытульнага народа — рускіх, а да іншых, бо з імі, як гэта ні парадаксальна, удавалася лягчэй прыйсці да згоды. Непавага расійскіх уладаў да нацыянальных правоў беларусаў падштурхнула іх і да ўдзелу ў 1916 г. у Стакгольме ў канферэнцыі народаў Расіі. Місію паездкі ў гэты горад ад імя ўсёй Беларусі ўзяў на сябе створаны ў Вільні Беларускі Народны Камітэт (БНК). У яго палітычнай дэкларацыі ўсяму свету як гром сярод яснага неба прагучалі перад прысутнымі словы: «... беларускі народ жджэ вызваленьня з-пад расейскай няволі». А ці ж нельга было гэтае пытанне па-братэрску, па-славянску вырашыць самым паважаным і аўтарытэтным асобам гэтых двух блізкароднасных народаў!? Чаму адзін з іх павінен знаходзіцца на становішчы дзяржаўнага, а другі не мець аніякага права будаваць сваё жыццё паводле ўласных нацыянальна-культурных традыцый, навучаць у школах сваіх дзетак у матчынай мове, чуць роднае слова ў дзяржаўных установах, цэрквах і г. д.?

Як і трэба было чакаць, агрэсіўна настроеныя царскія ўлады не прыслухаліся да беларускага голаса на Стакгольмскай канферэнцыі народаў Расіі. Таму даводзілася чакаць новай нагоды, каб заявіць свету пра свой боль. Неўзабаве яна надарылася: у чэрвені 1916 г. у швейцарскім горадзе Лазане праходзіла III канферэнцыя народаў. І туды дапялі нашыя няўрымслівыя адраджэнцы. У сваім пісаным слязьмі ці крывёю «Мемарыяле прадстаўнікоў Беларусі на III канферэнцыі народаў» яны паведамілі народам свету наступнае: «Цяпер, дзякуючы III канферэнцыі народаў, мы маем магчымасьць першы раз за 120 гадоў заявіць цывілізаванаму сьвету аб поўнай нашай безпраўнасьці, ад якой мы пакутавалі ў Расійскай дзяржаве (падкрэслена мною. — *Л. Л.*). Мы просім у цывілізованых народаў спагады нам і падтрыманьня, каб прымусіць да пашаны нашых нацыянальных і культурных правоў. Мы можам урэшці спадзявацца, што які б ня быў канец вайны, народы Эўропы памогуць нам забяспечыць Беларусі ўсе палітычные і культурные правы, якія дадуць нашаму народу магчымасьць вольна разьвіваць свае інтэлектуальные, маральные і эканамічные сілы, і што гэтыя правы дадуць нам магчымасьць стацца гаспадарамі на нашай уласнай зямлі».

Якое гэта лагічнае, заканамернае жаданне для кожнага народа: «стацца гаспадарамі на... уласнай зямлі»? Колькі моцы патрачана лепшымі

сынамі і дочкамі беларускага народа дзеля пераўтварэння гэтага жадання ў рэальнасць?! Колькі людзей было бязлістасна пакарана толькі за тое, што яны хацелі стаць гаспадарамі ў сваім доме! У ім яшчэ і сёння не дужа ўтульна адчуваецца шчырым беларусам. У развязванні пытанняў палітычна-дзяржаўнага, культурна-моўнага жыцця яны на некалькі парадкаў саступаюць усім славянскім народам.

Многіх беларускіх палітыкаў і грамадскіх дзеячаў непакоіла, што іх справядлівыя дамаганні вырваць ад Часовага ўрада Расіі права на абласную аўтаномію не знаходзілі належнай падтрымкі ў палякаў, а не дык і проста ігнараваліся імі. А тлумачылася гэта тым, што за кошт беларускіх зямель яны не супраць былі пашырыць тэрытарыяльныя межы сваёй дзяржавы, як толькі ўдасца яе стварыць.

Такія дачыненні рускіх і польскіх братоў да беларусаў зусім не радавалі актыўнага дзеяча Беларускай сацыялістычнай грамады Ігната Дварчаніна. У вершы «Покліч», што быў напісаны ў першыя дні пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. (змешчаны ў газеце «Вольная Беларусь» ад 8 лістапада 1917 г.), ён так характарызуе вынікі знаходжання беларускай нацыі ў атачэнні славян:

«Але будучы ў уціску
У сваіх братоў родных,
Ты сваё ўсё забыла,
Стала наймітам у іх».

Хоць і занадта сцісла сказана, але вельмі трапна і праўдзіва. Затое не пашкадаваў слоў, каб даць грунтоўны аналіз дадзенаму фактару, другі наш слынны адраджэнец тае пары Язэп Лёсік: «...наліха нашая доля судзіла нам быць пад уладаю не саўсім чужых народаў, як, прымерам сказаць, балгарам і сербам пад Турэччынай, а чэхам пад Нямеччынай. Над намі панавалі славяне, нібыта браты нашыя велікарусы і палякі. Але гэтае «брацкае» панаванне было для нас яшчэ горшае за чужынскае, бо чужыя народы, як немцы і туркі, глядзелі на падуладныя ім славянскія народы як на чужых: іншая мова, іншая вера, звычаі — усё іншае. А на Беларусь і Польшча, і Масква глядзелі заўсёды як на свой уласны народ і ўсімі сіламі намагаліся давесці і ўпэўніць усіх людзей, што Беларусі няма, а ёсць толькі Польшча і Расія.

(...) многа ліха зазнала Беларусь не ад чужых, а ад сваіх братоўславян. За часоў польскага панавання ўсе беларускія шляхецкія станы перафарбаваліся на палякаў. Яны адцураліся ад Беларусі і, жывучы на беларускай зямлі, стараліся ганьбіць і бэсціць усё беларускае... Гэтаксама робяць цяпер нашыя паны і папы, чыноўнікі і настаўнікі, што па царскаму загаду, праз царскія школы парабіліся расійцамі. Яны не толькі адракліся ад усяго роднага беларускага, а яшчэ топчуць нагамі і плююць на тое, што іх дзяды і прадзеды, як святое, шанавалі»[15].

---

[15] Лёсік Язэп. Творы. Мн., 1994. С. 274, 275.

Адсутнасць ва ўрада тытульнага славянскага народа Расіі жадання лічыцца з нацыянальнымі інтарэсамі карэннага насельніцтва Беларусі штурхала яго грамадска-палітычных і культурных дзеячаў да аб'яднання сваіх намаганняў у барацьбе за вызваленне з-пад царскага прыгнёту з кім-небудзь з суседзяў, і, вядома ж, найперш з літоўцамі, з якімі ў сярэднявеччы мелі адну агульную дзяржаву — Вялікае Княства Літоўскае. Трэба аддаць належнае розуму літоўскіх палітыкаў і ідэолагаў. Як бы ні прасілі іх беларускія палітычныя і грамадскія дзеячы на працягу больш як дзесяці гадоў пасля рэвалюцыі 1905 г. пайсці на стварэнне сумеснай дзяржавы тыпу колішняга Вялікага Княства Літоўскага, увесь час даводзілася ім чуць у адказ: «Не!» Чаму? Літоўцы вельмі проста тлумачылі сваю нязгоду: у гэтай сумеснай дзяржаве будуць у меншасці, што тут «іх заліець беларуская большасць»[16]. Насуперак жаданням беларусаў па суседстве з імі ў пачатку 1917 г. пры падтрымцы нямецкіх інтэрвентаў узнікае ў якасці вярхоўнага органа ўлады Літвы Літоўская Дзяржаўная Рада (Тарыба). Літоўцы становяцца дзяржаўным народам. У адрозненне ад беларускіх палітычных дзеячаў іх літоўскія калегі не насіліся з думкай аб захаванні сваёй краіны ў якасці якой-небудзь абласной аўтаноміі ў складзе федэратыўнай Расійскай дэмакратычнай рэспублікі. Яны заўсёды аддавалі прыярытэт поўнаму, няўрэзанаму нацыянальнаму суверэнітэту, і, як паказаў час, не памыліліся ў гэтым, як не памыліліся і ўсе астатнія народы, што прытрымліваліся такой лініі ў пытаннях свайго нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання. І ўсё ж небеспаспяхова ажыццяўлялася яно і на Беларусі, хаця з пэўным спазненнем і не на такім высокім ўзроўні. Вінаватыя ж у гэтым не яе дзяржаўныя, грамадска-палітычныя і культурныя дзеячы, а ўрады суседніх славянскіх краін.

## 5. АДНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ: БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА, БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА

Кульмінацыйным пунктам у развіцці кожнага народа з'яўляецца стварэнне ўласнай суверэннай дзяржавы, бо толькі яна дае яму рэальную магчымасць для развязвання ўсіх эканамічных, палітычных і сацыяльна-культурных праблем. Без уласнай суверэннай дзяржавы ніводзін народ не мае аніякіх перспектыў на прыстойнае самабытнае існаванне. Рана ці позна ён становіцца прывабнай этнічнай стравай для апетытнага спажывання яе тытульнай нацыяй поліэтнічнай дзяржавы. Усё гэта не з'ўлялася сакрэтам для грамадска-палітычных і культурных дзеячаў славянскіх народаў, таму ўся іх гісторыя так багата запоўнена гераічнымі старонкамі самаахвярнай барацьбы за дзяржаўную незалежнасць.

---

[16] Турук Ф. Белорусское движение. М., 1921. С. 23.

Пісаць іх крывёю даводзілася і беларускаму народу. Шмат жыццяў запатрабавала ад яго абарона дзяржаўнага суверэнітэту Полацкага, Турава-Пінскага, Смаленскага і іншых княстваў. Мала спакойных гадоў было ў нашых прашчураў і тады, калі ім у другой палове XIII ст. удалося стварыць у цэнтры Еўропы адну з самых буйных дзяржаў — Вялікае Княства Літоўскае. З-за сталых інтрыг суседніх краін яго палітыкам, каб канчаткова не страціць сваёй незалежнасці, не трапіць пад уладу Расійскай дзяржавы, давялося пайсці ў 1569 г. на падпісанне Люблінскай уніі з Каронай Польскай і стварыць разам з ёю агульную федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую. Тут наш народ ужо не пачуваў сябе сапраўдным гаспадаром. «Залаты век» яго гісторыі на цэлыя стагоддзі кануў у Лету. Многія з беларусаў нават забыліся, што калісьці былі дзяржаўным народам, актыўна ўдзельнічалі ў палітычным, эканамічным і культурным супрацоўніцтве не толькі з суседнімі, але і аддаленымі краінамі.

На шчасце, гісторыя ніколі не спыняе свайго бегу наперад. Шмат новага прынесла яна з сабой у XX стагоддзі, прычым ужо ў першыя два дзесяцігоддзі. У гэтым новым было нямала і такога, чаго ніяк не назавеш прагрэсіўным. Але і яно ўзбагачала практыку ўзаемадачыненняў народаў.

Нарэшце ход падзей у Еўропе даў зразумець і беларусам, што іх самае надзейнае выратаванне ад этнічнага выраджэння заключаецца ў стварэнні ўласнай незалежнай дзяржавы. Дзень народзін Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) — 25 сакавіка 1918 г. На добры лад, яе ўзнікненню павінны былі б, акрамя беларусаў, шчыра радавацца яшчэ і рускія, і палякі. Як-ніяк, чарговы славянскі народ стаў дзяржаўным. Такой радасці ад іх беларусы не адчулі. Магчыма, яшчэ ніколі раней так складана не было беларусам знайсці паразуменне з братамі-славянамі рускага і польскага паходжання, як у час, калі ў выніку нацыянальна-вызваленчага руху нарэшце і наш народ стварыў сваю дзяржаву ў асобе Беларускай Народнай Рэспублікі. Па ўсіх прынцыпова важных пытаннях яе уладам было куды лягчэй дамовіцца з краінамі Прыбалтыкі, Фінляндыяй, Германіяй, Швейцарыяй..., чым з Расіяй ці Польшчай. БНР даводзілася звяртацца нават па дапамогу да Лігі Нацый, Савета паслоў, каб не дазволіць гэтым дзвюм суседнім славянскім дзяржавам здзейсніць анексію беларускіх земляў.

Працяглая і крайне небяспечная для лёсу беларускага народа палітыка паланізацыі і русіфікацыі справядліва рабіла ўрад БНР вельмі асцярожным, недаверлівым да сваіх славянскіх суседзяў, акрамя ўкраінцаў, якія таксама добра зведалі, што такое нацыянальны прыгнёт. «Нам трэба, — слушна пісалася ў газеце «Беларускі шлях» ад 11 мая 1918 г., — адважна выступаць у новым паходзе народаў, як нацыянальная адзінка, без якой бы сабе ні было апекі мацнейшага славянскага народу. Досіць мы ўжо перакананы ў тым, што злучанасьць з якім бы сабе ні было культурнейшым ад нас славянскім народам — шкадліва для нашага нацыянальнага адраджэння; бо кожны славянскі народ будзе лічыць за

абавязак шукаць сваёй нібыто ўласнасьці на Беларусі і паўтарыцца над намі старая гісторыя над «тутэйшымі людзьмі». Мы павінны ісьці сваёй уласнай дарогай, а калі можам сабе чакаць матэрыяльнай падмогі ў пачатковай нашай працы ад каго-нібудзь, дык толькі ад мацнейшага за нас ніславянскага народу. Тут ужо канкурэнцыі сваяцтва не будзе, як было да гэтуль ад палякоў і расійцаў — і мы пойдзем сваім шляхам, маючы на гэта багаты самабытны грунт».

На вялікі жаль, выбраць такі шлях не ўдавалася нашаму народу. На беларускі пірог не спыняліся квапіцца ні з усходу, ні з захаду. Здавалася, канца і краю не будзе тым выпрабаванням, якія выпалі на знясіленых няспынным нацыянальным уціскам людзей. Сыход нямецкіх інтэрвентаў ніколькі не аблегчыў іх становішча, бо з'явіліся новыя, якія і слухаць не хацелі аб магчымасці існавання нейкай там беларускай дзяржаўнасці.

Нічым іншым, як сорамам, ганьбай для славянскага братэрства, можна лічыць усё тое, што рабілі ў 1919—1920 гг. на Беларусі польскія інтэрвенты. Урад БНР, бачачы, што сваімі просьбамі да новых захопнікаў ніяк нельга спыніць іх здзекі і гвалты з беларускага народа, шле ў сакавіку 1920 г. пратэст-ноту на адрас удзельнікаў Парыжскай мірнай канферэнцыі (уручыў міністр замежных спраў БНР Яўген Ладноў). У першым пункце ноты выказваецца абурэнне, што польскім камісарам Усходніх зямель (Беларусі) забаронена дзейнасць Рады і Урада БНР. «Нямецкія ваенныя ўлады ў 1918 г. і то не пазвалялі сабе такім спосабам нарушаць міжнародныя правы і падвергаць гэтакаму гвалту прадстаўнікоў, выбраных народам беларускім. У час нямецкай акупацыі Рада Бел. Нар. Рэс. і Урад прадаўжалі істнаваць і функцыяніраваць легальна»[17]. У самы кароткі тэрмін польскія інтэрвенты ліквідавалі беларускую мясцовую адміністрацыю, нацыянальныя школы (не пашкадавалі і рускіх), рэдакцыі беларускіх газет і часопісаў, праваслаўныя цэрквы (некаторыя пераведзены ў каталіцкія). У створанай на месцах польскай адміністрацыі маглі працаваць толькі асобы, што валодалі польскай мовай. Але з гэтай несправядлівасці з боку заходняга славянскага народа беларусы зрабілі для сябе вельмі карысную выснову, «што толькі незалежнасьць можа адрадзіць беларускі народ, толькі праз незалежнасьць Беларусь можа ўцалець ад раздзелу і асыміляцыі з сваімі суседзямі»[18].

Такая бесчалавечная жорсткасць аднаго славянскага народа да другога не прынесла аніякай карысці і нашым заходнім суседзям, бо, як толькі пачалося пранікненне на тэрыторыю Беларусі Чырвонай арміі, тут жыхары многіх гарадоў і вёсак сталі актыўна дапамагаць ёй граміць ненавісных палякаў. Праўда, хапала і такіх, што ў палякаў бачылі меншае зло, чым ва ўсходніх славянах — рускіх. Настойліва заклікала ў той час бараніцца ад іх Беларуская вайсковая камісія (утворана 2 жніўня

[17] Турук Ф. Белорусское движение. С. 140.
[18] Беларусь. 1920. № 110.

1919 г. у Вільні). Бачачы, як імкліва рухаюцца на захад чырвонаармейскія часткі, яна гатовая была кінуць на барацьбу з імі ўсіх да аднаго беларусаў. Складаюцца рознага роду адозвы, якія расклейваюцца ў самых людных месцах населеных пунктаў. Адна з іх, што распаўсюджвалася ў Мінску, мела такі змест: «Дзікая маскоўска-бальшавіцкая орда ізноў ідзець на нас, каб зьнішчыць дабрабыт нашае роднае старонкі і завесьці ў нас чужацкі парадак. Ізноў у зьдзеку і паняверцы з боку маскоўцаў можам апынуцца мы». У гэтай сітуацыі, пісалася ў адозве, беларускі народ можа выстаяць толькі тады, калі супроць маскоўскіх бальшавікоў будзе выступаць разам з польскім войскам. Сёй-той і сапраўды падаўся ў яго з самымі добрымі намерамі абараніць свой край ад чужынцаў, забываючы, што такімі для яго з'яўляюцца і палякі. Людзей пужалі жорсткімі бальшавіцкімі акцыямі — а іх у паслярэвалюцыйнай Расіі было здзейснена нямала, — не жадаючы, аднак, сказаць, што не лепш паводзілі сябе на нашай зямлі і польскія легіянеры. Беларусаў умалялі: «Адгонім жа, браты, бальшавіцкіх разбойнікаў, не дапусьцім іх на нашую зямельку! Не патрэбна нам бальшавіцкая камунна, ні Брусілаўска-генеральская маскоўская ўлада. Станавіцеся ўсе на дапамогу войску...

Навала маскоўская блізка. Не дано панаваць на Беларусі Троцкаму і яго кампаніі.

Збірайцеся да беларускіх вайсковых часьцей і зараз-жа на фронт бараніць сваю зямельку, Родную Беларусь!»[19]

А калі больш глыбока, аб'ектыўна ўнікнуць у сутнасць тых падзей, самі беларусы не змаглі б абараніць сваю зямельку са зброяй у руках ні ад усходняга, ні ад заходняга славянскіх народаў, не прымкнуўшы да каго-небудзь аднаго з іх. Але ж не будзем забывацца, што такое далучэнне таксама ёсць заўсёды рэальная пагроза страты дзяржаўнага суверэнітэту.

Учыненая славянамі крывавая бойка на беларускай зямлі мела для яе вельмі трагічныя вынікі, прыпыніла прагрэсіўны працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Насельніцтва значнай часткі тэрыторыі Беларусі, што паводле заключанай у сакавіку 1921 г. у Рызе дамовы адышла да Польшчы, не мела нават самых мізэрных правоў не толькі абласной, але і нацыянальна-культурнай аўтаноміі. Тут праводзілася жорсткая палітыка культурна-моўнай асіміляцыі дзяржаўным народам недзяржаўнага. Агіднасць такой палітыкі невымерна ўзрастае ў вачах цывілізаванага свету ад таго, што тут ахвярай аднаго славянскага народа стаў другі, з якім доўгі час даводзілася жыць у адной сумеснай дзяржаве — Рэчы Паспалітай, ратавацца ад смяротных паследкаў русіфікацыі. Несусветны парадокс, дый годзе!

Падпалым пад уладу Польшчы беларусам робіць вялікі гонар, што, нягледзячы на жорсткі нацыянальны ўціск, яны на працягу ўсяго міжваеннага часу не спынялі сваёй барацьбы за правы быць гаспадарамі на

---

[19] Турук Ф. Белорусское движение. С. 143, 144.

уласнай зямлі. Па многіх пазіцыях сучасныя адраджэнцы і дзесятай долі не робяць з таго, што ўдавалася праводзіць у жыццё грамадска-палітычным і культурным дзеячам тагачаснай Заходняй Беларусі. Асабліва шмат чаго ў іх пажадана было б запазычыць з практыкі арганізацыі руху шырокіх народных мас за стварэнне нацыянальных школ.

Рознага роду забароны аказаліся не ў стане паралізаваць беларускі перыядычны друк. Прагрэсіўнай арыентацыі газеты і часопісы дапамагалі чытачам не толькі лепш усвядоміць сваю ролю ў адстойванні нацыянальных правоў, але і садзейнічалі бытаванню роднага слова ў асяроддзі яго прыродных носьбітаў, якое ўсяляк імкнуліся абмежаваць у грамадскім выкарыстанні польскія шавіністычныя ўлады.

Актыўна і смела змагалася за захаванне самабытнасці беларусаў Польшчы рэдакцыя беларускага праваслаўнага часопіса «Царква і народ» (выходзіў у Вільні; рэдактар І. Палтарчук).

Мала каго з беларусаў не маглі не закрануць наступныя радкі з лютаўскага нумара часопіса за 1933 г.: «Перадусім трэба раз назаўсёды зразумець тое, што беларусы гэта ані неразлучная частка народу расейскага, ані польскага... Беларусы гэта самабытная этнічная адзінка, акрэсленага, асобнага характару індывідыум, маючы гэтаму характару адпаведна ўласцівую культуру духоўную і матэрыяльную, мову і структуру псіхікі. Затым трэба зразумець тое, што паняволенне народу і стрымоўванне яго эвалюцыйных праяваў разрастаючага жыцця духоўнага з'яўляюцца ганьбаю не для народу паняволенага, а для паняволюючага»[20].

Адсутнасць у карэннага насельніцтва Заходняй Беларусі правоў на палітычную нацыянальна-культурную аўтаномію, рашучы курс уладаў другой Рэчы Паспалітай на яго паланізацыю не маглі не выклікаць цяжкіх наступстваў для гэтай часткі беларусаў. Мала паклапаціўся пра набыццё беларусамі статусу сапраўднай дзяржаўнасці іх усходні славянскі сусед з Расійскай Федэрацыі. Больш як Мінскай губерні ён не адважыўся даць дзеля гэтай мэты. Створаную тут дзяржаву ніяк нельга было называць Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай, бо яна ахоплівала зусім нязначную частку этнічнай тэрыторыі нашага народа. Гэтая дзяржава павінна была б мець найменне накшталт Мінская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (МССР).

Дзяржаўнасць БССР насіла чыста сімвалічны характар, бо на яе тэрыторыі дзейнічалі многія заканадаўчыя акты Расійскай Федэрацыі. Толькі яе партыйнаму цэнтру было дадзена права вырашаць, хто ў нас павінен займаць самую высокую партыйную пасаду першага сакратара ЦК КП(б)Б. І за ўвесь час (аж да ліпеня 1956 г.) яе толькі адзін раз — і то на нейкія паўгады — займаў беларус, а ўсе астатнія былі прадстаўнікамі самых розных нацыянальнасцяў, належалі да катэгорыі адкамандзіраваных, рэкамендаваных Масквой. Несумненна, па яе волі і ўказанні восьмая канферэнцыя КП(б)Б у сваіх тэзісах па арганізацыйным

[20] Цытавана па часопісе «Лаза». 1998. № 1. С. 30.

пытанні запісала: «КП(б)Б ёсць абласная арганізацыя РКП, якая праводзіць у жыццё прынцыпы і тактыку РКП, дастасоўваючы яе да мясцовых умоваў, і ў агульным і цэлым падпарадкоўваецца дырэктывам ЦК РКП (бальшавікоў)»[21]. Таму аніяк не даводзіцца гаварыць пра якуюсьці самастойнасць вышэйшага партыйнага органа Беларусі.

Такое ж можна прачытаць у тэзісах згаданай партканферэнцыі бальшавікоў Беларусі і па пытанні арганізацыі на яе тэрыторыі савецкай улады: «Беларусь, з'яўляючыся Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікай, адначасова з'яўляецца складовай часткай РСФСР, і ўсе органы ў галіне агульных мерапрыемстваў павінны быць падпарадкаваны адпаведным камісарыятам РСФСР, але мець пэўную волю ў галіне вырашэння пытанняў мясцовага жыцця, у якіх яны павінны кіравацца ЦВК і Саўнаркамам Беларусі»[22]. Як бачым, БССР не «цягнула» нават на нейкае там сур'ёзнае абласное аўтаномнае дзяржаўнае фармаванне ў межах Расійскай Федэрацыі, бо цалкам залежала ад яе органаў улады і кіравання.

Партыйным і савецкім органам БССР давялося прыкласці шмат намаганняў, каб дабіцца ад СССР згоды на вяртанне ёй беларускіх этнічных тэрыторый — Віцебшчыны, Магілёўшчыны і Гомельшчыны. А вяртаць іх трэба было не толькі з пункту гледжання эканамічнай мэтазгоднасці для БССР, але і ў інтарэсах нацыянальна-культурнага развіцця карэннага насельніцтва гэтых зямель. Хаця паводле сваёй нацыянальнай прыналежнасці яно адносілася да беларусаў, практычна ўсё жыццё іх у складзе РСФСР будавалася паводле рускіх культурна-моўных стандартаў, г. зн. асімілёўвалася.

І ўсё ж якім бы празрыстым ні быў дзяржаўны суверэнітэт БССР, яна шмат што выйграла ад таго, што на працягу ўсяго часу існавання СССР уваходзіла ў яго склад у статусе саюзнай, а не аўтаномнай рэспублікі, не была Паўночна-Заходнім краем, Зяходняй вобласцю, Заходняй камунай ці яшчэ якім-небудзь нацыянальна-дзяржаўным утварэннем РСФСР. У такім становішчы беларускі народ панёс бы яшчэ большыя страты ў нацыянальнай культуры і мове, зведаў бы куды большую ступень русіфікацыі, меў бы нулявы ўзровень нацыянальна-дзяржаўнай свядомасці і, напэўна ж, у штыкі сустрэў бы факт абвяшчэння ў ліпені 1990 г. Беларусі незалежнай суверэннай дзяржавай, і сёння з усіх славянскіх народаў толькі адны беларусы адносіліся б да вартых жалю недзяржаўных народаў. Таму трэба быць больш спагадлівымі да дзяржавы БССР. Яе партыйныя і савецкія органы, несумненна, праводзілі, асабліва ў 40-я — першай палове 80-х гадоў XX ст., крайне шкодную палітыку ў галіне беларускай нацыянальнай культуры і мовы,

[21] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов. 1918—1927. Т. 1. Мн., 1973. С. 53.

[22] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов. 1918—1927. Т. 1. С. 55.

але, зразумеўшы на рубяжы 80-х — 90-х гадоў, куды прывялі народ, пачалі ўсё ж трохі падразаць крылы русіфікацыі. Яны на больш-менш належным узроўні ўтрымлівалі пазіцыі беларускай мовы ў выдавецкай справе, сродках масавай інфармацыі, асабліва ў выпуску абласных, раённых (гарадскіх) газет. Беларуская мова хоць зрэдку, але ўсё ж гучала ў час правядзення сесій Вярхоўнага Савета БССР. Сёння ў пералічаных сферах яна і дзесяці працэнтаў не выконвае ад таго, што ёй дазвалялася раней. Асабліва шчыльна зачынілі перад беларускай мовай дзверы ў залы пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Тут наша мова вельмі мала адпавядае статусу дзяржаўнай. Феномен у свеце сучаснага славянства!

Адсюль, відаць, нежаданне нашага чыноўніцкага апарату стварыць сапраўдную нацыянальную сістэму адукацыі, паставіць дзейнасць дзяржаўных устаноў культуры на беларускі прыродны грунт, бясконцыя заявы аб неабходнасці забеспячэння прыярытэтаў агульным інтарэсам Беларусі і Расіі над нацыянальна-беларускімі, падпарадкавання апошніх агульнаславянскай ідэі. Не сумняваюся, што такога самаахвяравання ад беларусаў не жадае прагрэсіўная, перадавая частка ні рускага, ні якога-небудзь іншага народа славянскай этнічнай супольнасці. Сапраўдны росквіт прыйдзе да яе толькі тады, калі кожны славянскі народ будзе мець сваю ўласную суверэнную дзяржаву, якая побач з выкананнем усіх астатніх функцый па-гаспадарску будзе дбаць пра развіццё культуры і мовы сваёй тытульнай нацыі.

## 6. У РОЛІ АСІМІЛЯТАРА ВЫСТУПАЕ ЎЛАСНЫ ЧЫНОЎНІЦКІ АПАРАТ

Кожным славянскім народам уласна сваё, адметнае павінна ў дзесяткі разоў вышэй цаніцца ў параўнанні з тым, што належыць якому-небудзь іншаму члену гэтай этнічнай супольнасці, бо, калі не прытрымлівацца такога разумнага правіла, апошняя стане дамавінай сваіх жа народаў, напачатку ў жывых пакіне двух-трох найбольш шматлікіх з іх, а пад рэшт — усяго толькі аднаго. Нават чалавеку з пачатковай адукацыяй зразумела, што такім адметным для кожнага славянскага, як і іншых народаў, найперш з'яўляецца яго нацыянальная культура і мова. Для нас, беларусаў, гэта значыць беларуская нацыянальная культура і беларуская мова. Што сёння яны не з'яўляюцца пануючымі на сваёй гістарычнай тэрыторыі, і што наша дзяржава стварыла і працягвае ствараць на ёй найбольш спрыяльныя ўмовы для развіцця рускай нацыянальнай культуры і мовы, думаю, таксама добра вядома нават кожнаму чалавеку з пачатковай адукацыяй, не кажучы ўжо пра эрудыраваных людзей. Пры такой заганнай палітыцы нам не выратаваць беларускі народ ад рускай культурна-моўнай асіміляцыі, якая ні ў якім выпадку не можа разглядацца як фактар росквіту, умацавання пазіцый славянскай супольнасці ў цывілізаваным свеце. На ўсе сто працэнтаў упэўнены,

што страта апошняю беларускага народа ў выніку супярэчнай яго карэнным інтарэсам культурна-моўнай палітыкі, не ўзбагаціць, а збядніць гэтую супольнасць, не скансалідуе, а, наадварот, пасее недавер паміж яе народамі. Нашым цяперашнім палітыкам не шкодзіла б паглыбіцца ў гісторыю, паглядзець, як да гэтых пытанняў ставіліся іх папярэднікі, шчырыя змагары за беларускае нацыянальна-культурнае Адраджэнне. А ў іх і сапраўды ёсць чаму павучыцца. Спашлюся на прыняты імі ўлетку 1917 г. Статут Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый. У яго другім пункце прама заяўлялася, што яе дэпутатамі могуць быць толькі асобы, якія «прызнаюць патрэбу... роднай мовы і развіцця беларускай нацыянальнай культуры» (падкрэслена мною. — *Л. Л.*).

А вось сёння такога роду выказванняў ніколі не пачуеш з вуснаў нашых высокіх палітыкаў, як і не заўважыш, каб імі штосьці пазітыўнае рабілася ў гэтым напрамку. Назіраючы за дзейнасцю нашых органаў улады, выносіш непрыемнае ўражанне, што ў іх няма іншага клопату, як толькі палітычнае і эканамічнае зліццё Беларусі з Расіяй. А Беларусь жа мае дастатковую колькасць насельніцтва і ладную тэрыторыю, спрыяльнае геапалітычнае становішча, каб даволі хутка стаць па-сапраўднаму суверэннай і цывілізаванай краінай. Паколькі любая форма нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання поліэтнічнай краіны непазбежна вядзе да асіміляцыі яе народаў, нам не варта гэтак неабдумана рвацца да палітычнай інтэграцыі. Нельга ў імя нават самай прывабнай ідэі, якой для многіх — пад уплывам ідэалагічнай апрацоўкі — уяўляецца ўсходнеславянская федэрацыя (канфедэрацыя) дзяржаў, прыносіць у зусім рэальную ахвяру беларускі народ з яго крайне дэфармаванай нацыянальнай самасвядомасцю, а таму і такому няўстойліваму перад любой формай асіміляцыі. Нашым дзяржаўным дзеячам не варта прыпадабняцца да вядомага ў свеце рэвалюцыянера, тэарэтыка марксізму Фрыдрыха Энгельса, які ў імя перамогі над капіталізмам гатовы быў ісці на любыя этнічныя ахвяры. Ім выказана такая думка: «У бліжэйшай сусветнай вайне (мелася на ўвазе барацьба пралетарыяту з буржуазіяй. — *Л. Л.*) з аблічча зямлі знікнуць не толькі рэакцыйныя класы і дынастыі, але і цэлыя народы. І гэта таксама будзе прагрэсам»[23] . Не ведаю, як хто, а я ніколі не пагадзіўся б цаною этнічнай смерці дасягнуць чагосьці карыснага для Расіі ці славянскай супольнасці дзяржаў.

Ніколькі не баюся памыліцца ў сваім сцвярджэнні, што сёння аніводная з славянскіх нацый не мае такое велізарнай патрэбы ў па-сапраўднаму суверэннай дзяржаве, як беларуская, бо ў аніводнай з іх не набралася такая процьма нявырашаных лёсавызначальных задач, як у апошняй. І гэтыя задачы ляжаць не так у эканамічнай, палітычнай і сацыяльнай плоскасцях, як у адукацыйнай, культурна-моўнай. Вырашыць іх не ў стане ні федэратыўная, ні канфедэратыўная дзяржава. У свой час гэтым у Еўропе займалася «дзяржава-нацыя», прычым досыць пас-

---

[23] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2-е изд. Т. 6, С. 186.

пяхова, з чым ніяк нельга не лічыцца і беларусам. Калі ж нам давялося б палітычна аб'яднацца з якой-небудзь адной з такіх блізкароднасных славянскіх краін, як Расія, Украіна і Польшча, нікога б з іх не хвалявала, што ў небаракаў-беларусаў адсутнічае нацыянальная адукацыя, дэфармаваны нацыянальны патэнцыял элітарных пластоў роднай культуры, на сконе матчына мова. Увесь клопат нацыі, з якой беларуская ўзяла б шлюб, заключаўся б толькі ў тым, як можна хутчэй колькасна вырасці за кошт гэтай ужо так збяднелай беларускай беззэтнічнай біямасы.

Сёння як ніколі раней вельмі актуальнымі падаюцца словы афіцыйнага прадстаўніка чэхаў у дарэвалюцыйнай Расіі прафесара Томаша Масарыка (1850—1937), прамоўленыя ў 1916 г. у Маскве на сустрэчы з сябрамі польскага таварыства гэтага горада «Лютня»: «Хаўруснікі (у дадзеным выпадку чэхі і палякі. — *Л. Л.*) адкідаюць... ідэю панаваньня аднаго народу ... над іншымі, а прызнаюць вольнасьць малых народаў. Кожны народ, усьвядамляючы і развіваючы сваю культуру (шкада, што пра сучасны беларускі народ ужо нельга гэтага сказаць з поўнай катэгарычнасцю. — *Л. Л.*), ёсьць раўнапраўнай едзініцай і часьцяй чэлага арганізму чалавецтва...»[24]

Чэхам па-сапраўднаму пашанцавала, што такіх прагрэсіўных поглядаў навуковец стане буйным палітычным і дзяржаўным дзеячам, шмат гадоў будзе знаходзіцца на пасадзе прэзідэнта Чэхаславацкай Рэспублікі (выбіраўся ў 1918, 1920, 1927 і 1934 гг.). Менавіта пры ім этнонім «чэх» набыў невядомую да гэтага прэстыжнасць. Кожны паасобку і ўсе разам ганарыліся прыналежнасцю да чэшскай нацыі, любілі, шанавалі яе родную культуру і мову.

Як усяго гэтага не хапала і не хапае нам, беларусам. І ад высокіх дзяржаўных дзеячаў, і ад вучоных, і ад служыцеляў рэлігійнага культу даводзілася чуць, што беларускай мове непадуладныя многія складаныя сацыяльныя функцыі. Апошнім часам стала вельмі модным з боку многіх палітыкаў і афіцыйных ідэолагаў не заўважаць аніякай розніцы паміж беларусамі і рускімі, таму, маўляў, зусім нелагічна, што яны жывуць у дзвюх самастойных, паасобных дзяржавах. Недаравальна, што такія ці блізкія да іх думкі выказваюць вядомыя сучасныя вучоныя, у ліку якіх і правадзейны член Акадэміі медыцынскіх навук Расійскай Федэрацыі, лаўрэат Ленінскай прэміі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Фёдар Углоў. У мінскую газету «Славянский набат» ён прыслаў матэрыял «Когда отечество в опасности…» (надрукаваны 12—18 сакавіка 1998 г.). У звароце да галоўнага рэдактара газеты Уладзіміра Антонава ён піша: «С большим интересом читаю вашу газету и радуюсь за Беларусь и славянский народ, что не перевелись богатыри на земле русской (имею в виду и Беларусь)». Адразу па памяці пачаў перабіраць імёны сваіх вучоных-калег і шукаць сярод іх такога, хто, прыгадаўшы тую ці іншую спрадвечна рускую тэрыторыю, атаясамлі-

---

[24] Вольная Беларусь. 1917. 29 верасня.

ваў бы яе з Беларуссю. Не знайшоў такой асобы, бо ўсё-такі нягожа людзям высокага інтэлекту, выхаваным у вялікай павазе да іншых народаў, чужое называць сваім.

Аднак далёка не ўсе прытрымліваюцца такога разумнага правіла. Многія палітыкі і паслухмяная ім частка інтэлігенцыі, належачы да тытульнай нацыі краіны, дазваляюць сабе публічна называць чужую для беларускага народа рускую мову сваёй мовай. Такая недарэчнасць робіцца з мэтай апраўдання палітыкі русіфікацыі, якая набыла асабліва шырокія маштабы пасля правядзення ў маі 1995 г. усенароднага рэферэндуму. Да яго ў адпаведнасці з прынятым 26 студзеня 1990 г. законам «Аб мовах у Беларускай ССР» статусам адзінай дзяржаўнай мовы карысталася толькі беларуская, г. зн. мова тытульнай нацыі краіны. Такім справядлівым дэмакратычным вырашэннем моўнага пытання Беларусь паўтарыла даўно ўсталяваную ў цывілізаваным свеце практыку. Аднак з гэтым не пажадалі лічыцца зрусіфікаваныя дзяржаўныя дзеячы і іх памагатыя з боку інтэлігенцыі, для якіх палітычнае аб'яднанне з Расіяй было ў дзесяткі разоў вышэй за нацыянальныя інтарэсы беларускага народа. Сваю адданасць усходняй суседцы і было вырашана даказаць наданнем яе мове на тэрыторыі Беларусі статусу дзяржаўнай, што і ўдалося правесці ў маі 1995 г. праз тонка задуманы рэферэндум. Вопытныя палітыкі супольна з ідэолагамі-аднадумцамі змаглі пераканаць народ, што нібыта паралельнае суіснаванне ў межах краіны дзвюх дзяржаўных моваў цалкам адпавядае нацыянальнаму інтарэсу беларускага народа, не ўяўляе аніякай пагрозы для яго роднага слова. На практыцы ж адбывалася ўсё наадварот. Юрыдычна надаўшы рускай мове статус дзяржаўнай, яе адразу ж пачалі шырока выкарыстоўваць ва ўсіх сферах грамадскай дзейнасці, прычым выключна за кошт абмежавання сацыяльных функцый беларускай мовы. Не больш як праз пяць гадоў пасля рэферэндуму яна апынулася нават у горшым, чым за савецкімі часамі, стане. Архітэктараў жа рэферэндуму гэта зусім не палохае, хаця культурна-моўная асіміляцыя ў форме русіфікацыі яшчэ ніколі не мела такога небяспечнага характару, як у нашыя дні, што ставіць пад вялікае сумненне рэальнасць нацыянальна-дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Нечуваная паводле свайго размаху сучасная русіфікацыя ў аднолькавай ступені ставіць пад сумненне і рэальнасць далейшага захавання беларускага народа як самабытнага этнасу. І ў дадзеным выпадку беларускіх палітыкаў, асабліва негуманітарнай адукацыі, такое становішча зусім не турбуе, паколькі яны маюць вельмі слабое ўяўленне пра ролю мовы ў этнаўтваральных працэсах. Заслуга ў гэтым нацыянальнай палітыкі камуністычнай партыі СССР. У многім тут можна вінаваціць савецкую сістэму адукацыі. На справе ж мова была і застаецца галоўным чыннікам адрознення, адметнасці аднаго народа ад другога. Гэта выдатны разумелі нават палітыкі і навукоўцы афіцыйнага толку Рэчы Паспалітай, тым больш Расійскай імперыі. Таму яны так актыўна займаліся вынішчэннем роднага слова беларуса ў зусім беспамылко-

вай надзеі зліць іх адпаведна з палякамі і рускімі. На здзіў усяму цывілізаванаму свету такую палітыку ў дачыненні да гэтага слова праводзяць у суверэннай Рэспубліцы Беларусь. Захаваць у такіх варунках этнакультурную адметнасць беларусаў, а разам з гэтым і іх як самабытную супольнасць людзей не існуе аніякай рэальнай магчымасці. Было б вялікай і недаравальнай памылкай спадзявацца, што выратаванне беларускага народа можа адбыцца само сабой, без рашучых і смелых практычных дзеянняў самой дзяржавы. Моцна адарваная ад спрадвечных духоўных традыцый вёска ўжо не ў стане рабіць бесперапынныя ін'екцыі здаровым беларускамоўным людскім патэнцыялам у страшэнна здэнацыяналізаванае карэннае насельніцтва краіны. Найважнейшымі сродкамі папаўнення яго такім поўнавартасным матэрыялам маглі б быць арганізацыя беларускамоўнага навучання ва ўсіх звёнах адукацыі, наданне прыярытэту нацыянальнаму фактару ва ўсіх сферах дзейнасці чалавека. Зрабіць гэта можа і павінна толькі дзяржава, зразумела, пры самай моцнай падтрымцы здаровых, нацыянальна-свядомых беларускамоўных колаў грамадства. Дзякаваць Богу, яны яшчэ не перавяліся, хаця дзейнасць практычна ўсіх палітычных рэжымаў была скіравана на адхіленне такіх колаў ад актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці.

Наша дзяржава, абапіраючыся найперш за ўсё на сваю адукацыю, ужо, па сутнасці, выканала запавет рускага дарэвалюцыйнага прафесара вялікадзяржаўных поглядаў П. Кавалеўскага: «Мы павінны абавязкова і няўхільна абучаць іншародцаў рускай мове, каб у кожным пакаленні гэтая мова станавілася роднай, і наша руская культура стала іх культурай»[25] . Ужо не першы год маштабы распаўсюджання і ўздзеяння рускай культуры і мовы на наш народ у дзесяткі разоў перасягаюць уплыў на яго адпаведных беларускіх чыннікаў. Далейшае знаходжанне велізарнай масы карэннага насельніцтва краіны па-за кантэкстам беларускай нацыянальнай культуры немінуча прывядзе да глабальнай катастрофы, канчатковай страты далёка не апошняга па сваёй ролі ў славянскай супольнасці этнасу. Гэта трэба даводзіць дзяржаўнаму чыноўніцкаму апарату адкрытым тэкстам, а не толькі асцярожнымі намёкамі, завуаляванымі фразамі, каб палітыкі, як праб'е час, не апраўдваліся, што, маўляў, нацыянальная эліта як след не растлумачыла ім усю сур'ёзнасць і складанасць этнакультурнага становішча ў краіне. Калі ж усё пакінуць без змяненняў, дык толькі цуд не дазволіць калісьці самабытнаму, з арыгінальнай, багатай культурай славянскаму беларускаму народу стаць рэліктавым этнасам.

Усім нацыянальнай арыентацыі колам грамадства, асабліва палітыкам і інтэлігенцыі, трэба, не марудзячы, карэнным чынам перагледзець сваё стаўленне да дзяржаўнага двухмоўя. Да якіх яно трагічных наступстваў вяло і вядзе, гісторыі вядома, у т. л. і на горкім вопыце еўрапейскіх народаў. Аўтар шэрагу буйных навуковых прац па нацыяналь-

---

[25] Просвещение национальностей. 1931. № 4—5. С. 46, 47.

най праблематыцы Карл Каўцкі (1854—1938) разглядаў двухмоўе не больш як толькі «пераходную стадыю» да аднамоўя. «Там, — пісаў ён, — дзе кожны валодае дзвюма мовамі, заўжды ўрэшце агульная перавага па тых ці іншых прычынах будзе аддадзена адной з іх»[26]. У час, як пісаў гэтыя словы К. Каўцкі, такіх прыкладаў у Еўропе мелася нямала, асабліва ў Аўстра-Венгерскай і Прускай імперыях. На гэта звярталі ўвагу і іншыя яго сучаснікі з ліку навукоўцаў.

Пазней набыты ў свеце вопыт моўнага развіцця народаў істотна паспрыяў колькаснаму росту аднамоўцаў К. Каўцкага па дадзеным пытанні. Сёння вельмі многімі спецыялістамі прызнаецца — і зусім лагічна, — што двухмоўе — крайне няўстойлівая з'ява, бо рана ці позна абавязкова прывядзе да паглынання адной мовы другой. Працэс гэты вельмі хутка адбываецца пры адсутнасці моўнага рэгулявання з боку дзяржавы. Такое асабліва добра назіралася і назіраецца на Беларусі.

Зыходзячы з таго, што двухмоўе непазбежна прычыніцца да знікнення адной з моваў, кожнай дзяржаве абавязкова даводзіцца вырашаць пытанне: якую з іх трэба выратоўваць? У адпаведнасці з законам справядлівасці абараняць неабходна мову тытульнай нацыі сваёй краіны, асабліва калі такая мова больш нідзе не існуе ў свеце. Наша ж дзяржава робіць усё наадварот: стварыла самыя спрыяльныя варункі для ўжывання рускай мовы ва ўсіх сферах грамадскай дзейнасці, у т. л. і ў арганізацыі педагагічнага працэсу ўсіх тыпаў навучальных устаноў, што садзейнічае яе пранікненню і ў асабістае жыццё беларускага народа. Захаваць у такіх умовах яго роднае слова практычна немагчыма. Яго трэба ўсяляк ратаваць за кошт планамернага абмежавання сацыяльных функцый рускай мовы ў нашым краі, не баючыся нават знікнення, адмірання яе тут (у што цяжка паверыць!), бо ў апошняй ёсць велізарная этнічная прастора ў Расіі са стопяцідзесяцімільённай колькасцю носьбітаў гэтай мовы. Калі ж беларускія палітыкі нязгодныя з такім курсам дзяржаўнага рэгулявання моўных працэсаў і насуперак сусветнай практыцы лічаць сябе здольнымі кіраваць вытворчасцю, грамадска-палітычнымі і культурнымі працэсамі на прынцыпах двухмоўя, трэба неадкладна выступіць перад грамадствам з адпаведнай моўнай праграмай і пераканаўча абгрунтаваць яе жыццёвасць. Усялякае прамаруджванне з яе распрацоўкай рэальна пагражае не рускай мове, а беларускай, г. зн. той мове, якой сама гісторыя прадвызначыла быць тут поўнапраўнай гаспадыняй.

Было б вялікай памылкай усе негатыўныя з'явы са станам этнакультурнага жыцця беларускага народа тлумачыць толькі адпаведнай палітыкай дзяржаўных органаў, адсутнасцю ў яго неабходнай рашучасці пастаяць за свае нацыянальныя правы. Пагібельную ролю тут адыграла і адыгрывае выкліканая галоўным чынам працяглай палітыкай русіфікацыі блізкасць беларускай і рускай культур і моваў, якая асабліва рэльефна стала вызначацца з другой паловы XX стагоддзя. Сусветны

[26] Каутский Карл. Национальные проблемы. Пг., 1918. С. 39.

вопыт шматкроць пацвердзіў, што асіміляцыя хутчэй адбываецца акурат у асяроддзі тых народаў, якія маюць шмат чаго агульнага і блізкага ў сваёй культуры, побыце і мове. Тут у беларусаў, а таксама ва ўкраінцаў, куды больш агульнага і блізкага з рускімі, чым у якіх-небудзь іншых народаў па постсавецкай прасторы. Адсюль вынікае, як важна і цалкам гістарычна апраўдана мець кожнаму блізкароднаснаму славянскаму народу ўласную дзяржаву, але толькі такую, якая можа пастаяць за яго нацыянальныя інтарэсы, забяспечыць яго культурна-моўнае развіццё на сваім карнявішчы. Тады нішто не будзе пагражаць збядненнем, размываннем этнакультурнай разнастайнасці славянскай супольнасці. Сёння такая пагроза рэальна існуе з прычыны моцнай эрозіі прыроднага духоўнага патэнцыялу беларускага народа. Славянскае грамадства не павінна пакінуць яго сам-насам са сваёй бядой.

Славянскімі народамі назапашаны найбагацейшы вопыт самаахвярнага змагання за нацыянальную, дзяржаўную назалежнасць, за захаванне сваёй этнакультурнай адметнасці ў самых неспрыяльных умовах. Гэты вопыт павінен стаць настольнай кнігай для тых беларускіх палітыкаў, грамадска-культурных дзеячоў, якія не жадаюць, каб іх народ з прычыны стратнай нацыянальнай палітыкі стаў безабароннай ахвярай нацыянальна-моўнай асіміляцыі і бясследна растварыўся ў славянскай этнічнай супольнасці. Беларусы заўжды ганарыліся і ганарацца прыналежнасцю да яе. З гістарычнай жа практыкі вядома, што здаралася і такое, калі некаторыя славянскія народы па злой волі ўласных палітыкаў ішлі ўразрэз з інтарэсамі сваёй агульнай этнічнай супольнасці, як след не ганарыліся прыналежнасцю да яе. Быў час, што асаблівай цягай да апошняй не вызначаліся і пэўныя колы нашых заходніх суседзяў палякаў. Папулярны ў Польшчы ў міжваенныя гады генерал Люцыян Жалігоўскі ў адной з сваіх публікацый 1939 г. на славянскую тэму пісаў, што польская інтэлігенцыя часта нават саромеецца прызнацца ў сваёй славянскасці, што ў гэтай краіне вельмі мала ведаюць пра самую славянскую ідэю. Беларусы ж заўжды даражылі і будуць даражыць гэтай святой ідэяй. Дзеля прынясення ёй як мага больш карысці ад іх запатрабуецца шмат намаганняў па пераадоленні цяжкіх наступстваў культурна-моўнай асіміляцыі, пераводзе духоўнага жыцця на ўласныя прыродныя асновы, бо толькі такім шляхам можна ўносіць уклад у забеспячэнне разнастайнасці, узбагачэнне культурнага патэнцыялу славянскага свету. Стварэннем рускамоўных каштоўнасцяў, што апошнімі гадамі такім модным стала для пераважнай большыні творчай інтэлігенцыі Беларусі з-за невалодання родным словам карэнных жыхароў, яна ніколі не выканае гэтай высокароднай місіі і будзе толькі плесціся ў фарватары рускай культуры, напоўніцу зведае ўвесь «смак» русіфікацыі.

## 7. ІСЦІ НА ВЫВУЧКУ ДА ЧЭХАЎ

З выкладзеных вышэй матэрыялаў кожны ўважлівы чытач без асаблівай цяжкасці можа зрабіць для сябе выснову, што ніводнаму з славянскіх народаў не давалася так цяжка захаванне сваёй этнакультурнай самабытнасці, як беларусам. З гэтай бядою яны сутыкнуліся, яшчэ знаходзячыся ў складзе Рэчы Паспалітай. Такое ж, толькі ў большай ступені, напаткала іх, калі супроць уласнай волі апынуліся пад скіпетрам расійскага імператара. Становішча як у першым, так і другім выпадках абцяжарвалася блізкасцю беларускай культуры да польскай і рускай, што, як сведчыць сусветны вопыт, вельмі моцна ўплывае на паглыбленне асіміляцыйных працэсаў. У гэтым плане славяне пад прыгнётам Асманскай імперыі, Прусіі ці Аўстрыі куды лепш былі адгароджаны ад культурна-моўнай асіміляцыі, чым беларусы, жывучы з палякамі ў Рэчы Паспалітай і з рускімі — у царскай імперыі. У гэтых варунках страты маглі б быць не такімі адчувальнымі, калі б актыўнымі носьбітамі культурна-моўных традыцый беларускага народа з'яўляліся яго самыя заможныя і адукаваныя станы. На вялікі жаль, тады, як і сёння, гэтыя ўплывовыя пласты беларускага грамадства больш цягнуліся да чужых культур, чым да ўласнай. Адсюль і страшэнная дэнацыяналізацыя духоўнага жыцця беларускага народа.

Неадпаведнасць культурнай арыентацыі заможных і адукаваных станаў таго ці іншага грамадства нацыянальнаму інтарэсу — гэта цяжкавылечная хвароба не толькі беларусаў. На яе пакутавалі і пакутуюць таксама многія іншыя народы, толькі не ў такіх маштабах, як беларусы. І ў чэхаў, напрыклад, заможныя станы насельніцтва таксама аказваліся вельмі ахвочымі да чужой нямецкай культуры і мовы, без асаблівых ваганняў здраджвалі сваім духоўным каштоўнасцям і таму станавіліся лёгкай здабычай асімілятарскай палітыкі. Пра такія станы наступным чынам выказаўся ў студзені 1842 г. польскі паэт беларускага паходжання Адам Міцкевіч у адной з сваіх парыжскіх лекцый па славянскай літаратуры: «Чэшская арыстакратыя з-за нянавісці да гусітаў, якія адначасова выступілі і супраць каталіцкай царквы, і супраць прывілеяў дваранства, анямечылася, запазычыла нямецкія норавы і звычаі і захавала толькі свае прозвішчы як адзінае сведчанне славянскага паходжання. Буржуазія (чэшская — *Л. Л.*) брала прыклад з дваранства; яна пайшла яшчэ далей у нянавісці да ўсяго славянскага, адмовіўшыся нават ад сваіх прозвішчаў; чэшскія гарады запаланілі немцы. Знішчэнне кніг і помнікаў працягвалася... Толькі народ захаваў свае нацыянальныя рысы, мову і традыцыі. Цалкам адгароджаны ад дваранства народ, які ненавідзела і адштурхоўвала буржуазія, захаваў маральную чысціню, прастату, мяккасць характару і любоў да працы»[27]. І ўсё ж здрада чэшскай арыстакратыі і буржуазіі нацыянальным інтарэсам уласнага народа вельмі дорага каштавала яму. Калі раней, у эпоху сярэднявечча, чэхі, паводле мер-

[27] Мицкевич Адам. Собр. соч. в 5 томах. Т. 4. М., 1954. С. 320.

каванняў А. Міцкевіча, «ішлі на чале славянскай культуры», дык у 40-я гады XIX ст. яны ўжо на цэлае стагоддзе адставалі ў сваім культурным развіцці.

Адставаць жа даводзілася таму, што чэхі вымушаны былі шмат часу і энергіі аддаваць не проста стварэнню духоўных каштоўнасцяў, як гэта робіцца ў нармальных варунках жыцця, а клопатам, як усцерагчы іх ад дэнацыяналізацыі. Датычыла гэта і такога важнага фактару культуры, як родная мова. Паколькі і ў сучаснай Беларусі ёсць шмат нявырашаных праблем у галіне моўнай палітыкі, думаецца, не лішнім будзе больш падрабязна спыніцца на тым, што ў той час у Чэхіі адбывалася з яе роднай мовай. Вось як стан апошняй характарызаваўся ў афіцыйных крыніцах: «Усе вышэйшыя чыноўніцкія месцы ва ўсіх ведамствах аддадзены немцам, і ад кожнага чыноўніка чэха патрабуюць ведання нямецкай мовы, тады як немец можа не ведаць ні слова па-чэшску (...)». Існавала практыка здачы спецыяльнага экзамена па нямецкай мове пры паступленні на працу ў пэўныя ўстановы і на прадпрыемствы, і чэх з вышэйшай адукацыяй не атрымліваў у іх месца без грунтоўнага валодання нямецкай мовай, тады як немец атрымліваў яго і «пры самым нтзкім адукацыйным цэнзе».

Чэшскія нацыянальныя патрыёты энергічна і настойліва даводзілі свайму народу: «Калі б чэшскае грамадства на кожнае патрабаванне на нямецкай мове адказвала па-чэшску, парадкі б змяніліся...» Абараніць свой народ ад анямечвання, меркавалі, можна «не інакш як самасвядомасцю: кожны чэх павінен лічыць сваім свяшчэнным абавязкам дамагацца як у гандлі, так і ва ўсіх дзяржаўных управах раўнапраўя чэшскай мовы (даравanага асноўн. закон. арт. 19, 1867 г.); калі ў зносінах афіцыйных, вусных або пісьмовых чэхі будуць карыстацца сваёй мовай, калі чэшскае грамадства будзе энергічна пратэставаць супроць кожнага парушэння раўнапраўнасці, калі на дзяржаўных будынках чэхі не будуць трываць нямецкіх надпісаў на першым месцы, калі яны энергічна выступяць супроць заняццяў чыноўніцкіх месцаў у чэшскіх краях немцамі, — тады яны будуць рабіць тое, чаму яны навучыліся ад немцаў у апошніх баях.

(...) Калі дапусціць парушэнні раўнапраўя мовы ў малым, дык не заўважана будзе парушэнне яе ў вялікім»[28] .

Нам не шкодзіла б павучыцца ад чэхаў і таму, як яны схілялі на свой бок іншапляменныя народы, што жылі на іх тэрыторыі, але трымаліся пранямецкай арыентацыі і ўсяляк садзейнічалі германізацыі карэннага насельніцтва Чэхіі. Намаганняў давялося прыкласці нямала, каб гэтая арыентацыя на ўсе сто восемдзесят градусаў змяніла свой накірунак. І яна мянялася да лепшага. З цягам часу шчырыя прыхільнікі чэшскай ідэі з’явіліся і сярод многіх яўрэяў, асабліва пасля таго, як «у 1893 г. быў заснаваны «Народны саюз чэшска-жыдоўскі». Ствараўся ж ён «дзе-

[28] Е. де-Витте. Действительность. Вып. 11-й. Онемечение. Борьба народностей. Моравия. Почаев. 1911. С. 89—91.

ля ўзмацнення чэшскай самасвядомасці сярод чэшскіх жыдоў, дзеля ўхілення перашкодаў, якія ставяцца (немцамі. — *Л. Л.*) на шляху да ўзаемнага пагаднення; садзейнічаць таму, каб дзеці жыдоў навучаліся і выхоўваліся ў чэшскіх (а не ў нямецкіх. — *Л. Л.*) школах; садзейнічаць таму, каб жыдоўскае набажэнства, калі не здзяйсняецца на яўрэйскай мове, здзяйснялася на чэшскай; падтрымліваць матэрыяльна чэшскіх кандыдатаў у рабіны, садзейнічаць заснаванню рабінскай семінарыі з выкладаннем чэшскай мовы». З усіх сяброў «Народнага саюза чэшска-жыдоўскага» самую прыхільную пазіцыю да чэхаў займаў нехта Остэррайх. На першым агульным сходзе гэтага саюза 7 ліпеня 1895 г. ён заявіў: «Мы гаворым, што складаем частку чэшскага народа; але тыя жыды, якія ворагі чэшскага народа, ворагі і нашы, і мы як частка чэшскага народа павінны стаць супроць тых жыдоў»[29] .

На бок чэшскага Адраджэння рашуча стаў яўрэйскі перыядычны друк. У 1894 г. у сваім праграмным артыкуле адна з яўрэйскіх газет Чэхіі пісала: «Хочам працаваць з мэтаю, каб кожны чэшскі жыд стаў шчырым чэхам, каб адчуваў, думаў, гаварыў, дзейнічаў, як усялякі іншы верны чэх; каб усе чэшскія жыды шчыра далучыліся да ўсіх народных чэшскіх ідэалаў і ў згодзе з іншымі чэхамі бралі ўдзел у дамашняй працы — асветніцкай, эканамічнай і палітычнай». Вядома таксама, што ў час выбараў у 1896 г. «Народны саюз чэшска-жыдоўскі» выдаў у Празе «Зварот да мараўскіх жыдоў, у якім папярэджваў не ісці супроць славян»[30] .

Сёння беларусам нават і ў сне не прыходзіць такое ўзаемапаразуменне з яўрэямі, а таксама іншымі этнічнымі групамі. Усе яны, за выключэннем нязначнай часткі татарскай грамады, будуюць сваё духоўнае жыццё на сваёй нацыянальнай і рускай культурна-моўнай асновах. Беларускі фактар у ім практычна адсутнічае, за што трэба вінаваціць дзяржаўную нацыянальную палітыку, якая не спрыяла духоўнаму развіццю тытульнага народа, а, наадварот, паглыбляла працэсы русіфікацыі апошняга. Ён да такой ступені этнічна знясілены, што нават не супраціўляецца такой ганебнай палітыцы. Разлічваць, што ў такой пройгрышнай для карэннага насельніцтва сітуацыі этнічныя меншыні нашай краіны будуць развіваць сваю культуру з улікам беларускага, а не рускага фактару, ніяк не даводзіцца.

Сумеснае чэшска-яўрэйскае супраціўленне германізацыі зніжала яе адмоўнае ўздзеянне на культуру і мову гэтых народаў, але поўнасцю не магло адгарадзіць іх ад асіміляцыі. З ёю паспяхова можна змагацца, толькі маючы сапраўдную суверэнную нацыянальную дзяржаву.

Мала што да лепшага змянілася і ў першыя дзесяцігоддзі XX ст., з чым ніяк не жадала змірыцца патрыятычная частка чэшскай нацыі. Разам з прагрэсіўнымі коламі славацкага народа яны актыўна змагаліся за выхад з-пад нацыянальнага ўціску Аўстра-Венгерскай імперыі. Са-

---

[29] Там же. С. 160, 161.

[30] Е. де-Витте. Действительность. Вып. 11-й. С. 161.

маахвярная барацьба двух братніх славянскіх народаў завяршылася стварэннем у кастрычніку 1918 г. незалежнай Чэхаславацкай Рэспублікі. Яе ўзнікненне — гэта вельмі важны фактар на шляху дзяржаўнага сталення славянскай этнічнай супольнасці. Пад той час з усіх яе складовых частак толькі невялікія па колькасці славянскія народнасці не выйшлі з-пад улады неславянскіх краін і не змаглі стварыць сваіх уласных дзяржаў. Усім такім народнасцям рэальна пагражала культурна-моўная асіміляцыя, што і здарылася для шэрагу з іх на працягу дваццатага стагоддзя.

Што дала свету, славянскай супольнасці народаў упартасць чэхаў у шматвяковым адстойванні роднай культуры і мовы ад анямечвання, добра вядома гісторыі. Яны былі піянерамі сярод славян у кнігадрукаванні. Радзімай першай славянскай кнігі стаў у 1468 годзе горад Пльзень, які ў якасці заходняга фарпосту Чэхіі зведаў найбольшы ўціск з боку антынацыянальнай палітыкі Габсбургаў, меў у складзе свайго насельніцтва высокі працэнт немцаў-каланістаў. І ўсё ж чэшская аснова культуры гэтага горада захавалася, мела ўстойлівую тэндэнцыю да развіцця. Праз дзесяць гадоў другім цэнтрам славянскага друкавання стала Прага, дзе нашым выдатным асветнікам-гуманістам Францішкам Скарынам быў пакладзены пачатак беларускага друкавання.

Значыцца, умеем вучыцца і атрымліваць карысць з чэшскага вопыту. З яго беларускім палітыкам і ідэолагам трэба ўзяць максімум таго, што датычыць чэшскага нацыянальна-культурнага адраджэння. Адкінем усялякі сорам, што вось, маўляў, маем уласную Беларускую дзяржаву, і трэба ў кагосьці пераймаць вопыт выратавання яе тытульнага народа ад культурна-моўнай асіміляцыі. Праблема гэтая архіскладаная, і прызнацца ў няздольнасці развязвання яе не — такі ўжо і вялікі грэх. Затое вялікі грэх — нічога не рабіць па яе развязванні, як гэта ўжо больш за дзесяць гадоў назіраецца на Беларусі. Мела б сэнс яе палітыкам грунтоўна азнаёміцца з нарматыўнай базай чэшскага нацыянальна-культурнага адраджэння, што дапамагло б прыняць хоць пару дзейсных заканадаўчых актаў па спыненні русіфікацыі, умацаванні ролі прыродных асноў у культуры краіны.

Зусім не апраўдана, што прагрэсіўны вопыт дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі Чэхіі не знайшоў належнага адлюстравання ў працах беларускіх навукоўцаў. Ствараецца ўражанне, што дзяржаўныя ўлады Беларусі разам са сваім ідэалагічным апаратам нічога не збіраюцца рабіць па ўтаймаванні культурна-моўнай асіміляцыі, таму выказваюць поўную абыякавасць да вопыту іншых краін па выратаванні сваіх народаў ад дээтнізацыі. Калі наша дзяржава і сапраўды нічога не збіраецца рабіць па запазычванні сусветнага вопыту нацыянальна-культурнага адраджэння, у т. л. і самага блізкага нам чэшскага, гэтай высакароднай справай павінны заняцца грамадскія колы, тым больш, што ў іх даволі трывалыя стасункі з гэтай славянскай краінай. І самым першым крокам у дадзеным напрамку павінна быць выданне зборніка прынятых чэшскім урадам дакументаў і матэрыялаў па нацыянальна-культурным адраджэнні з мэтай азнаямлення, творчага выкарыстання іх у беларускай практыцы.

## 8. БЕЛАРУСАМ НЕ БЫЦЬ АДЗІНОКІМІ

Сам факт прыналежнасці таго ці іншага народа да славянскай этнічнай супольнасці абавязвае яго як мага паўней сувымяраць свае дзеянні з інтарэсамі апошняй, браць на сябе ініцыятыву па забеспячэнні ёй усіх неабходных умоў для дынамічнага развіцця, а, калі таго запатрабуюць абставіны, разлічваць на яе дапамогу. Не можа не здзіўляць, што кожны раз, як толькі распачынаецца прадметная гаворка пра неабходнасць паглыблення славянскай еднасці і братэрства, ініцыятыву ў гэтым як правіла бяруць на сябе самыя буйныя нацыі, найперш руская. А ў такіх жа выпадках зусім не абавязкова, каб з пачынам выступалі толькі шматлікія па колькасці славянскія народы. Да разумнай, слушнай прапановы, упэўнены, славяне прыслухаюцца і тады, калі яна будзе ісці ад самага маленькага народа гэтай супольнасці. Але чамусьці з такой ініцыятывай малалікія славянскія народы вельмі і вельмі рэдка выступаюць. Таму міжвольна ўзнікае пытанне, а ці не меў, а ці не мае гэты найвялікшы сярод славян рускі народ, акрамя агульнаславянскіх інтарэсаў, яшчэ якіх-небудзь і сваіх уласных, прычым больш важных для яго? Ці не збіраюцца і сёння адрадзіць дух панславізму канца XVIII — пачатку XX ст., галоўнай мэтай якога было дзяржаўнае аб'яднанне ўсіх славян пад эгідай Расіі? Правалілася гэтая зусім не бяшкодная ідэя ў мінулым. Шкодная, бесперспектыўная яна і ў нашыя дні.

Паслядоўным, мэтанакіраваным выкананнем вядомага запавета вялікага рускага паэта Аляксандра Пушкіна «Славянские ручьи сольются в русском море (з верша «Клеветникам России») рускія і нашыя собскія асімілятары прычынілі шмат бяды беларускаму народу. З-за іх некальківяковай стратнай нацыянальнай палітыкі мільёны беларусаў адышлі на той свет, так і не стаўшы носьбітамі сваёй прыроднай культуры, не авалодаўшы і не спазнаўшы прыгажосці сапраўднай роднай, а не навязанай ім мовы.

Увасабленне на практыцы панславісцкай ідэі адзінства славян пад рускім вяршэнствам не дасць аніякай карысці ні Расіі, ні славянскай супольнасці народаў. Чым кожны з іх будзе больш дзяржаўна-суверэнным, тым больш паспяхова ён будзе развівацца ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці і на гэтай аснове знойдзе ў сабе сілы паспрыяць росквіту той этнічнай супольнасці, да якой належыць.

Са славянскага лексікона трэба рашуча выкараніць словы пра прыярытэт, вяршэнства якога-небудзь аднаго з народаў гэтай этнічнай супольнасці над іншымі, што ўжо апошняй прынесла нямала бяды. Іншым разам, каб даказаць сваё «законнае права» быць першым сярод славян, незаслужана прыніжаліся ўсе астатнія з іх. Так, вядомы ў XVI — пачатку XVII ст. польскі дзеяч Іаан Замойскі дазволіў сабе выказацца наступным чынам: «Славянскае племя было раней вялізным, яно нават зараз яшчэ і далёка і шырока распаўсюджана; але адны недастаткова адукаваныя, а іншыя знаходзяцца ў рабстве; масквіцяне, дзяржава якіх далёка і шырока раскінутая, абсалютныя варвары; сербы, басняки і іншыя

паўднёвыя славяне падпалі пад чужую ўладу і пазбавіліся волі і амаль усяго значэння, і многія пагружаныя таксама ў варварства; адны толькі чэхі і палякі, маўляў, ахоўваюць годнасць і волю славянскага племені»[31]. А вось пачынаючы з XIX ст., калі на еўрапейскай арэне істотна ўмацаваліся пазіцыі Расійскай імперыі, ужо стала модным з усіх славян у якасці самага перадавога называць рускі народ, што, аднак, далёка не ўсімі падзялялася. І нішто яму не прычыняла такой шкоды, як няўдалыя спробы стаць палітычным уладаром над славянскай этнічнай супольнасцю. Не перавяліся і сёння такія ахвотнікі. Сустракаюцца сярод іх і асобы, якія жадалі б бачыць Расію галоўнай палітычнай сілай у адзінай сумеснай з Украінай і Беларуссю дзяржаве. У аснове гэтых планаў ляжаць успаміны пра далёкае-далёкае мінулае, калі прашчурам сённяшніх рускіх, украінцаў і беларусаў даводзілася шукаць шляхі палітычнага аб'яднання на неабсяжных, малаабжытых прасцягах Усходняй Еўропы.

Сучасным рускім палітычным інтэгратарам, у якіх, дарэчы, ёсць таксама прыхільнікі сярод украінцаў і беларусаў, хочацца давесці, што сённяшні і заўтрашні дзень гэтак жаданай імі ўсходнеславянскай супольнасці ўвогуле і беларускага народа ў прыватнасці нельга сувымяраць з умовамі ўзнікнення да канца не аформленай колішняй Кіеўскай (Старажытнарускай) дзяржавы, якая ўжо даўно належыць гісторыі. Еўрапейскія народы, як вядома, зараз не кіруюцца тым, што было характэрным для Свяшчэннай Рымскай імперыі ці імперыі Карла Вялікага. Менш за ўсё глядзяць у бок Арабскага халіфата арабы і Атаманскай (Турэцкай) імперыі туркі, калі ім трэба сёння вырашаць якія-небудзь пытанні дзяржаўнага будаўніцтва, узаемаадносін з іншымі народамі. Не трэба і ўсходнім славянам імкнуцца ўступіць у адну і тую ж раку двойчы.

Калі так заняпала беларуская нацыянальная ідэя ва ўласнай дзяржаве, а яе многія палітычныя, грамадскія, культурныя дзеячы носяцца з агульнарускай, агульнаславянскай ідэямі, гэта можа быць расцэнена як іх наўмысны адыход ад вырашэння беларускага пытання. Спачатку трэба было б дасягнуць хоць самых мізэрных зрухаў у яго рэалізацыі, а затым ужо брацца за больш агульныя праблемы, якія, акрамя беларусаў, павінны хваляваць і яшчэ прыкладна паўтары дзесяткі славянскіх народаў.

Дарэчы, такое захворванне людзей ад улады ўласціва не толькі беларусам. Даўно заўважана, што часта, калі палітыкі і адданыя ім тэарэтыкі хочуць ухіліцца ад вырашэння лёсу якога-небудзь канкрэтнага народа, яны заяўляюць, што куды важней займацца рэалізацыяй больш маштабных, планетарных задач. Такія дзеячы вельмі любяць карыстацца выразамі: «агульначалавечы прагрэс», «агульначалавечыя інтарэсы», «агульнаславянскае адзінства», «агульнаславянскія ідэалы». Улічваю-

[31] Первольф Иосиф. Славяне, их взаимные отношения и связи. Т. II. Варшава. 1888. С. 72, 73.

чы, што сярод беларусаў такі велізарны пласт ужо адрынутых ад уласных этнакультурных нормаў людзей, нашым палітыкам у звязку з ідэолагамі трэба менш за ўсё гаварыць пра агульнаславянскія «ідэалы» і «адзінства», перавагі саюзнай з Расіяй дзяржавы, а больш думаць і рабіць такога, каб хоць тыя, што яшчэ не адцураліся роднай культуры і мовы, не пераўтвараліся ў этнічных мерцвякоў. Карацей кажучы, нашым палітыкам, не зрабіўшы нічога вартага для нацыянальнага духоўнага жыцця ўласнага народа, нельга брацца за ўзвядзенне Славянскага Хорама, не дасягнуўшы кансалідацыі беларускага грамадства з-за яго культурна-моўнага падзелу, нельга насіцца з планамі дзяржаўнай інтэграцыі з Расіяй, мадэрнізацыі славянскага свету.

Неабходна мець на ўвазе і наступнае: як раней, так і зараз Расію ніяк нельга назваць тыповай славянскай дзяржавай, бо ў ёй у вялікай колькасці жывуць і нярускія народы. Не выключана, што ў перспектыве працэнтныя суадносіны ў складзе насельніцтва гэтай краіны будуць яшчэ больш мяняцца на карысць апошніх. Больш дакладная назва Расіі, якая ўсё часцей сустракаецца на старонках кніг яе вучоных, — гэта еўразійская імперыя.

Каб адбіць жаданне ў сучасных дзеячоў самай вялікай ці якой-небудзь з іншых славянскіх краін займацца бесперспектыўнымі планамі палітычнай інтэграцыі народаў гэтай этнічнай супольнасці, нагадаю, што і раней з такой ідэяй безвынікова насіліся многія вядомыя дзеячы. І часцей за ўсё яна ўзнікала ў час, калі існавала якая-небудзь сур'ёзная пагроза для гэтых народаў. Выказваўся за такую ідэю і вядомы палітычны, грамадскі і ваенны дзеяч ВКЛ Леў Сапега (1557—1633), у бытнасць якога адбываліся кровапралітныя сутычкі паміж дзвюма магутнымі славянскімі краінамі — Рэччу Паспалітай і Расійскай дзяржавай. Леў Сапега нават выказваўся не толькі за палітычнае аб'яднанне гэтых, але і ўсіх славянскіх дзяржаў, абранне для іх адзінага манарха. Але на шляху да рэалізацыі такой задумы заўсёды ўзнікала столькі перашкодаў, што яна ўжо на першым этапе выяўляла ўсю сваю нямдольнасць пераўвасобіцца ў жыццё. Вельмі ўжо супярэчлівымі паміж сабой аказваліся погляды палітычных дзеячоў славянскіх народаў на дадзеную праблему. І гэта зразумела, бо пры ўсёй іх блізкасці было нямала і такога, што ў поўным аб'ёме можна было ажыццявіць толькі ў рамках уласнай незалежнай дзяржавы. Пераканацца ў гэтым можна было і на прыкладзе самой Рэчы Паспалітай: з трох славянскіх народаў — польскага, беларускага і ўкраінскага — нармальна развіваўся толькі першы, а астатнія вялі ўпартую барацьбу за сваё этнічнае выжыванне.

Несумненна, будучае славянскіх народаў не ў якой-небудзь агульнай супердзяржаве — катле культурна-моўнай асіміляцыі, бясконцых супярэчнасцяў і спрэчак, — а ў трывалым раўнапраўным саюзе суверэнных незалежных славянскіх дзяржаў з іх адметнымі самабытнымі культурамі і мовамі. Лепшай формы арганізацыі жыцця кожнага народа, як нацыянальная дзяржава, сусветны вопыт яшчэ не вынайшаў. Да такой ідэі тысячагоддзямі ішла цывілізацыя і, дзякаваць Богу, прыйш-

ла, бо гэта стварыла спрыяльныя ўмовы для самарэалізацыі дзяржаўных народаў, у т. л. і славянскіх. Таму распад славянскіх федэратыўных дзяржаў на зыходзе XX стагоддзя не павінен разглядацца як нейкая трагедыя. Славянскія народы нарэшце зразумелі, што найлепш здзейсніцца ў якасці адметнай этнакультурнай супольнасці кожны з іх можа толькі ў паасобна ўзятай незалежнай дзяржаве.

Даводзіцца толькі цешыцца, што аўтарытэт суверэннага дзяржаўнага існавання ў славян такі ж вялікі і паважаны, як і ва ўсіх цывілізаваных народаў. Трэба настойліва шукаць такія шляхі росквіту славянскай супольнасці, якія не падрывалі б, не абмяжоўвалі б дзяржаўнага суверэнітэту кожнай яе складовай часткі.

Любая форма палітычнай кансалідацыі, аб'яднання славянскіх народаў не павінна мець на ўвазе стварэнне нейкай агульнай дзяржаўнай аграмадзіны, у якой нацыянальны суверэнітэт, за выключэннем яго толькі аднаго-двух найбольш колькасных народаў, будзе абавязкова ўразацца. Такое крайне непрымальна, страшэнна небяспечна. Курс на інтэграцыю, розныя формы аб'яднання славян трэба весці толькі праз умацаванне дзяржаўнасці кожнага з іх, тады ў гэтай супольнасці будзе панаваць поўная згода. Не бачу сёння праблем між славянскімі народамі, у тым ліку паміж рускімі, украінцамі, беларусамі, развязванне якіх (праблем) патрабавала б наступу на нацыянальную незалежнасць таго ці іншага з іх.

Як нікому з славян яна вельмі патрэбна нам, беларусам. І не таму, што мы мо які-небудзь абраны Богам народ. Не, уласная, па-сапраўнаму суверэнная дзяржава нам патрэбна ў першую чаргу дзеля таго, каб не на словах, а на справе павесці барацьбу з нечуванай да гэтага дэнацыяналізацыяй беларускага народа, якая практычна мяжуе з яго этнічным выміраннем. Ніякая федэратыўная ці канфедэратыўная дзяржава не будзе змагацца з гэтай навалаччу. У яе будуць зусім іншыя мэты на беларускай прасторы.

Зараз праблемай нумар адзін нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання славянскіх краін і асабліва Рэспублікі Беларусь павінна быць забеспячэнне ўсіх умоў для далейшага ўзбагачэння сваёй этнакультурнай, найперш моўнай, адметнасці з тым, каб не паўтараць у духоўным развіцці адзін аднаго, ад чаго будзе ў вялікім выйгрышы ўся сем'я славянскіх народаў. Сучаснае празмернае панаванне на гістарычнай тэрыторыі Беларусі рускай культуры і мовы ёсць не заканамернасць, а, наадварот, парушэнне ўсялякай логікі ў духоўным развіцці беларускага народа ў прыватнасці і славянскай этнічнай супольнасці ў цэлым.

Такое сталася не выпадкова і не стыхійна. Спачатку рэжым царскай Расіі, затым — СССР і нарэшце самой Рэспублікі Беларусь, пачынаючы з 1995 г., уліў у культуру яе карэннага насельніцтва такую забойную порцыю рускіх духоўных каштоўнасцяў, што яно ледзь не цалкам адышло ад свайго ладу жыцця і перайшло на гвалтоўна навязаныя і часткова запазычаныя ад усходняй суседкі стандарты. У выніку такой культурнай трансфармацыі этнічная самабытнасць беларускага народа стала

вельмі празрыстай. Сёння ён па мове і выкарыстанні здабыткаў прафесійнай культуры больш падобны на рускую нацыю, чым на самога сябе. Замест таго, каб біць у званы з-за этнічнага распаду народа, дзяржаўныя дзеячы, афіцыйныя колы інтэлігенцыі Беларусі лічаць гэта за вялікія гістарычныя дасягненні і выкарыстоўваюць іх у якасці найважнейшага аргументу дзеля абгрунтавання неабходнасці палітычнай інтэграцыі з Расіяй. У сваіх публічных выказваннях яны не раз з вялікай радасцю заяўлялі, што сёння ўжо няма ніякіх істотных культурна-моўных адрозненняў паміж беларусамі і рускімі, што гэта ёсць адзіны народ, імя якога — рускі. Шмат робяць па прапагандзе такога ілжывага погляду некаторыя ўплывовыя на Беларусі рэлігійныя канфесіі.

Пахвальна, што да голасу нашых, сваёй гадоўлі нацыянальных нігілістаў з кагорты высокіх палітыкаў і элітарных пластоў інтэлігенцыі не прыслухоўваюцца прагрэсіўныя дзеячы славянскіх краін і працягваюць глядзець на беларусаў, нават і моцна засіміляваных, як на адметны ад іншых народ, які шмат карыснага зрабіў і яшчэ зробіць для культуры славянскай этнічнай супольнасці. Нібыта ў піку таму, што так часта разносіцца ў нашых дзяржаўных сродках масавай інфармацыі, славацкі літаратуразнаўца Й. Шэлепец у адной з сваіх публікацый за 1999 год пісаў: «Беларускі народ у славацкіх навуковых працах быў аналізаваны і прадстаўлены як самабытны славянскі народ, які мае сваю ўласную літаратурную мову, сваю самабытную культуру і сваё неад'емнае месца ў сям'і славянскіх і індаеўрапейскіх народаў»[32]. Бяда толькі ў тым, што ўсё тое, што ён мае з уласных нацыянальных духоўных набыткаў, не знаходзіць з-за заганнай дзяржаўнай культурна-моўнай палітыкі належнага распаўсюджвання ў беларускім грамадстве, бо і пасля атрымання краінай палітычнай незалежнасці працягваюць моцна панаваць тут руская культура і мова. Таму з-за сваёй нацыянальнай дэградацыі яно адыгрывае вельмі мізэрную ролю ў забеспячэнні разнастайнасці духоўнага жыцця славянскага свету. Пры іншай дзяржаўнай культурнай палітыцы прыроджаная беларусам здольнасць да плённай творчай дзейнасці магла б значна павысіць іх уклад у такую разнастайнасць. Нашым палітыкам і інтэлігенцыі варта было б сур'ёзна ўнікаць у шматвяковую практыку іншых славянскіх народаў па шанаванні свайго этнічнага «Я». Вось, да прыкладу, як разумна, павучальна вызначыў месца свайго народа ў славянскай супольнасці адзін з самых вядомых дзеячаў чэшскага нацыянальнага Адраджэння XIX ст. Гаўлічак: «Каб стаць сапраўднымі славянамі, мы павінны перш за ўсё знайсці саміх сябе... Я не аспрэчваю рэальнасці славянства, але сцвярджаю, што рэальнасць яго грунтуецца на рэальнасці паасобных плямёнаў». Якая на сёння рэальнасць у беларускага племені, кожнаму зразумела: шматразовае перавышэнне ў культурным жыцці запазычанага ад суседняй усходняй краіны над уласна сваім нацыянальным.

Як, можа, ні балюча будзе многім нацыянальна свядомым беларусам, але мушу зрабіць такое параўнанне, што наша сённяшняе духоў-

[32] Літаратура і мастацтва. 2000, 15 верасня. С. 7.

нае жыццё шмат у чым нагадвае гаротнае становішча культуры аднаго з балцкіх плямёнаў — прусаў, якія дзякуючы «старанням» Тэўтонскага ордэна спынілі ў XIII ст. сваё існаванне. Розніца ж толькі ў тым, што тады знікненню прускай культуры папярэднічала фізічнае знішчэнне тэўтонцамі яе прыродных носьбітаў. Мы, слава Богу, фізічна існуем, толькі ўжо ў пераважнай большасці не з'яўляемся носьбітамі роднай беларускай культуры і мовы, чым падрыхтавалі свае найбліжэйшыя пакаленні да непазбежнай этнічнай пагібелі. Стараннымі «клопатамі» палітыкаў чужых і сваёй дзяржаў, чужой і ўласнай інтэлігенцыі мы аказаліся ледзь не ўсе агулам вельмі добра прыстасаванымі да жыцця ў рускай культурна-моўнай стыхіі і адрынутымі ад такой жа сваёй прыроднай стыхіі.

Якім трэба быць наіўным, каб думаць, што з гэтай бядой лягчэй будзе справіцца, стварыўшы поліэтнічную дзяржаву ў складзе рускіх, украінцаў, беларусаў ці і яшчэ якіх-небудзь іншых славянскіх народаў. Не выкліча заклапочанасці дэнацыяналізацыя нашага культурнага жыцця і ў сфармаванай толькі з рускіх і беларусаў саюзнай дзяржавы. У ёй працэс русіфікацыі беларускага народа будзе адбывацца яшчэ больш маштабна, чым гэта мае месца ў нашай сённяшняй дзяржаве, далёка не беларускай паводле характару сваёй культурна-моўнай палітыкі.

З усяго сказанага вышэй напрошваецца выснова, што ўсім палітычным дзеячам, якія хацелі б узяць на сябе вельмі адказную місію вырашэння лёсу славянскай супольнасці ў цэлым ці толькі часткі яе, трэба быць надзвычай абачлівымі і справядлівымі, каб яе этнічныя суб'екты свядома не спіхваць на шкодны, небяспечны шлях культурна-моўнай асіміляцыі. А такое, на вялікі жаль, назіраецца. Яскравы прыклад таму Рэспубліка Беларусь. Практычна ўсе нашыя дзяржаўныя і грамадска-палітычныя дзеячы, што актыўна шчыруюць на славянскай ніве, умудраюцца толькі ім вядомымі спосабамі ўхіляцца ад ужывання прыроднай мовы свайго народа пад час сустрэч са сваімі славянскімі партнёрамі, моцна здзіўляючы іх такім адмоўным стаўленнем да культурнай спадчыны ўласнай краіны. З такім несусветным нацыянальным нігілізмам, здавалася б, і сярод шараговых людзей сорамна з'яўляцца, а нашыя палітыкі пруць у самыя высокія славянскія вярхі.

Хтосьці, чытаючы маю працу, на паўдарозе адкіне яе ўбок і ўсклікне: «Ох жа і русафоб гэты Лыч!» Памыляецеся, шаноўны. Я не магу з павагай не ставіцца да рускага народа хаця б таму, што да апошняга належыць мая жонка, на яго мове я атрымаў сярэднюю спецыяльную (Мінск) і вышэйшую (Уфа Башкірскай АССР) адукацыю, напісаў і абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі. У маёй хатняй бібліятэцы ў дзесяткі разоў больш літаратуры на рускай, чым на беларускай, мове. Праўда, апошнімі гадамі падпісваюся выключна толькі на беларускамоўныя газеты і часопісы, бо хачу падтрымаць нацыянальны перыядычны друк, пра лёс якога практычна зусім не клапоціцца дзяржава. У працы адкрыта і паслядоўна выказваюся за абмежаванне сферы распаўсюджвання рускай прафесійнай культуры і мовы ў нашым краі

толькі таму, што бачу ў іх асноўную прычыну выціснення на задворкі беларускай культуры і мовы, звязаную з гэтым асіміляцыю беларускага народа. Каб усе гэтыя крайне негатыўныя з'явы ў духоўным жыцці Беларусі выклікаліся неўтаймаваным разгулам на яе тэрыторыі польскай, нямецкай, французскай ці якіх-небудзь іншых культур і моваў, я з такой жа рашучасцю выступаў бы і супраць іх толькі дзеля таго, каб абараніць, стварыць належныя ўмовы для функцыянавання беларускай прафесійнай культуры і мовы. Палітыкам, творчай інтэлігенцыі трэба ў найбліжэйшы ж час дакладна вызначыць месца гэтага фактару ў жыцці краіны, усяляк дамагаючыся таго, каб у дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх органаў, устаноў адукацыі, культуры і навукі суадносіны паміж нацыянальным і інтэрнацыянальным былі такія, як у Польшчы, Літве, Германіі, Францыі і іншых унітарных аднанацыянальных краінах. Не думаю, што сапраўдныя рускія патрыёты, інтэлектуальныя людзі пакрыўдзяцца, што беларусы бяруцца ратаваць сваю культуру і мову з-пад празмернага, небяспечнага ўплыву на яе рускай культуры і мовы.

Не будзем забывацца, што не ў меру маштабнай русіфікацыяй свайго духоўнага жыцця мы ствараем вельмі спрыяльныя ўмовы для новай формы яго асіміляцыі — амерыканізацыі. Не сумняваюся, што ніводзін з славянскіх народаў не будзе такім бездапаможным перад яе разбуральным наступам — а ён ужо і зараз добра адчуваецца, — як зрусіфікаваныя беларусы, паколькі іх адвучылі шанаваць сваю родную культуру. І далей. Калі славянскія народы ў жорсткім змаганні з амерыканізацыяй будуць адстойваць сваю родную, нацыянальную, дык мы, беларусы, — рускую культуру і мову. У такіх варунках наўрад ці станемся мы моцным арэшкам для амерыканскай культуры: губляем жа не тое, што належыць нам ад прыроды, перайшло ад прашчураў, а тое, што ўзяло верх, сапхнула ў бездань наша роднае, беларускае.

У нашым высакародным імкненні не паддацца культурна-моўнай асіміляцыі давайце ўсе, як адзін, будзем браць прыклад з братніх нам славянскіх народаў, якім гэтак доўга даводзілася змагацца за сваё выжыванне. Быў час, што туркі пераўтварылі Сербію ў суцэльны пустынны край, у якім толькі невялікая правінцыя ацалела і захавала сваё імя. Пазней гэтая сербская правінцыя вярнула захопленыя, аднавіла спустошаныя янычарамі землі і стала дзяржавай, прычым дзяржавай, якой нацыянальнае было даражэй за ўсё на свеце.

Калісьці перадавыя людзі нашага краю, у іх ліку і прадстаўнікі Беларускай сацыялістычнай грамады марылі, каб беларускі народ не быў «цямнейшым народам у славяншчыне»[33] . Мара збылася. Цяпер нам трэба імкнуцца да таго, каб не даць беларусам заставацца сама моцна здэнацыяналізаваным у славяншчыне народам. Так доўжыцца не можа бясконца. Этнічная смерць для сённяшніх маладых пакаленняў надыдзе ўжо ў найбліжэйшыя дзесяцігоддзі, і беларускую нішу ў славяншчыне зойме іншы народ. Што гэта за народ, думаю, тлумачыць няма патрэбы.

---

[33] Ліс Арсень. Цяжкая дарога свабоды // Полымя. — 1994, № 2. — С. 200.

Лішнім было б даказваць, як нам трэба паважаць прысутнасць на Беларусі ўсіх прыжытых тут культур, і, зразумела, найперш славянскіх — рускай, украінскай, польскай, і ў той жа не будзем забывацца, што свая, беларуская, культура і мова — гэта найдаражэйшыя для нас духоўныя каштоўнасці. Не магу не прывесці слушнай думкі шчырай абаронцы славянскіх ідэалаў Я. дэ-Вітэ: «... у вельмі вялікіх дозах чужая культура прыносіць больш шкоды, чым карысці. Пры гэтым усе дурныя бакі чужой культуры не аслабляюцца, а ўзмацняюцца, бо ўсё дурное лягчэй засвойваецца»[34] .

У гістарычнай практыцы шматкроць засведчана, што на адной і той жа дзялянцы зямлі не могуць жыць мірна два гаспадары. Тое ж самае можна сказаць пра культуру і мову. Пры ўсім старанні на Беларусі ўдасца захаваць такія адпаведнікі толькі або беларускія, або рускія. Сёння лепшыя ўмовы створаны для апошніх. Толькі ці справядліва гэта, калі на сваёй спрадвечнай этнічнай зямлі гінуць яе родная культура і мова, каб даць магчымасць жыць, панаваць тут культуры і мове суседняй краіны?

Знікненне беларускага народа з гістарычнай арэны ў выніку дэградацыі нацыянальнай культуры, страты роднай мовы нельга разглядаць як толькі яго ўласную праблему. Гэта яшчэ і праблема ўсёй славянскай супольнасці народаў, усёй Еўропы, калі не сказаць усёй сусветнай цывілізацыі, бо знікненне ў іх структуры хоць адной нацыі з уласцівай толькі ёй культурай і мовай ёсць ні што іншае, як збядненне агульначалавечага духоўнага патэнцыялу. Калі нічога не рабіць па выратаванні беларускага народа ад асіміляцыі ўласная дзяржава, гэта не значыць, што ў ролі простых сузіральнікаў павінны заставацца ўсе еўрапейскія краіны, і асабліва славянскія. Не трэба забывацца, што дзяржаўныя структуры Беларусі зверху і данізу ўкамплектаваны пераважна асобамі, якія прайшлі найбагацейшую школу русіфікацыі. Яны яшчэ не маглі стаяць на ўласных нагах, а бацькі ўжо папрывучалі іх да рускай культуры і мовы. Такое ж з імі затым зрабілі ў дашкольных і школьных, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах, у службовых кабінетах партыйных і дзяржаўных, адміністрацыйна-гаспадарчых і іншых органаў. Таму чакаць ад такіх людзей нейкага паблажлівага стаўлення да беларускай культуры і мовы не даводзіцца. Усялякая крытыка дзяржаўных дзеячаў за беларускі нацыянальны нігілізм строга асуджаецца і практычна не вядзецца, паколькі на яе накладзена табу ў афіцыйных сродках масавай інфармацыі. Беларусу настойліва працягваюць даказваць, што толькі праз рускую культуру, адукацыю і мову яму можа быць забяспечаны шырокі выхад у свет цывілізацыі. І ў масе сваёй людзі паддаюцца на такую агітацыю, бо многія з іх ужо ў некалькіх пакаленнях не маюць магчымасці набыць сур'ёзную адукацыю на роднай мове. Дашчэнту разбураны той беларускі этнакультурны асяродак, які быў у стане стала падсілкоўваць народ усё новым і новым жыццёвым прыродным матэрыялам, які раз за разам разбураўся ў выніку паланізацыі і русіфікацыі. А з'яўлялася ж такім асяродкам наша

[34] Е. де-Витте. Действительность. Выпуск 11-й. С. 134.

вёска. Цяпер асноўная маса беларусаў сканцэнтравана ў гарадзе, які, на вялікі жаль, ужо колькі стагоддзяў таму назад страціў нацыянальнае аблічча карэннага насельніцтва краю. Ледзь не да канца XIX ст. у беларускіх гарадах панавалі польска-яўрэйская ці яўрэйска-польская культуры і мовы, а апошнія сто гадоў — руская. Усё гэта вельмі абцяжарвае магчымасць весці змаганне за нацыянальна-культурнае адраджэнне і развіццё беларускага народа. Ужо шмат часу рускамоўны элемент горада ў сотні разоў перасягае беларускамоўны па сваіх матэрыяльных, фінансавых магчымасцях развіваць адукацыю, выдаваць літаратуру, арганізоўваць перадачы па радыё і тэлебачанні. І перасягае дзякуючы таму, што сама беларуская дзяржава садзейнічае існаванню такіх няроўных суадносін паміж гэтымі дзвюма культурамі і мовамі. Такую ганебную, шкодную для беларускай нацыянальнай ідэі практыку не ўяўляецца магчымым пераламаць толькі ініцыятыўным шляхам, абапіраючыся на нешматлікую колькасць шчырых, неасімілiяваных беларусаў.

Таму, хто не знаёмы з сучасным нацыянальна-культурным становішчам на Беларусі, цяжка паверыць, што яе карэнны этнас знаходзіцца на мяжы поўнай дэнацыяналізацыі. Яго ж, усялякі падумае, ніхто не падпарадкаваў, не заваяваў. Больш таго, ён мае сваю ўласную дзяржаву. Звонку ўсё гэта быццам бы і так. У адрозненне ад тых далёкіх зусім непакойных часоў, нам і сапраўды зараз ніякія захопніцкія крывапралітныя паходы з боку рускіх ці палякаў не пагражаюць. Затое з парадку дня ніяк нельга здымаць пытання ціхага, мірнага, «цывілізаванага» заваявання Беларусі праз распаўсюджванне на яе тэрыторыі чужой культуры і мовы. Цяпер нават палітык раённага маштабу не можа не бачыць, што ў нашай дзяржаве яе родная беларуская культура і мова займаюць другараднае, пабочнае месца ў параўнанні з рускай культурай і мовай. Калі на самым высокім дзяржаўным узроўні тэрмінова не зрабіць эфектыўных захадаў супроць такога спосабу «заваёвы» суверэннай Беларусі, як максімум праз чвэртку стагоддзя аб гэтым старажытным славянскім народзе застанецца толькі адны тужлівыя ўспаміны. Не трэба забывацца, што цяпер асуджаныя ўсім цывілізаваным светам працэсы культурна-моўнай асіміляцыі адбываюцца ў дзесяткі разоў больш інтэнсіўна, чым на пачатку мінулага стагоддзя. Таму залішні супакой за лёс беларускай нацыі ніколькі не апраўданы. Даўно наспеў час крычаць: «Ратуйце яе!»

У чалавечым грамадстве і ў прыродзе ўсталявалася і назіраецца такое, што, калі хто-небудзь памірае, яго аплаквае ўся радня; калі на адну з кароў ці авечак нападае воўк, у рух прыходзіць увесь статак, падымаецца моцнае рыканне і бляянне. А тут у чалавечай, прычым у блізкароднаснай, этнічнай супольнасці гіне такі ж, як і ўся яна, славянскі народ — беларусы, і ўсе маўчаць, нібы нічога трагічнага не адбываецца. А мо кожны з славян думае: «Няхай гіне беларус, балазе, што не я?» Пазіцыя памылковая і архінебяспечная, бо, калі ў верхніх эшалонах улады славянскіх краін своечасова не выпрацаваць захадаў па захаванні і развіцці этнакультурных адметнасцяў і перадусім роднай мовы карэннага насельніцтва кожнай з іх, асіміляцыя славянскіх нацый у пра-

цэсе паглыблення інтэграцыі паміж імі, а таксама неславянскімі народамі балесна закране і іншыя складовыя кампаненты гэтай этнічнай супольнасці.

Не я першым выказваю такую асцярогу. Цяпер, мо як ніколі раней, славянская супольнасць народаў разумее пільную неабходнасць умацавання шматгаліновых сяброўскіх сувязяў, у тым ліку і культурных, паміж сабой дзеля ўласнага выжывання, чаму рэальна пагражае масавая культура Захаду англа-сакскага гатунку. Радуе, што, сустракаючыся паміж сабой, славяне размаўляюць на сваіх досыць зразумелых для ўсіх іх родных мовах, і моцна засмучае, што беларусы па даўно навязанаму ім стандарту карыстаюцца чужой, рускай мовай. У такіх выпадках становіцца асабліва шкада скалечаных у моўным развіцці беларускіх дзяцей. Амаль з-за пагалоўнага невалодання роднай мовай яны зносяцца паміж сабой па-руску і сярод славянскіх сяброў выглядаюць нейкімі недаразвітымі, нацыянальна няспелымі ці палітычна непаўнаpraўнымі.

Нашым сучасным палітыкам і інтэлектуалам славянафільскага толку, якія ў атачэнні славян баяцца нават слоўца беларускае прамовіць, парэкамендаваў бы пазнаёміцца з тым, як на моўную праблему гэтай этнічнай супольнасці людзей глядзеў Уладзімір Ленін. «Калі адпадуць усялякія прывілеі, калі спыніцца навязванне адной з моваў, — пісаў ён, — дык усе славяне лёгка і хутка навучацца разумець адзін другога і не будуць палохацца «жудаснай» думкі, што ў агульным парламенце пачуюцца прамовы на розных мовах»[35].

Дзіву даешся, што нашае гаротнае культурна-моўнае становішча не хвалюе ні сам беларускі народ, ні яго ўрад, ні каго-небудзь з славянскіх братоў. Няўжо ўсё беззваротна канула ў Лету, што ніякім спосабам нельга спыніць русіфікацыю беларусаў? Калі не маем уласных сіл, дык, можа, варта было б кагосьці папрасіць дапамагчы беларусам і яго ўладам выцягнуць гэты славянскі народ з асіміляцыйнай багны? Тым больш, што сёй-той з славянскіх лідэраў ужо выказаў такую гатоўнасць, да прыкладу, былы прэзідэнт Чэшскай Рэспублікі Вацлаў Гавел. Супольна з такімі вядомымі чэшскімі палітыкамі і дысідэнтамі, як Ярамір Шчэціна і Карэл Шварцэнберг, намесніца ўпаўнаважанага ў справах правоў чалавека Чэшскай Рэспублікі Ганна Шоботава, дысідэнт Ян Румл і кіраўнік фонду «Чалавек у нядолі» Томаш Пояр, было створана ўвесну 2005 г. у Празе Міжнароднае аб'яднанне «Грамадзянская Беларусь». Перад ім пастаўлена мэта дапамагаць рознага роду беларускім недзяржаўным арганізацыям, сярод многіх з якіх, як вядома, вельмі папулярная ідэя нацыянальна-культурнага адраджэння краіны.

Больш за ўсё непакоіць, што нашай этнічнай праблемы не заўважаюць перш за ўсё суседнія рускія, украінскія і польскія інтэлектуалы як элітарныя прадстаўнікі самых блізкіх нам славянскіх народаў. Гэтыя інтэлектуалы ўжо даўно павінны былі б заявіць сваім уладам, свайму грамадству, што этнічнае сканаnnе беларускай нацыі, у чым сёння не-

[35] Ленін У. І. Творы. Т. 19. С. 324.

малая віна і яе ўласнай дзяржавы, не прынясе карысці аніводнаму славянскаму народу і гэтай этнічнай супольнасці ў цэлым.

Безудзельнасць славянскай супольнасці да беларускай трагедыі наводзіць на самыя розныя думкі, і часцей за ўсё на невясёлыя. Часта думаецца, што пра яе маўчаць толькі з адной-адзінай прычыны: маўляў, вызваліць беларусаў з самадэнацыяналізацыі ўжо не ў стане ніякая сіла. Нават і нячыстая! Што працэс рускай культурна-моўнай асіміляцыі пусціў глыбокія карані ў беларускі арганізм, з'іначыў да непазнавальнасці яго, ніхто не адважыцца адмаўляць, бо гэта добра відаць нават упоцемках. Але ж згадзіцеся, што да сённяшняга дня былі толькі эпізадычныя і вельмі нерашучыя спробы ўладаў і прагрэсіўных колаў грамадскасці лячыць гэты спарахнелы пад уздзеяннем асіміляцыі арганізм. Стан апошняга ўжо даўно дасягнуў той мяжы, што аднымі толькі высілкамі нацыянальна свядомых інтэлігентаў-адзіночак яго нікольві не палепшыш. Каб сёння за стырном беларускай дзяржавы стаялі палітыкі, блізкія тым, якімі некалі лёс узнагародзіў чэхаў, палякаў, балгараў на старце іх нацыянальна-культурнага адраджэння, мы б не нагадвалі сабою асіміляванага мерцвяка, які не выклікае вялікай спагады да сябе нават з боку цывілізаваных народаў, не выключаючы і славянскіх. І ўсё ж хацелася б запэўніць іх, асабліва апошніх, што ў нас яшчэ захавалася, прысутнічае — хоць у самай мінімальнай меры — крытычная маса людскога патэнцыялу для нацыянальна-культурнага адраджэння, толькі ёй усяляк перагароджвае шлях да актыўных дзеянняў сама беларуская дзяржава, якая амаль ва ўсіх зрэзах культурнай палітыкі больш працуе на чужы (рускі), чым нацыянальны (беларускі) інтарэс. Такое не раз здаралася ў гісторыі і іншых народаў, прычым даволі часта ў мінулым стагоддзі. Паколькі беларуская дзяржава не зрабіла сваім крэда нацыянальна-культурнае адраджэнне ўласнага народа, любая форма дапамогі яму з боку славянскай супольнасці крайне пажадана і неабходна.

З-за моцнай эрозіі нацыянальных асноў духоўнага жыцця беларускага народа ў славянскім букеце кветак беларуская не мае належнай уласнай адметнасці, ледзь не цалкам зліваецца з рускай, ад чаго ён (букет) губляе сваю прыгажосць. Беларуская кветка мае вялікую патрэбу ў падсілкаванні, інакш зусім загіне. Лепшым жа сродкам для падсілкавання яе можа быць толькі забеспячэнне прыярытэту беларускай мове ў культурным працэсе. Шкада, што такога не разумеюць ці не хочуць разумець нават многія з тых, хто непасрэдна ўдзельнічае ў гэтым працэсе. Падобная блізарукасць не на карысць беларускай справы. Аднак, хочам мы гэта прызнаць ці не, але, калі ўважліва агледзімся па баках, убачым, што беларускі народ знаходзіцца на стадыі страшэннай этнічнай дэградацыі. З-за прынятых апошнім часам на самым высокім дзяржаўным узроўні памылковых захадаў па рэгуляванні культурна-моўных, адукацыйных працэсаў, адпаведнай афіцыйнай ідэалагічнай апрацоўкі людзей ад роднага слова карэннага насельніцтва краіны ўдалося дадаткова адарваць яшчэ не адну сотню тысяч чалавек. Яшчэ

ніколі ў афіцыйным жыцці дзяржаўная эліта і прыцягнутая ёю да сябе на службу інтэлігенцыя гэтак не ігнаравалі беларускай мовы, як сёння. Добра гэта ці не, з цягам часу павінен зразумець увесь народ. Я ж ужо і сёння не сумняваюся ў тым, што дзяржава і адданыя ёй інтэлектуальныя колы грамадства дапускаюць нічым не апраўданую памылку ў сваім негатыўным стаўленні да нацыянальных асноў духоўнага жыцця карэннага насельніцтва. Іх абыякавасць, а ў шэрагу выпадкаў нават варожасць да галоўнай духоўнай каштоўнасці кожнага народа — мовы забяспечваюць нечуваны да гэтага размах для ажыццяўлення рускай культурнамоўнай асіміляцыі беларусаў, якая ні да чаго іншага не прывядзе гэты славянскі народ, як да канчатковага знікнення з гістарычнай арэны.

Наш знакаміты ідэолаг і актывіст адраджэнскага руху канца XIX — пачатку XX ст. Вацлаў Ластоўскі закончыў выдадзеную ў 1910 г. першую на беларускай мове гістарычную працу «Кароткая гісторыя Беларусі» такімі словамі: «...8-мільённы беларускі народ прачнецца з векавечнага сну і сам пойдзе за культурнай дабычай, сам збудуе сабе лепшую долю і не як загнаны пасынак, але як роўны і родны брат засядзе калісь у сямьі славянскай» (с. 103). Ці здзейсніліся гэтыя словы? Думаю, што не. Бо пра якую роўнасць беларускага народа са славянамі можна гаварыць, калі ў яго краіне ледзь тлее родная мова, няма аніводнай нацыянальнай вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы, родная культура практычна ўжо зведзена да фальклорнага стану. Адкрыта ганьбіцца ўсімі, хто толькі захоча, дзяржаўны суверэнітэт. Зусім заканамерна, што пры такім стаўленні дзяржавы да нацыянальнага фактару ў духоўным жыцці беларусы адстаюць ад усіх славянскіх народаў не толькі ў галіне культуры, але і паводле ўзроўню матэрыяльнага дабрабыту. Любы народ, адарваўшыся ад нацыянальных каранёў, не можа разлічваць на прыстойнае дзяржаўнае, эканамічнае і духоўнае развіццё, немінуча павінен сутыкнуцца з праблемай свайго этнічнага выжывання. Беларусы ў поўнай меры гэта адчуваюць на сабе. І ўжо не першае дзесяцігоддзе. Таму цяжка пагадзіцца са словамі з прамовы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі да кнігі «Мы — беларусы»: «Мы — беларусы, адна з найцудоўнейшых і найдужэйшых галін славянства». Не выкарыстоўваць беларускую мову ва ўсіх відах службовага справаводства, не мець аніводнай нацыянальнай вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы і даваць такі высокі бал беларускаму народу ў славянскім свеце — гэта ўжо занадта далёка ад ісціны.

## 9. ШУКАЛІ АПОРУ ВА ЎСЕСЛАВЯНСКІХ З'ЕЗДАХ І КАНГРЭСАХ

Пасля сфармавання на велізарных прасторах еўрапейскага кантыненту славянскай супольнасці народаў сувязь паміж імі не парывалася ніколі. Усведамленне агульнасці паходжання, блізкасць культур і моваў

спрыяльна адбівалася на ўсталяванні добрых славянскіх узаемадачыненняў. Дзеля іх паглыблення, вырашэння многіх іншых актуальных пытанняў станоўчую ролю адыгралі ўсеславянскія з'езды і кангрэсы. Пачатак такой практыцы быў пакладзены ў самы неспакойны для Еўропы XIX стагоддзя 1848 год. Месцам правядзення форуму стала Прага з яе выключна багатым вопытам змагання супроць культурна-моўнай асіміляцыі ў форме германізацыі. У гэтым прыгожым і гасцінным горадзе славяне з 2 па 12 чэрвеня абмеркавалі цэлы комплекс актуальных, набалелых пытанняў. Прысутных найбольш уразілі, прымусілі сур'ёзна задумацца пастаўленыя выдатным славянскім філолагам і гісторыкам Паўлам Шафарыкам (1795—1861) пытанні: «Ці дакажам, што з поўнай падставай можам гаварыць перад іншымі «Я славянін», ці перастанем быць славянамі?» Задаваць такія пытанні меў падставы вучоны, бо пад той час адбываўся даволі інтэнсіўны працэс этнічнага паглынання рознымі народамі славян, што не мелі сваёй дзяржавы.

Сусветнае значэнне Першага ўсеславянскага з'езда заключалася ў тым, што на ім вельмі рашуча заяўлялася пра неабходнасць нацыянальнага адраджэння ўсіх народаў гэтай шматлікай еўрапейскай этнічнай супольнасці. У прынятым «Маніфесце да народаў Еўропы» выстаўлялася патрабаванне аб стварэнні самастойнай і незалежнай польскай дзяржавы, што пры паспяховым ажыццяўленні магло б у той ці іншай ступені станоўча паўплываць і на лёс беларускага народа, які пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай знаходзіўся па уладай царскай Расіі і не меў аніякіх магчымасцяў для самабытнага нацыянальна-культурнага жыцця. Гэта быў архінеспрыяльны для беларусаў час. Існавала нават забарона афіцыйна ўжываць тэрмін Беларусь. Уся парадаксальнасць такой сітуацыі заключалася ў тым, што дэнацыяналізацыю беларусаў праводзіў урад не якога-небудзь зусім чужога, а блізкароднаснага ім славянскага народа. Пасля распаду Рэчы Паспалітай такога на той час больш нідзе не назіралася са славянамі ў Еўропе, за выключэннем палякаў, украінцаў і беларусаў у Расійскай імперыі. Да справядлівага патрабавання ўдзельнікаў Першага ўсеславянскага з'езда не прыслухаліся ўрады ні Расіі, ні Прусіі, ні Аўстрыі, якія валодалі польскімі этнічнымі землямі.

Невыкананне названага патрабавання ніколькі не зніжае выключнай ролі першай такога высокага рангу ўсеславянскай сустрэчы. Яна дапамагла больш глыбока зразумець праблемы, з якімі даводзілася сутыкацца гэтай этнічнай супольнасці народаў. Самай актуальнай з тых праблем з'яўлялася вызваленне славян з-пад панавання чужых палітычных рэжымаў і стварэнне сваіх уласных дзяржаў, бо разумелі, што толькі ў такіх умовах можна стаць на шырокі, магістральны шлях эканамічнага, сацыяльнага і духоўнага прагрэсу, унікнуць культурна-моўнай асіміляцыі. На той жа час з усіх славянскіх народаў толькі рускі меў магутную, па-сапраўднаму незалежную дзяржаву — Расійскую імперыю. Абсалютная ж бальшыня іх пакутавала пад жорсткім нацыянальным уціскам Турцыі, Прусіі, Аўстрыі, а таксама царскай Расіі.

Перанесці на сваю глебу штосьці карыснае з таго Першага ўсеславянскага з'езда беларусам ніяк не выпадала, бо вельмі павольна аднаўляліся іх сілы пасля задушэння паўстання 1830—1831 гг. Афіцыйныя ідэолагі, праваслаўнае духавенства ўсё рабілі, каб не дапусціць фармавання ў беларусаў погляду на сябе як на самабытны народ, адрозны ад рускага. Пры такім прыгнечаным нацыянальным становішчы ў іх не мелася ніякіх шанцаў трапіць і на першы, і на наступныя ўсеславянскія з'езды. Калі на іх у той ці іншай форме і ўздымалася беларускае пытанне, дык толькі па ініцыятыве кагосьці, а не нашых суродзічаў. А ўздымаць такое пытанне даводзілася, бо, нягледзячы на жорсткую расправу царскіх катаў з удзельнікамі паўстання 1863—1864 гг. пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, нацыянальна-вызваленчы рух беларусаў канчаткова не замёр, і на рубяжы XIX—XX стагоддзяў яны зноў на поўны голас загаварылі пра свае правы. І, што вельмі важна: да руху пачала актыўна далучацца моладзь — будучае кожнай нацыі.

Выдатна разумеючы ролю моладзі ў нацыянальна-культурным адраджэнні, і асабліва яе найбольш адукаванай часткі, прагрэсіўныя колы славянскай супольнасці паставілі перад сабой мэту правесці з'езд студэнтаў славянскіх краін. Адбыўся ён у Празе ў чэрвені 1908 г. У беларускую секцыю ўваходзіла 6 чалавек, а кіравалі ёю А. Уласаў і М. Федароўскі. Удзельнікі гэтага формуму славянскай студэнцкай моладзі аднадушна падтрымалі ініцыятыву беларусаў, выкладзеную у наступных чатырох пунктах: «1) каб усеагульнае навучанне на Беларусі вялося на роднай мове народа; 2) каб у сярэдніх навучальных установах было ўведзена вывучэнне беларускай мовы і гісторыі Беларусі; 3) каб у Вільні (на той час яна выконвала ролю галоўнага асяродку беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння. — *Л. Л.*) быў адкрыты беларускі (г. зн. беларускамоўны. — *Л. Л.*) універсітэт; 4) а пакуль, каб у іншых універсітэтах (Расіі. — *Л. Л.*) былі адкрыты кафедры гісторыі і этнаграфіі для падрыхтоўкі настаўнікаў-беларусаў». Царскія, а пазней — і савецкія ўлады не прыслухаліся да разумнага голасу студэнтаў-славянаў. З горыччу даводзіцца канстатаваць, што і пасёння, ужо ў суверэннай Рэспубліцы Беларусь, не забяспечана ўсеагульнае навучанне дзяцей яе карэннага насельніцтва на роднай мове, адсутнічае універсітэт на нацыянальнай мове выкладання.

Пасля правядзення ў 1910 г. Трэцяга ўсеславянскага з'езда ў Сафіі 36 гадоў не ладзіліся такія форумы. Прычыны зразумелыя: абвастрэнне палітычнай сітуацыі ў Еўропе, развязаная фашысцкай Германіяй Другая сусветная вайна. Затое, як завершылася гэтая самая крывавая ў гісторыі бойка, славяне ў наступным жа годзе наладзілі ў Белградзе досыць прадстаўнічы кангрэс. На яго прыбылі пасланцы ад усіх славянскіх краін Еўропы, а таксама прадстаўнікі гэтай супольнасці з ЗША, Канады, Паўднёвай Амерыкі, Новай Зеландыі і інш.

Сярод удзельнікаў гэтага Усеславянскага кангрэса быў і добра вядомы на Беларусі дзяржаўны і партыйны дзеяч Платон Саевіч, які ў наступным годзе стане міністрам адукацыі. Гэтая паездка вельмі дора-

га каштавала яму: беспадстаўна абвінавацілі ў варожых кантактах у час працы кангрэса з эмігрантам А. Лосем і асудзілі да 25 гадоў папраўча-працоўных лагераў.

Пакідаючы гасцінны Белград, мала хто з удзельнікаў кангрэса мог падумаць, што наступны Пяты ўсеславянскі з'езд (названы нечарговым) адбудзецца (праводзіўся ў Маскве) ажно ў студзені 1992 г. Кіраўнікі славянскіх краін, будучы ўсе пасляваенныя гады з галавой занятыя выкананнем планаў сацыялістычнага будаўніцтва, менш за ўсё думалі, а што ж адбываецца ў нацыянальна-культурным жыцці гэтай этнічнай супольнасці народаў. А адбывалася тое, што не павінна было мець месца: ва ўсіх поліэтнічных славянскіх краінах нечувана небяспечны характар набыла культурна-моўная асіміляцыя. Абмінала яна толькі галоўныя нацыі поліэтнічных краін. У самым жаласным стане ў СССР апынуліся беларускі і ўкраінскі народы. Таму іх нацыянальна свядомыя колы ўспрынялі распад СССР як адзіны магчымы надзейны паратунак ад рускай культурна-моўнай асіміляцыі. Распад СССР выклікаў падобныя працэсы і ў іншых поліэтнічных славянскіх краінах. У такой сітуацыі нельга было не пайсці на скліканне Пятага ўсеславянскага з'езда, каб прадухіліць узнікненне непажаданых з'яў ва ўзаемадачыненнях славян.

Распад славянскіх поліэтнічных краін і ўтварэнне незалежных нацыянальных дзяржаў, зразумела, парадзіла для іх нямала складаных праблем унутранага і вонкавага характару. Дзеля іх паспяховага развязвання нельга было не выкарыстоўваць і практыкі ўсеславянскіх форумаў. На гэты раз ужо чарговы Шосты сусветны кангрэс славян адбыўся без вялікага часавага разрыву. Месцам іх сустрэчы ў снежні 1997 г. стала сталіца Рэспублікі Беларусь — Мінск. Многія ўдзельнікі кангрэса прыйшлі ў сапраўдны жах ад велізарнай ступені дэфармацыі нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў і засталіся вельмі расчараванымі, паколькі не пачулі ад кіраўнікоў краіны, што яны збіраюцца рабіць у бліжэйшы час па выратаванні свайго тытульнага народа ад этнічнай дэградацыі. А не пачулі таму, што самі гэтыя кіраўнікі, будучы моцна зрусіфікаванымі, іншага жыцця ні для сябе, ні для свайго народа не ўяўлялі, як, без аглядкі назад, ісці далей па добра ўезджаным шляху рускай культурна-моўнай асіміляцыі.

Не праяўляючы належных клопатаў да карэнных нацыянальных інтарэсаў уласнага народа, дзяржаўныя дзеячы Беларусі, аднак, не супраць заняць вядучыя пазіцыі па ўладкаванні нялёгкага жыцця славянскай этнічнай супольнасці, хаця для гэтага перш за ўсё неабходна належным чынам упарадкаваць яго ў сваёй краіне, бо як жа тады стаць узорам для астатніх. Беларусі з яе страшэнна размытым нацыянальным патэнцыялам духоўнага жыцця ой як далёка нават да самай мінімальнай дасканаласці.

На шчасце, дзяржаўныя і культурныя дзеячы славянскіх краін высока цанілі і цэняць нацыянальна-духоўную спецыфіку кожнай з іх, што, думаецца, рана ці позна стане непахісным правілам і для Беларусі. Калі

б на гэтае лёсавызначальнае пытанне нашыя браты-славяне глядзелі інакш, не далі б навуковай канферэнцыі, што праходзіла 23 мая 1998 г. у Яраслаўлі, такую назву: «Славянскі свет: супольнасць і разнастайнасць» (падкрэслена мною. — *Л. Л.*). Апошнюю, як вядома, складаюць нацыянальная культура і родная мова кожнага з славянскіх народаў. Абсалютная бальшыня беларусаў, якая з прычыны чатырохсотгадовай антынацыянальнай дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры і мовы на іх тэрыторыі моцна адарвалася ад сваіх родных і прымкнула да іншых духоўных каштоўнасцяў, практычна не ў стане хоць штосьці зрабіць для ўзбагачэння славянскай разнастайнасці. Між іншым, з прамовай на гэтай канферэнцыі выступіў і прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, назваўшы беларускую культуру «састаўной часткай славянскай, сусветнай і агульначалавечай культуры». Паколькі, мяркую, гэта не проста лозунгавыя словы, дык нарэшце ж трэба ўсяляк развіваць, умацоўваць нацыянальны патэнцыял беларускай культуры, асяродкам якога ў першую чаргу можа быць не якая-небудзь, а толькі беларуская мова. Калі мы заменім яе рускай ці якімі-небудзь іншымі мовамі, дык на сваёй зямлі будзем ствараць і адпаведныя ім культуры. Усе песні, што з'явіліся і з'яўляюцца ў велізарнай колькасці ў нас на рускамоўныя тэксты, не могуць успрымацца як беларускі нацыянальны мелас. Тое ж можна сказаць і пра рускамоўную літаратуру Беларусі.

А як многа разумнага сэнсу закладзена ў наступныя словы беларускага прэзідэнта: «**Мы павінны бачыць нашыя народы, нашу будучыню ў аспекце адзінства і шматстайнасці, бо наша супольнасць не азначае тоеснасці**.

Менавіта ўнутраная шматстайнасць робіць нас жыццястойкімі, здольнымі да развіцця і дазволіць нашай цывілізацыі дасягнуць, што называецца, «квітнеючай складанасці». У якасці найважнейшых задач, што належыць вырашыць у гэтым плане, А. Лукашэнка вызначыў «захаваць нашую духоўнасць, лад жыцця, культуру, традыцыі»[36] . Усё гэта, зразумела, не стане жаданай рэальнасцю, калі ў нашай духоўнай сферы паранейшаму на сірочым становішчы будзе знаходзіцца беларуская мова, калі як след не падмацуем сваім прыродным матэрыялам дэградзіраваны нацыянальны грунт культуры карэннага насельніцтва краіны.

Як ніколі старанна рыхтавалася афіцыйная Беларусь да ўдзелу ў запланаваным на 2—5 чэрвеня 1998 г. у Празе Сёмым усеславянскім з'ездзе. Праводзіўся ён з нагоды 150-годдзя Першага ўсеславянскага з'езда, які таксама ладзіўся ў гэтым горадзе. Зыходзячы са шматгадовай практыкі правядзення славянскімі краінамі такіх буйнамаштабных мерапрыемстваў, выключным правам удзелу ў іх не можа карыстацца толькі частка грамадства якой-небудзь адной арыентацыі, скажам, афіцыйнай, інакш не будуць улічаны яго інтарэсы ў цэлым. Уладныя структуры нашай краіны яшчэ задоўга да адкрыцця з'езда ўсяляк ігнаравалі такое законнае патрабаванне. У выніку прадстаўнікі той часткі палітычнай

[36] Славянский набат. 1998. 4—10 июня.

каў і інтэлігенцыі, што актыўна выступалі за дзяржаўны суверэнітэт, захаванне і развіццё беларускай нацыянальнай культуры, не змаглі трапіць на пасяджэнне Міжнароднага аргкамітэта па падрыхтоўцы Сёмага ўсеславянскага з'езда. З гэтай нагоды на працягу 21—22 лютага 1998 г. у Празе знаходзіліся толькі асобы ад улады: два дэпутаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валерый Драко і Сяргей Касцян, журналістка афіцыйных сродкаў масавай інфармацыі Ніна Чайка.

Пакрыўджаным дэмакратычным сілам нічога не заставалася, як толькі спадзявацца, што такой несправядлівасці не дапусцяць пры камплектаванні складу каманды на сам з'езд у Празе. Сюды з'ехаліся прадстаўнікі 16 славянскіх народаў з 12 славянскіх краін свету. Усяго ж на гэты форум прыбыло каля 500 чалавек. З Беларусі гэта дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ Сяргей Касцян (узначальваў дэлегацыю), член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу РБ Мікалай Яроменка, дэпутаты Валерый Драко і Мікалай Валжанкоў, намеснік загадчыка аддзела Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ Уладзімір Белазор, галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя» Генадзь Пашкоў, галоўны рэдактар газеты «Знамя юности» Ігар Гуткоўскі, радыёжурналістка Ніна Чайка. Карацей кажучы, асобы, якія належалі і працавалі на дзяржаўную ўладу. Мне ні разу не даводзілася раней пачуць ці прачытаць, каб хто-небудзь з іх выказаў свой боль за трагічны стан беларускай мовы, страшэнную дэградацыю нацыянальных асноў духоўнага жыцця нашага краю, таму зразумела, чаму ніхто з іх не збіраўся і не выступіў з такімі пытаннямі на з'ездзе, каб пра гэта расказаць яго ўдзельнікам, папрасіць парады, а мо і дапамогі па выратаванні ад франтальнай асіміляцыі аднаго з самых старажытных славянскіх народаў з яго адметнай гісторыяй і самабытнай культурай.

Чыноўніцкі апарат Беларусі і на гэты раз зрабіў усё, каб не дапусціць удзелу ў працы юбілейнага Сёмага ўсеславянскага з'езда апазіцыйных сіл, што не пайшло на карысць нашаму нацыянальнаму інтарэсу. Прыезд жа на Усеславянскі з'езд прадстаўнікоў з Беларусі ад неафіцыйных структур стаўся б вельмі лагічным яшчэ і таму, што ўрад Чэхіі не надаваў гэтаму форуму пры ўсёй яго важнасці дзяржаўнага характару. У ім, верагодна, маглі быць зацікаўлены толькі прадстаўнікі ад Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь. Ігнараванне дзяржавай апазіцыйных сіл прывяло да таго, што ўдзельнікі гэтага форуму не атрымалі поўнай, аб'ектыўнай інфармацыі пра стан нашага нацыянальна-культурнага жыцця, прычыны яго нечуванай эрозіі. А шкада, бо, атрымаўшы, яны, несумненна, маглі б даць каштоўныя парады па пераадоленні ўсяго таго, што перашкаджае беларускаму народу развівацца паводле сваіх гістарычных, культурна-моўных традыцый, заставацца самім сабой, а не з'яўляцца няўдалым адбіткам якой-небудзь іншай этнічнай супольнасці.

Калі б сярод прадстаўнікоў ад Беларусі на Сёмым усеславянскім з'ездзе прысутнічалі і апазіцыйныя да яе афіцыйнай палітыкі асобы, наша дэлегацыя пры абмеркаванні праблемы сучаснага стану культуры славянскай супольнасці не абмежавалася б толькі выказваннямі мерка-

ванняў пра яе генацыд з боку заходніх дзяржаў, а пастаралася б прывесці і нямала неабвержных фактаў культурна-моўнай дыскрымінацыі тытульнай нацыі нашай краіны, віну за што нясуць і яе ўладныя структуры. Вядома, што сярод дэлегатаў з'езда распаўсюджваўся падпісны ліст «У падтрымку дагавора аб яднанні Расіі, Беларусі, Украіны». А вось нашыя адраджэнцы, напэўна, маглі б пусціць па руках дэлегатаў з'езда і такі падпісны ліст — «Аб паглыбленні працэсаў русіфікацыі ў сучаснай Беларусі» з тым, каб выратаваць яе карэннае насельніцтва ад канчатковай асіміляцыі. Час і дзяржаўным асобам і інтэлігенцыі зразумець, што зараз развязванне гэтай праблемы для нас куды больш надзённа і актуальна, чым аб'яднанне з Расіяй і Украінай. У пытаннях яднання мы ў сотні разоў больш робім намаганняў і дасягнулі ў сотні разоў большага поспеху, чым у ліквідацыі прычын, што разбураюць нашую нацыянальную культуру, вядуць да скону беларускую мову. Дайшло да таго, што нават асобы, якія прафесійна занятыя ў сферы культуры, не ў стане выказваць свае думкі па-беларуску. Яшчэ ў большай ступені такая моўная непісьменнасць, такі моўны нігілізм назіраюцца сярод усіх рангаў службоўцаў. Пасля некальківяковай дэградацыі духоўнага патэнцыялу беларускага народа вярнуць яго да прыстойнага нацыянальнага жыцця ў дзесяткі разоў больш складана, чым стварэнне любых формаў міждзяржаўных аб'яднанняў. Сусветны вопыт паказвае, што за стварэнне апошніх народы бяруцца толькі пасля таго, як належным чынам вырашаць унутрыкраінныя пытанні. Ці не з таго краю мы заходзім? Ці не ставім воз паперадзе каня? Сёння дзесяткі краін зямной кулі знаходзяцца па-за міждзяржаўнымі аб'яднаннямі і няблага жывуць, падтрымліваюць самыя цесныя эканамічныя, палітычныя і культурныя сувязі з мноствам іншых народаў.

Я цалкам падзяляю выказаную на Сёмым усеславянскім з'ездзе намеснікам старшыні Камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Сяргеем Касцянам трывогу, што і зараз робяцца спробы «каланізаваць славянскія народы духоўна» (падкрэслена мною. — *Л. Л.*), існуе пагроза «знікнення славянскіх народаў як адной з найстаражытных цывілізацый нашай планеты»[37]. І падзяляю гэтую трывогу таму, што найпершым з славянскіх народаў знікне, калі не зрабіць рашучых, тэрміновых захадаў з боку дзяржавы, беларускі народ, бо, у адрозненне ад усіх сваіх братоў-славян, толькі ён адзін не забяспечвае фактычна дзяржаўнага статусу сваёй роднай мове, не будуе на ёй дзейнасць гарадскіх агульнаадукацыйных школ, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, не чуе яе з вуснаў апаратчыкаў дзяржаўных органаў улады і кіравання, кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў, прадпрыемстваў і арганізацый, з экранаў кінатэатраў, сцэнаў шэрагу драматычных тэатраў. Вельмі рэдка даносіцца да яго роднае слова ў час радыё- і тэлеперадач. У такіх крайне экстрэмальных, пячорных умовах адсутнічаюць усялякія надзеі на беларускае нацыянальнае Адраджэнне. Культурна-моўны

[37] Славянский набат. 1998. 18—24 июня.

СНІД бязлітасна выядае нутро беларускай нацыі, чаго, аднак, упарта не хочуць заўважаць яго многія дзяржаўныя дзеячы, большая частка інтэлігенцыі. Не заўтра, а ўжо сёння трэба кінуць усе творчыя сілы народа на пераўтварэнне беларускай культурна-моўнай пустыні ва ўрадлівы палетак і засяваць яго не чужым, а сваім нацыянальным насеннем, як гэта практыкуюць усе цывілізаваныя краіны.

Як і на ўсіх папярэдніх усеславянскіх з'ездах і кангрэсах, і гэтым разам быў прыняты шэраг заключаных дакументаў. Сярод якіх найбольш важны — Маніфест Сёмага ўсеславянскага з'езда. Ён заканчваецца словамі: «Няхай XXI стагоддзе стане для ўсяго чалавецтва стагоддзем міру і прыстойнага існавання». Гэтаму ніяк нельга запярэчыць. Але давайце не будзем забывацца, што такога можна дасягнуць не толькі на аснове буйных палітычных і эканамічных здзяйсненняў. Ад нашых высокіх кіраўнікоў запатрабуецца яшчэ і паставіць жыццё беларусаў на трывалы нацыянальны грунт, што магчыма толькі пасля адраджэння, набыцця іх мовай не паяровага, а рэальнага статусу дзяржаўнай.

Афіцыйнай накіраванасці частку насельніцтва нашай краіны не магло не радаваць, што на з'ездзе ў Празе ганаровым прэзідэнтам Міжнароднага славянскага камітэта абралі прэзідэнта РБ Аляксандра Лукашэнку, што Беларусь назвалі флагманам інтэграцыйных працэсаў у славянскім свеце. Як па мне, дык куды лепш было б, каб яе прызналі перадавой сярод славянскіх краін па шанаванні і развіцці нацыянальнай культуры і мовы, бо толькі гэты фактар захавае за нашым народам самабытнасць і адметнасць, зробіць яго здольным узбагачаць сваімі культурнымі здабыткамі духоўны патэнцыял сусветнай цывілізацыі, не дасць бясследна растварыцца ў бязмежным акіяне культур планеты Зямля.

Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі досыць шырока асвятлялі ўдзел беларускай дэлегацыі ў працы Сёмага ўсеславянскага з'езда, давалі яму вельмі высокую адзнаку, усяляк стараліся апраўдаць адсутнасць на ім кагосьці з прадстаўнікоў ад апазіцыйных колаў нашага грамадства. Так, у інтэрв'ю газеце «Славянский набат» (11—17 чэрвеня 1998 г.) удзельнік гэтага з'езда галоўны рэдактар «Беларускай энцыклапедыі» беларускі паэт Генадзь Пашкоў як станоўчае адзначыў, што наша дэлегацыя складалася толькі з аднадумцаў. Як гэтыя аднадумцы глядзяць на сучасную нацыянальна-моўную сітуацыю ў краіне, добра вядома. Значыцца, братам-славянам сапраўднага малюнка яны не раскрылі. Дык што ж тут станоўчага ў такім аднадумстве? Вядома, нічога. Непараўнальна лепш было б, калі б сярод дэлегатаў прысутнічалі і асобы з дыяметральна працілеглымі ад афіцыйных поглядамі на стан культурна-моўнай сітуацыі ў краіне. Парадаксальна, што і само інтэрв'ю газеце «Славянский набат» пададзена на рускай мове (бралі ж яго ў беларускага пісьменніка!), што не дае падставаў гаварыць пра сімпатыю дадзенага перыядычнага органа да беларускага слова, а адсюль і да праблемы беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння ўвогуле. Словам, зроблена не ў славянскім духу.

Пры усёй важнасці Сёмага ўсеславянскага з'езда ў Празе ён не стаў той з'явай, на якую разлічваў маскоўскі пісьменнік Мікалай Кікешаў:

«...пакласці пачатак новай гісторыі славянскага свету, вызначыць, як аб'яднаць славянскія дзяржавы у адно непадзельнае вялікае палітычнае цела (падкрэслена мною. — *Л. Л.*), пра што здаўна мараць славяне (занадта ўжо катэгарычна! — *Л. Л.*) ... народы згодны жыць адной вялікай сям'ёй, без дзяржаўных межаў і мытняў...»[38] У XX ст. распалася столькі імперый і розных міждзяржаўных аб'яднанняў, што цяжка паверыць у рэальнасць жадання славян на аб'яднанне ў нейкае «адно непадзельнае вялікае палітычнае цела». І, тым не менш, у Расіі ёсць такія інтэгратары, якія з гісторыі ведаюць пра выключную ролю іх краіны ў заваяванні славянамі палітычнага суверэнітэту, не губляюць надзеі, што рана ці позна яна стане на чале аб'яднаўчых працэсаў сярод народаў гэтай этнічнай супольнасці. Калі ў 1867 г. у Маскве адбывалася прадстаўнічая сустрэча славян, яе ўдзельнік серб доктар Політ назваў гэты рускі горад мацерай усеславянскай, ядром славянства. Пажадана, каб і сёння Масква, ведучы такую карпатлівую, нялёгкую працу па паглыбленні славянскага братэрства, максімальна ўлічвала нацыянальныя інтарэсы кожнага з яго членаў, пільна сачыла, каб шматвектарнае збліжэнне славянскіх народаў не вяло да страты кім-небудзь з іх сваёй дзяржаўнай незалежнасці, культурна-моўнай адметнасці. Без поўнага дзяржаўнага суверэнітэту ніводнаму славянскаму народу не ўдасца стварыць сабе прыстойнага эканамічнага і духоўнага жыцця. Па віне палітыкаў, а часта нават культурных дзеячоў, з аблічча зямлі ў выніку культурна-моўнай асіміляцыі знікла нямала славянскіх народаў з іх адметнай, непаўторнай культурай. Далей такой страты ніяк нельга дапусціць, бо сённяшнія народы гэтай адной з самых магутных у свеце этнічных супольнасцяў маюць яшчэ больш багаты і разнастайны духоўны патэнцыял. Вымыванне з яго любой культуры і мовы негатыўна адаб'ецца на агульным стане славянскай сям'і народаў. Таму кожны раз, ідучы на ўзмацненне ў ёй працэсаў эканамічнай, палітычнай і культурнай інтэграцыі, трэба грунтоўна і ўсебакова прааналізаваць, якія гэта будзе мець канчатковыя вынікі, ці не падпадуць славянскія культуры і мовы пад прэс асіміляцыі. Пры гэтым асаблівай увагі патрабуюць да сябе беларусы, бо з усіх славянскіх народаў ніхто так, як яны, не адступіў у выніку дзяржаўнай палітыкі русіфікацыі ад сваіх нацыянальна-культурных традыцый.

Ужо даўно наспеў час разгледзець на сустрэчы славян трагічны стан культурна-моўнага жыцця Беларусі, бо яе так добра зрусіфікаваны дзяржаўны чыноўніцкі апарат наўрад ці калі-небудзь выкажа заклапочанасць. Шкада, што гэтую праблему не закранулі і на чарговым Восьмым усеславянскім з'ездзе, які праходзіў 2—4 красавіка 2001 г. у Маскве. А на ім жа ад Беларусі прысутнічала 24 дэлегаты! Ізноў-такі толькі адны прадстаўнікі ад улады. На гэтым з'ездзе Аляксандра Лукашэнку паўторна абралі за старшыню Міжславянскага камітэта.

---

[38] Славянский набат. 1998. 4—10 июня.

## 10. ЗАХАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ ПРЫСУТНАСЦІ Ў СЛАВЯНСКІМ СВЕЦЕ — ПРАМЫ АБАВЯЗАК ДЗЯРЖАВЫ

Падзеі апошняга часу не пакідаюць аніякіх сумненняў у тым, што выратаваць ад асіміляцыі, дапамагчы беларускаму народу вярнуцца да сваіх прыродных асноў можа толькі ў поўным сэнсе слова суверэнная ва ўсіх дачыненнях, у т. л. і культурна-моўных, дзяржава. Гэта ж нечуваны ў цывілізаваным свеце нонсэнс, што ў пераважнай большасці афіцыйныя службовыя пасады, непасрэдна звязаныя з нацыянальнай культурай, мовай беларускага народа, займаюць асобы, якія не толькі не з'яўляюцца іх носьбітамі, а нават ігнаруюць гэты найкаштоўны дар нашай Бацькаўшчыны. У катэгорыю такіх пасад я ўключаю не толькі тыя, што маюцца ў штатах рэспубліканскіх, абласных, раённых (гарадскіх) органаў народнай адукацыі, культуры, навукі, але і падначаленых ім устаноў і арганізацый. Недаравальна, каб і асобы, што свядома трымаюць сябе па-за беларускай культурай і мовай, займалі пасады намеснікаў раённых (гарадскіх), абласных і рэспубліканскіх органаў улады па пытаннях культуры і адукацыі. Сказанае не можа не датычыць і старшынь сельскіх, раённых (гарадскіх), абласных выканаўчых камітэтаў. Паколькі выратаванне беларускага народа ад культурна-моўнага вымірання павінна быць асноўнай функцыяй яго дзяржавы, усе вышэйпералічаныя пасады трэба ўкамплектаваць асобамі, якія шчыра жадаюць і прафесійна здольны развязаць гэтае пытанне. Тым жа, хто збіраецца працаваць у старым рэчышчы, г. зн. далей садзейнічаць скочванню беларускага народа ў асіміляцыйную багну, я рэкамендаваў бы дзеля яго інтарэсаў, інтарэсаў усёй славянскай супольнасці добраахвотна адмовіцца, як такое робіцца ў цывілізаваным свеце, ад займаемай пасады, бо гэта ж вялікі грэх — працаваць у галіне беларускай адукацыі, культуры і навукі, не прызнаючы, пагарджаючы іх нацыянальнымі асновамі. Адышоўшы ад скіраванай на культурна-моўную асіміляцыю беларусаў прафесійнай дзейнасці, такія службоўцы хоць часткова змыюць свае грахі перад Бацькаўшчынай і мо не адчуюць такой вялікай трагедыі ад таго, што склалі з сябе паўнамоцтвы чыноўніка. Асабіста мне па адміністрацыйнай лініі ніколі не ўдавалася падняцца вышэй за класнага кіраўніка агульнаадукацыйнай школы, і я за гэта ніколькі не пакрыўджаны на свой лёс. Можна шчасліва сцвердзіцца як творчая асоба і па-за высокай прэстыжнай адміністрацыйнай пасадай. Страта яе — нішто ў параўнанні з выратаваннем карэннага насельніцтва Беларусі ад канчатковай дэнацыяналізацыі, якая мае такую вялікую падтрымку ад чыноўнікаў дзяржаўнага апарату.

У наш час, калі пакуль што адсутнічае навукова распрацаваная Дзяржаўная праграма нацыянальна-культурнага Адраджэння, вельмі важна не дапускаць, каб сфармаваныя ў краіне і без таго нерацыянальныя суадносіны паміж беларускай і рускай культурамі і надалей мяняліся на

карысць апошняй, пазіцыі якой і так зараз невымерна трывалыя. Палітыкі, скіраванай на карысць беларускай культуры, ніхто ў нас не праводзіць. І дарэмна, бо становішча беларускай нацыянальнай культуры працягвае істотна пагаршацца ў выніку яе канкурэнцыі з рускай. Калі б мы па-сур'ёзнаму былі заклапочаны духоўным росквітам свайго народа, нам, думаецца, зусім не патрэбна было б выданне на Беларусі рускамоўнага часопіса «Всемирная литература» (першы нумар з'явіўся на свет у студзені 1997 г.), без якога і так нацыянальны рынак забіты рускай перыёдыкай. А вось выданне адпаведнага літаратурна-мастацкага часопіса, у якім на беларускай мове друкаваліся б і творы ўсіх славянскіх народаў, надта спатрэбілася б. Гэта ў належнай ступені падтрымала б прэстыжнасць нашага роднага слова не толькі ў славянскім свеце, але і сярод саміх беларусаў. Нельга забывацца і на такую акалічнасць: цяпер з лёгкай рукі дзяржаўнай улады Беларусі такі размах набыла русіфікацыя, што неўзабаве на ўвесь рост можа паўстаць пытанне аб забеспячэнні існавання хоць аднаго беларускамоўнага літаратурна-мастацкага часопіса. Дзякаваць Богу, сёння такі від перыёдыкі яшчэ ёсць, хаця мала які з мастацкіх часопісаў можа пахваліцца сваім накладам. Адарваныя ад роднай мовы чытачы аддаюць перавагу рускім часопісам і газетам. Наяўнасць на Беларусі ў такіх архінеспрыяльных умовах на яе нацыянальнай мове часопіса «Сусветная літаратура» дазволіла б хоць з вялікімі перабоямі, але ўсё ж такі трохі лепш дыхаць яе роднаму слову.

Жыццё ў беларускай дзяржаве, нават калі яна стане сапраўды нацыянальнай, суверэннай, я не ўяўляю адгароджаным кітайскім мурам ад цывілізаванага свету, і тым больш славянскіх краін. Пры ўсіх бясспрэчных перавагах жыцця ў суверэннай дзяржаве народы заўжды імкнуліся і будуць імкнуцца да ўсталявання ўсебаковых эканамічных і культурных, кантактаў з іншымі краінамі. Часцей за ўсё ў якасці такіх партнёраў падбіраюцца суседнія ці з якімі ёсць штосьці агульнае, блізкае ў этнакультурным плане. Таму народы, акрамя падзелу на нацыі, яшчэ разбіваюцца на больш буйныя транснацыянальныя этнічныя супольнасці людзей, да адной з якіх адносяцца і славяне. Сваю гістарычную тэрыторыю яны маюць толькі ў Еўропе. Прычым іх няма толькі ў яе самай крайняй заходняй частцы. У гісторыі не раз здаралася, што ў часы жорсткіх выпрабаванняў славяне незалежна ад тэрыторыі пражывання выступалі як адзіная сіла. І сёння такая тэндэнцыя з'яўляецца пануючай у іх дзеяннях і ўчынках, хаця дзе-нідзе назіраюцца і пэўнага роду непаразуменні, што зусім пазбежна нават унутры кожнай паасобнай нацыі паміж яе грамадскімі групамі.

У нас больш прынята пісаць і гаварыць пра адзінства, супольнасць, сяброўства славянскіх народаў, чым спрабаваць знайсці ў іх узаемадачыненнях нейкія там нацягнутасці, а тым больш канфліктныя сітуацыі. А ўсё гэта, на вялікі жаль, было і прыносіла сур'ёзныя непрыемнасці славянскай супольнасці. Здаралася ж такое найчасцей тады, калі хтосьці з яе складнікаў імкнуўся ў моц сваёй вялікай колькасці ці іншых факта-

раў узяць на сябе ролю першага і дыктаваць сваю волю астатнім. Парушэнне прынцыпу роўнасці назіралася ў час існавання такіх плыняў, як славянафільства, панславізм. І вельмі добра, што ў іх увесь час былі салідныя апаненты, прычым і з боку рускіх грамадска-палітычных дзеячаў і навукоўцаў. Таму і сёння мы не павінны баяцца смела і адкрыта заявіць народу, дзе і ў чым намі дапушчаны самыя істотныя памылкі ва ўрэгуляванні беларуска-рускіх культурна-моўных працэсаў, і ўсёй грамадой зрабіць так, каб на гэтай глебе не ўзнікалі зусім не патрэбныя супярэчнасці паміж двума блізкароднаснымі народамі славянскай супольнасці. Не думаю, што яна, і найперш самі шчыра рускія, інтэлігентныя людзі, праявяць абыякавасць, безудзельнасць да сучаснай нацыянальнай трагедыі беларускага народа, выкліканай празмерным панаваннем рускага фактару ў яго духоўным жыцці. Не заўважаюць жа яе людзі хутчэй за ўсё з прычыны сваёй ледзь не да канца завершанай асіміляцыі, бязмернага нацыянальнага нігілізму.

У выніку працяглай палітыкі русіфікацыі беларускі народ да такой ступені адарваўся ад роднай культуры і мовы, што яго ледзь не ва ўсім свеце атаясамліваюць з рускімі. Аднак гэта мала хвалюе сучасны ўрад Рэспублікі Беларусь, бо ў такім атаясамліванні ён бачыць найважнейшае абгрунтаванне свайго курсу на поўную палітычную інтэграцыю яе ў Расійскую Федэрацыю. Толькі забеспячэннем нацыянальнай культуры і мове беларусаў пануючай ролі ў грамадстве нам удасца захаваць, узняць на належны ўзровень іх этнакультурную адметнасць і нацыянальную самасвядомасць, што не дазволіць ніякім палітыкам гандляваць і беларускай дзяржаўнасцю. Калі, крый Божа, мы яе страцім, у нас не застаецца аніякіх надзей на поспех у нацыянальна-культурным адраджэнні, бо ў беларускі арганізм вельмі глыбока зайшла, пусціла магутныя шыроказразгалінаваныя карані русіфікацыя, што зрабіла яго маладольным да актыўнай нацыянальнай творчай дзейнасці.

Пры такім характэрным для сённяшняга нашага дня татальным панаванні рускага фактару ў прафесійных пластах культуры, рускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця не ўяўляецца магчымым спыніць далейшую крайне небяспечную этнакультурную дэфармацыю беларускага народа без апоры на дзяржаўныя ўлады. У яго да такой ступені адкралі прыродную адметнасць і навучылі жыць па-руску, што для многіх зусім лагічным падаюцца абыякавасць урада Беларусі да сапраўднай дзяржаўнай самастойнасці і проста нястрымная цяга да палітычнага ўступлення ледзь не на любых умовах у склад Расійскай Федэрацыі. Панесеныя беларускім народам велізарныя страты ў сваёй культурна-моўнай адметнасці ёсць галоўная прычына, чаму многа дзе ў свеце гэтую краіну з такімі сур'ёзнымі агаворкамі называюць па імені яе карэннага насельніцтва — Беларуссю, адмаўляюць наяўнасць у яе фактычнага статусу палітычна незалежнай дзяржавы. Такіх праблем не існавала б, калі б яе народ жыў сваёй нацыянальнай культурай і мовай, быў сапраўдным вяршыцелем уласнага палітычнага лёсу.

Забяспечваць на належным узроўні самабытнасць кожнай нацыі — гэта не толькі найвялікшае майстэрства, але і найгалоўнейшы абавязак яе палітыкаў і элітарных колаў. Апошні ў найбольшай ступені датычыць такіх катэгорый людзей нашай краіны. Не будзем забывацца, што, акрамя працяглага панавання тут варожых ёй палітычных рэжымаў з яскрава выяўленым асімілятарскім курсам, многія беды ў нашым этнакультурным жыцці ёсць яшчэ і вынік таго, што беларусы ніколі не адносіліся да катэгорыі эгацэнтрычных народаў. А такіх жа на планеце Зямля было і захавалася нямала. Да іх належаць не толькі смелыя, ваяўнічыя этнасы, але і тыя, што свядома, на дзяржаўным узроўні не дапускалі панавання на сваёй зямлі чужых культур і моваў, ведаючы, што з цягам часу людзі могуць так звыкнуцца з апошнімі, што пачнуць ставіць іх вышэй за родную культуру і мову. У нас жа ўсё атрымлівалася зусім не так, як у эгацэнтрычных народаў: спачатку не знайшлося моцы даць належнага адпору гвалтоўнаму ўкараненню польскай, а затым і рускай культуры і мове, і таму не ўхіліліся ні ад паланізацыі, ні ад русіфікацыі і зараз знаходзімся на мяжы этнічнага вымірання. Нават пры самым вялікім жаданні палітыкаў, інтэлігенцыі павярнуць такі нацыянальна абяссілены народ да сваіх культурна-моўных стандартаў гэта сталася б зусім нялёгкай справай. Мо таму ўладныя структуры і не бяруцца за вырашэнне яе. Яны вельмі добра ўкамплектавалі зверху данізу апараты міністэрстваў культуры, народнай адукацыі, установы афіцыйных сродкаў масавай інфармацыі цвёрдай рускай арыентацыі людзьмі, ад якіх апошнім часам толькі зрэдку пачуеш беларускае слова. Па прыкладзе першай дзяржаўнай асобы ўвесь шматлікі чыноўніцкі апарат органаў улады і кіравання не лічыцца з умовамі майскага рэферэндуму 1995 г., якім у краіне ўводзілася афіцыйнае двухмоўе, хаця пасля ўсталявання нацыянальнай незалежнасці ў ім (двухмоўі) не было аніякай патрэбы. Беларусь з адным тытульным народам павінна мець толькі адну дзяржаўную мову — беларускую! Іншы падыход да развязвання гэтай лёсавызначальнай праблемы будзе толькі пярэчыць беларускаму нацыянальнаму інтарэсу.

Нават самым таленавітым палітыкам свету не ўдалося, абапіраючыся на дзве мовы, дасягнуць неабходнай нацыянальнай кансалідацыі таго ці іншага народа. Афіцыйнае двухмоўе заўжды выступала і будзе выступаць у ролі дэтанатара спакойнага нацыянальнага жыцця. Прыкладаў у пацверджанне сказанаму ёсць нямала і ў нас на Беларусі. Прычым ахвярамі на моўнай глебе з'яўляюцца толькі тыя, хто карыстаецца роднай мовай, бо яе гучанне ў грамадскіх месцах ізноў стала з'явай даволі рэдкай, часта выклікае негатыўную рэакцыю ў дрэнна выхаваных людзей ці хворых на нацыянальны нігілізм. Здараліся нават выпадкі фізічнай расправы са свядомымі носьбітамі беларускай мовы. У вялікім падазрэнні яны заўсёды ў праваахоўчых органаў.

Сваё зусім заканамернае, асабліва ў наш час, жаданне авалодаць іншымі мовамі грамадзяне могуць беспераешкодна задавальняць і ў варунках афіцыйнага адзінамоўя, прыкладам чаму служаць усе ўнітарныя дзяржавы цывілізаванага свету. Прычым нават і ў іх далёка не для

ўсіх грамадзян існуе патрэба ведаць дзве мовы, бо гэта не так проста і для краін, насельніцтва якіх падтрымлівае шырокамаштабныя міжнародныя эканамічныя, палітычныя, культурныя і іншыя сувязі.

Моцна памыляюцца многія нашыя палітыкі і прадстаўнікі інтэлігенцыі, разлічваючы, што франтальным выключэннем беларускай мовы з усіх сфераў грамадскага жыцця яны толькі садзейнічаюць умацаванню саюза Беларусі з Расіяй, паглыбленню адзінства славянскіх народаў. Дзеля дасягнення гэтых мэтаў існуюць зусім іншыя па-сапраўднаму цывілізаваныя сродкі і метады.

Не жадаючы штосьці канкрэтнае рабіць дзеля выратавання беларускага народа ад рускай культурна-моўнай асіміляцыі і каб перад цывілізаваным светам хоць трохі апраўдаць сваю бяздзейнасць, нашыя палітыкі і адданыя ім пласты інтэлігенцыі замест развязвання мясцовага, нацыянальнага пытання з велізарным размахам хапаюцца за прывядзенне ў належны парадак агульнаславянскага дома, відаць, з надзеяй ужо ў бліжэйшы час перасяліцца ў яго з даўно спарахнелай самабытнай беларускай хаткі, паколькі пануюць у ёй чужыя парадкі.

Не толькі за часамі Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, але і зараз сярод розных катэгорый грамадства сустракаюцца асобы, зразумела, і палітыкі, якія ў дэнацыяналізацыі беларусаў бачаць толькі іх віну, бессаромна залічваюць апошніх у разрад няздольных развівацца на сваёй уласнай культурна-моўнай аснове, быць дзяржаўным народам. Калі стодзвесце гадоў таму назад многія беларусы верылі ў такую фальсіфікацыю з-за сваёй непісьменнасці, дык сёння — галоўным чынам з прычыны моцнай нацыянальнай дэградацыі, адарванасці ад удзелу ў палітычным кіраванні краінай. Сучасныя афіцыйныя ідэолагі не жадаюць, а інтэлектуалы цвёрдай беларускай накіраванасці не могуць з-за адсутнасці доступу да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі давесці людзям, што нашая сённяшняя нацыянальная нерэалізаванасць не ёсць вынік якіх-небудзь уласных памылак, няздольнасці прагрэсіўных элементаў беларускага народа весці яго па шляху самабытнага культурнага развіцця. Прычына такой нерэалізаванасці найперш палягае ў самой асімілятарскай палітыцы чужых на нашай зямлі рэжымаў, якія актыўна і працяглы час працавалі на карысць польскага і рускага інтарэсаў. І хаця праваднікамі такой антыбеларускай палітыкі з'яўляліся ўрады сяброўскіх нам славянскіх народаў, шкоднасць, бесчалавечнасць яе ад гэтага ніколькі не змяншаецца.

Ігнараванне сучаснай дзяржавай сваіх прамых абавязкаў па захаванні этнакультурных адметнасцяў беларускага народа ні ў якім разе нельга тлумачыць нібыта нізкай дзеяздольнасцю яе чыноўніцкага апарату. Паводле прафесійнай падрыхтаванасці ён нічуць не горшы за падобныя апараты суб'ектаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Нашыя ўлады, да прыкладу, даволі паспяхова працавалі і працуюць у пытаннях ваенна-палітычнай інтэграцыі з Расіяй. Сёе-тое ім удалося зрабіць і дзеля інтарэсаў будучай саюзнай дзяржавы ў сферы эканомікі. А вось такі важны аспект, як нацыянальная культура, улады практычна праігнара-

валі. Фармальна прызнаючы прысутнасць на Беларусі нацыянальнай прафесійнай культуры, нацыянальнай сістэмы адукацыі і роднай мовы яе тытульнага народа, дзяржава, аднак, вельмі мала што робіць дзеля развіцця, умацавання пазіцый гэтых трох найважнейшых складнікаў духоўнага патэнцыялу любога этнасу. Больш таго, роля беларускай мовы ў грамадскім жыцці нават істотна аслаблена ў параўнанні з тою, якою яна была ў сярэдзіне 90-х гадоў. І адбылося такое не ў выніку якой-небудзь гістарычнай, аб'ектыўнай прадвызначанасці, а толькі па волі саміх дзяржаўных дзеячаў. Па іх віне не толькі не павялічылася а, наадварот, зменшылася кола людзей, якія ў сумеснай з Расіяй дзяржаве маглі б прыстойна прадстаўляць Беларусь як краіну з адметнай культурай і мовай. Як усім зразумела, такім прыдатным людскім матэрыялам могуць быць толькі беларускамоўныя асобы, якія самахоць ці ў выніку ідэалагічнай апрацоўкі не адышлі ад сваёй роднай духоўнай спадчыны.

Пільна сачыць, надзейна забяспечваць культурна-моўную спецыфіку таго ці іншага народа — прамы і ледзь не самы ганаровы абавязак яго дзяржавы. Як правіла, на выдатна спраўляецца яна з гэтай зусім не лёгкай функцыяй толькі тады, калі ў пэўным сэнсе слова з'яўляецца нацыянальнай. Нашую сучасную дзяржаву нават пры самай вялікай нацяжцы нельга назваць нацыянальнай, бо пачынаючы з сярэдзіны 90-х гадоў яна нічога вартага не зрабіла па вяртанні свайго тытульнага народа да яго прыродных культурна-моўных стандартаў. Яна практычна звяла да нуля ўсё, што было створана для нацыянальна-культурнага адраджэння перадавымі сіламі беларускага грамадства ў канцы 80-х — першую палову 90-х гадоў. Замест стварэння спрыяльных умоў для дынамічнага развіцця, шырокага распаўсюджання беларускай культуры і мовы дзяржава паставіла і паспяхова спраўляецца з задачай па пераўтварэнні сваёй тэрыторыі ў арэал франтальнага бытавання рускіх духоўных каштоўнасцяў, трывала абапіраючыся на прадстаўнікоў народаў Расіі, для якіх у нас выдзеленыя самыя высокія і прэстыжныя пасады ва ўсіх сферах палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця. Па маштабах і выніках дзяржаўнай русіфікацыі сучасная Беларусь намнога перасягнула ўсталяваны тут віленскім генерал-губернатарам Мураўёвым-вешальнікам праруські рэжым пасля задушэння паўтання пад кіраўніцтвам нашага славутага нацыянальнага героя Кастуся Каліноўскага. Цяжка будзе зразумець новым пакаленням беларусаў, чаму ў час, калі ўвесь цывілізаваны свет праводзіць такую маштабную дзейнасць па захаванні культурна-моўнай разнастайнасці на планеце Зямля, урад іх краіны больш надае ўвагі забеспячэнню тут лепшых умоў для стварэння і функцыянавання рускамоўнай, а не беларускамоўнай культуры і адукацыі. Гэта ж нішто іншае, як самая класічная русіфікацыя на дзяржаўным узроўні.

У беларускай дзяржавы няма больш высакароднага і адказнага абавязку перад славянскай супольнасцю, як захаваць культурна-моўную адметнасць свайго тытульнага народа, не даць ёй растварыцца ў чужой духоўнай стыхіі, нават калі яна ідзе і ад славянскага этнасу, у нашым

выпадку — ад рускіх. Страшэнна памыляюцца тыя дзяржаўныя дзеячы і блізкія да іх інтэлектуалы, якія думаюць, што культурна-моўную адметнасць беларусаў можна ўсцерагчы і далей развіць праз непамерна шырокае культываванне на іх гістарычнай тэрыторыі рускіх духоўных каштоўнасцяў, што асабліва сёння інтэнсіўна заносяцца і ствараюцца на ёй. Трэба рашуча адкінуць надуманы прарускай арыентацыі асобамі міф, што гэтага нібыта хочуць самі беларусы. Іх яшчэ за царскай Расіяй паставілі і зараз ставяць у такія варункі, каб яны карысталіся толькі рускай мовай, толькі рускай адукацыяй, толькі рускім набажэнствам у праваслаўных храмах. Прыкра, што сёння ў нашай суверэннай дзяржаве не толькі не зменшылася, а, наадварот, узмоцнілася прыцягненне беларускага народа да спажывання рускіх духоўных каштоўнасцяў, што ставіць пад вялікае сумненне далейшае захаванне яго культурна-моўнай самабытнасці. Яе зусім верагоднае поўнае размыванне — гэта наймагутнейшай сілы ўдар па славянскім ідэале. Калі гэтага не зразумее наш урад і не зробіць дзейсных захадаў па спыненні дэнацыяналізацыі беларусаў, значыцца, ён не здольны ажыццяўляць тую нацыянальную палітыку, якая адпавядае карэнным інтарэсам тытульнага народа краіны — адзінага асноўнага гаспадара на сваёй законнай, бацькоўскай зямлі.

Як вынікае са сказанага вышэй, у нашай дзяржавы непачаты край працы па навядзенні парадку ў нацыянальным жыцці карэннага насельніцтва. Гэта ў дзесяткі разоў больш складаная праблема, чым адраджэнне вёскі, змярцвелай у ходзе правядзення сацыялістычных эксперыментаў у сельскай гаспадарцы. З апошнімі напрамую звязана і страшэнная дэфармацыя культуры беларускага народа. Выратаваць яе, як сведчыць гістарычная практыка, можа толькі рэальная нацыянальная дзяржава, чаго так упарта не жадаюць прызнаць высокія палітычныя колы нашай краіны і робяць усё, каб толькі ўцягнуць яе ў шлюб з Расійскай Федэрацыяй. Дзеля пераканання людзей у неабходнасці такога саюзу нястомна працуе да канца адданы палітычнай інтэграцыі з гэтай дзяржавай велізарны ідэалагічны апарат Беларусі.

Прынцыпова інакш на ролю нацыянальнага суверэнітэту глядзяць і паважаюць яго ў краінах цывілізаванага свету. У іх таксама моцная цяга да рознага роду эканамічных, палітычных і культурных інтэграцый, але толькі да такіх, якія не ідуць уразрэз з нацыянальным інтарэсам. Прыхільнікаў такіх інтэграцый, што пакідаюць у недатыкальнасці дзяржаўную незалежнасць, ёсць нямала і сярод славянскіх краін. І гэта не складана зразумець.

Заканамернае жаданне кожнага славянскага народа мець уласную дзяржаву зусім нельга разглядаць як фактар палітычнага, эканамічнага і культурнага раз'яднання гэтай этнічнай супольнасці. Хутчэй наадварот: менавіта наяўнасць у кожнага з яе суб'ектаў сваёй дзяржавы дапаможа яму найлепшым чынам развязваць унутраныя праблемы, без чаго нельга ўносіць які-небудзь сур'ёзны ўклад у агульнаславянскую справу. Набыты чалавецтвам вопыт пераканаўча засведчыў, што сапраўд-

нага сацыяльнага і духоўнага прагрэсу дамагаюцца толькі тыя народы, што маюць сваю дзяржаву. Гэты ж вопыт сведчыць, што нішто так эфектыўна не садзейнічае ім у супрацоўніцтве паміж сабой у розных сферах дзейнасці чалавека, як наяўнасць уласнай дзяржавы.

Вось такая надзвычай вялікая роля дзяржавы ў нацыянальна-адраджэнскім працэсе, які абавязкова і неадкладна трэба будзе прайсці і беларускаму народу, калі ён не жадае знікнуць з этнічнай карты Еўропы. Шматгадовае знаходжанне беларусаў пад прыгнётам, — дзе хітра, тонка, а дзе і надзвычай жорстка праведзеных, — паланізацыі і русіфікацыі прычынілася да таго, што іх культура і мова шмат што страціла са свайго прыроднага, нацыянальнага. Гэты працэс доўжыцца і сёння. Нават у самых верхніх структурах дзяржаўнай улады, у многіх самых прэстыжных асяродках прафесійнай культуры, аўдыторыях вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў не чуваць роднай мовы тытульнай нацыі Рэспублікі Беларусь. Такога бязладдзя ў культурна-моўным жыцці не знайсці ў ніводнага народа Еўропы. Таму за найвялікшае злачынства трэба прызнаць ухіленне ў падобнай сітуацыі чыноўніцкага апарату, значнай часткі грамадства ад канкрэтнай практычнай дзейнасці па выратаванні беларускага народа ад этнічнага вымірання. І яшчэ раз хочацца сцвердзіць: спыніць гэты разбуральны працэс можна ў першую чаргу толькі з дапамогай дзяржавы, зразумела, пры ўмовах, што яна сама будзе прасякнута ідэяй беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння. Такога роду надзвычай важныя спецыфічныя для беларускага народа культурна-моўныя праблемы будуць на самым заднім плане для любой федэратыўнай (канфедэратыўнай) дзяржавы, нават і створанай з Расіяй.

Між іншым, сёння нямала краін на самым высокім дзяржаўным узроўні вядуць з прыцягненнем прагрэсіўных колаў грамадскасці ўпартае змаганне супроць культурна-моўнай асіміляцыі іх народаў. Заўтра колькасць такіх краін павялічыцца. Ва ўсім вінаваты планетарны характар сучаснай глабалізацыі. Нядоўга застаецца чакаць, калі яна набудзе пагрозлівы характар і для Расіі, Украіны, Беларусі, якія ў постсавецкі час зведваюць вялікія эканамічныя цяжкасці, што з'яўляецца адной з найважнейшых прычын эміграцыі адсюль самай адукаванай, фізічна здаровай і прафесійна кваліфікаванай часткі насельніцтва — сапраўднага ядра любой нацыі. З аслабленнем яго апошняя траціць сваю здольнасць супраціўляцца ўплыву чужых культур. Каб Беларусі надзейна абараніць сябе ад іх, трэба ажыццявіць комплекс эфектыўных захадаў па ўзняцці прэстыжнасці прыроднай культуры і мовы народа, павышэнні яго нацыянальнай самасвядомасці. Гэта архіскладаная для ўладных структур задача, бо ў іх практычна адсутнічае нават самы мінімальны вопыт у яе вырашэнні.

Трэба мець на ўвазе, што на працягу XX ст. дзяржаўная культурна-моўная палітыка на Беларусі толькі зрэдку будавалася на сваёй прыроднай аснове: у гады Першай сусветнай вайны на акупаванай кайзераўскімі войскамі тэрыторыі, пад час беларусізацыі (1924 — пачатак

30-х гадоў) і нацыянальна-культурнага адраджэння канца 80-х — пачатку 90-х гадоў. Многія паверылі, што беларускаму фактару паспрыяе майскі рэферэндум 1995 г. Не атрымалася. Заручыўшыся згодай выбаршчыкаў на юрыдычную роўнасць рускай мовы з беларускай, дзяржава не выканала спадзяванняў тых, хто ўдзельнічаў у рэферэндуме. З ініцыятывы магутнага чыноўніцкага апарату сацыяльная роля беларускай мовы імкліва пакацілася ўніз. Дзяржава не забяспечыла ёй прэстыжнага месца ў аніводнай сферы грамадскага жыцця. Затое рускай мове яна адкрыла і гарантуе неабмежаванае поле дзейнасці ў працы ўсіх рангаў органаў дзяржаўнай улады і кіравання, міністэрстваў і ведамстваў, ва ўсіх відах службовага справаводства, у сістэме народнай адукацыі, афіцыйных сродках масавай інфармацыі, візуальным афармленні населеных пунктаў, прадпрыемстваў і ўстаноў і г. д. Думаць, што ў такіх варунках у беларускай мовы як галоўнага фактару нацыянальна-культурнай самабытнасці карэннага насельніцтва нашай краіны ёсць будучае, могуць толькі самыя вялікія фантазёры.

Не будзе памылкай сцвярджаць, што заснаваная на выніках майскага рэферэндуму 1995 года дзяржаўная культурна-моўная палітыка ёсць не што іншае, як тыповая русіфікацыя. На беларускай зямлі яе праводзяць не менш за два стагоддзі! Узрост салідны. Дый вынікі ўражваюць, але не радуюць.

Сёння беларусам у дзесяткі разоў цяжэй весці змаганне за сваё этнічнае выжыванне, захаванне культурна-моўнай адметнасці, чым гэта 100—200 гадоў таму назад даводзілася рабіць славянскім народам Асманскай (Атаманскай), Прускай, Аўстра-Венгерскай імперый. Іх тагачасная барацьба з туркамі, немцамі і аўстрыйцамі за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне заканамерна падавалася як нешта велічнае, патрыятычнае. Калі ж у нашыя дні беларусы імкнуцца на сваёй гістарычнай тэрыторыі хоць трошкі пашырыць сферу распаўсюджвання роднай культуры і мовы, што магчыма толькі праз мэтанакіраванае звужэнне тут пануючай ролі падобнага роду рускіх адпаведнікаў, на галовы такіх беларускіх патрыятычных сілаў адразу з усіх бакоў, у тым ліку і ад афіцыйных уладаў, сыплюцца беспадстаўныя абвінавачванні ў злосным падрыве векавечнай дружбы паміж беларускім і рускім народамі, а адсюль — у прычыненні вялікай шкоды славянскаму адзінству. Каб не трапіць пад такія суровыя абвінавачванні, многія беларускія інтэлігенты з-за сваёй прыроднай сціпласці і нерашучасці лічаць за лепшае ў падобнай сітуацыі маўчаць і з болем ці без яго сузіраць, як канае, адыходзіць у беларускамоўнай немаце ў нябыт адзін з самых старажытных, з багатай гісторыяй і адметнай — у далёкім і блізкім мінулым — культурай славянскі народ. Паводзіны такой часткі інтэлігенцыі, вядома, можна зразумець, але іх ніяк нельга апраўдаць. Дзеля выратавання беларускага народа ад культурна-моўнай асіміляцыі — няхай сабе і ў форме русіфікацыі, якую нашая дзяржава памылкова лічыць за заканамерную, прагрэсіўную з'яву, — трэба ўсё ж ісці і на рызыку, каб толькі не быць праклятымі новымі пакаленнямі людзей беларускай зямлі, якія,

упэўнены, захочуць быць на ёй сапраўднымі гаспадарамі з адметнай культурай і мовай, а не нейкай бесхрыбетнай істотай, этнічнай бессістэмнай масай.

Апошнімі гадамі, калі дзяржаўныя дзеячы і адданая ім частка інтэлігенцыі так мэтанакіравана, заўзята праводзяць курс на палітычнае аб'яднанне з Расіяй, у нас афіцыйна не прынята публічна гаварыць пра колішнюю і сучасную культурна-моўную русіфікацыю беларусаў, пра існаванне ў мінулым ва ўзаемадачыненнях гэтых двух славянскіх народаў чагосьці адмоўнага. А праўды ж не трэба баяцца, як гэта рабіў вядомы дзяржаўны дзеяч, старшыня Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР Аляксандр Чарвякоў (1920—1937 гг.), пішучы, што ў дарэвалюцыйны перыяд «усё тое, што так ці іначай гаварыла аб былой гісторыі Беларусі, што так ці іначай магло напамінаць, што Беларусь не ёсць Расія — усё гэта нішчылася, праследвалася, выпальвалася агнём ды жалезам». З гэтых праўдзівых слоў добра зразумела, як цяжка было беларусам за царскай Расіяй захоўваць сваю этнакультурную самабытнасць, заставацца самімі сабой. Яшчэ цяжэй спраўляцца ім з гэтымі праблемамі сёння, бо іх стварае ўласная дзяржава. Яна з'яўляецца асноўным віноўнікам далейшага паглыблення культурна-моўнай асіміляцыі карэннага насельніцтва, што непазбежна вядзе да яго этнічнага распаду, ставіць пад рэальную пагрозу беларускую прысутнасць у славянскім свеце.

Неадпаведнасць сучаснай дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры нацыянальнаму інтарэсу Беларусі не можа заставацца па-за ўвагай прагрэсіўных колаў славянскай супольнасці, міжнародных арганізацый. Апошнія справядліва б'юць у званы, калі з прычыны ўплыву народаў з багатай культурай вымірае суседняе ім невялікае па колькасці племя. Беларусы не належаць да такога этнічнага статусу. Яны — народ з багатымі нацыянальна-гістарычнымі традыцыямі, арыгінальнай, самабытнай культурай і мовай. Страціць усё гэта азначала б прычыніць вялікую шкоду культурнай разнастайнасці і славянскай супольнасці, і ўсяго цывілізаванага свету, таму выратаванне беларусаў ад русіфікацыі, якую праводзіць і іх жа ўласная дзяржава, не павінна разглядацца як толькі прыватная справа гэтага народа. Ёсць прамы сэнс палітыкам, прадстаўнікам самых элітарных колаў славянскай супольнасці ўвесці ў практыку рэгулярнае абмеркаванне праблемы захавання этнакультурнай самабытнасці ў сваіх краінах і пры патрэбе сумеснымі сіламі выпрацоўваць шляхі па прадухіленні яе дэфармацыі ва ўмовах паглыблення ў свеце працэсаў глабалізацыі. Першай славянскай краінай, якая заслугоўвае стаць прадметам такога абмеркавання, несумненна, з'яўляецца Рэспубліка Беларусь. Прычына такой незвычайнай увагі да яе — самая высокая з усіх славянскіх краін ступень культурна-моўнай асіміляцыі тытульнага народа.

*Навукова-папулярнае выданне*

**Лыч** Леанід Міхайлавіч
**Праблема захавання беларускай этнакультурнай прысутнасці ў славянскім свеце**

Рэдактар *Л. Лыч*
Вёрстка *Л.Ваўчок*
Карэктар *Н. Баярын*

Падпісана да друку 17.03.2006 г. Фармат 84х108 $^{1}/_{32}$. Друк на рызографе.
Папера афсетная. Гарнітура Times. Ум. друк. 3,78 арк.
Ул.-выд. 4,91 арк. Наклад 100 ас.

